# САША ФІЛІПЕНКА

# СЛОН



GUT
ENB
ERG

Саша Філіпенка

# СЛОН

Рэдактар Марына Казлоўская
Карэктар Настасся Мядзелка

Аўтарская рэдакцыя перакладу з рускай мовы

Wydawnictwo Gutenberg Publisher
ul. Łobzowska 15
31-139 Kraków
tel. +48 510 034 234
office@gutenbergpublisher.eu
gutenbergpublisher.eu

ISBN 978-83-68016-42-0

© Саша Філіпенка, Kraków 2025
© Gutenberg Publisher Sp. z o.o., Kraków 2025

САША ФІЛІПЕНКА

# СЛОН

КРАКАЎ 2025

**Па гарызанталі**

1. Разрадка назапашанага сэксуальнага ўзбуджэння.
5. Месца індывідуальнага ўтрымання сельскагаспадарчых жывёл, агароджаная прастора ў стайні, кароўніку ці хляве.
6. Пачуццё моцнага раздражнення і варожасці, скіраванае на пэўны аб'ект ці сітуацыю.
8. Валасы на твары чалавека ці поўсць у жывёл.
10. Сцэнічны прыбор са святільняў рассеянага святла.
11. Музычны інструмент, асноўны від фартэпіяна, у якім струны і ўся механічная частка размешчаныя гарызантальна.
12. Гатунак мяккага тлустага сыру, які ўзнік у Нармандыі.
19. Буйная жывёла, прыстасаваная да жыцця ў пустыні.
20. Прыстасаванне, якім абмахваюцца падчас спёкі, махала.
21. Падмостак для здзяйснення смяротнага пакарання або для выканання публічных экзекуцый.
22. Унутраны, душэўны стан чалавека.
23. Вобразы, сюжэты, матывы ў фальклоры і літаратуры.
25. Вайсковае падраздзяленне з некалькіх рот.
29. Асобная частка акта п'есы, спектакля.
30. Доўгая вяроўка з рухомай пятлёй на канцы, якой ловяць жывёлу.
31. Чалавек з хваравітым імкненнем стаць пісьменнікам.
32. Чалавек, які піша эсэістычныя творы.
33. Падвойны аркуш, які злучае вокладку і кніжны блок.
34. Двухмесны двухколавы ровар.

**Па вертыкалі**

1. Агульны вонкавы выгляд, сукупнасць адметных рыс, характэрных для чалавека.
2. Просьба, паўтарэнне просьбаў у надзеі на літасць і дараванне ўсяго неабходнага.
3. Адлюстраванне ідэальнага грамадскага ладу ў мінулым ці ва ўяўнай будучыні.
4. Літаратурна-драматычны твор, напісаны як аснова для пастаноўкі фільма.
7. Скрынка для захоўвання папярос, партабак.
9. Чалавек, які вывучае сланоў.
13. Шлях руху аб'екта, які ўлічвае кірунак руху адносна геаграфічных арыенціраў ці каардынат.

14. Аптычная прылада з дзвюх паралельна злучаных падзорных труб для разглядвання аддаленых прадметаў.
15. Непадзельная порцыя якой-небудзь велічыні ў фізіцы.
16. Пачуццё, якое характарызуецца глыбокай прывязанасцю і прыхільнасцю да іншага чалавека.
17. Каманда пры дрэсіроўцы сабак.
18. Невысокі бар’ер уздоўж авансцэны.
24. Кровазмяшэнне, палавая сувязь паміж блізкімі сваякамі.
26. Той, каму адрасаванае паштовае адпраўленне.
27. Арганічнае злучэнне ёду з хімічнай формулай $CHI_3$, мае выгляд жоўтых крышталёў з моцным характэрным пахам.
28. Асобіна з атрада млекакормячых, які ўключае малпаў і чалавека.



*Вельмі слабая кніга! Калі быць шчырай — херня з-пад пазногцяў, а не раман! Думаю, гэта самы пераацэнены і прэтэнцыёзны аўтар, якога мне калі-небудзь даводзілася чытаць! Часацца ад алергіі больш прыемна, чым гэта чытаць! Асабіста я кінула ўжо пасля першых некалькіх старонак!* **Ананім**

*Цалкам згодная! Я наогул не разумею, што людзі знайшлі ў гэтай хадульнай пісаніне?! Няўдзячны паклёп на нашу краіну! Заказуха! Глыбокіх думак няма, трапных назіранняў таксама! Мова ў гэтага так званага пісьменніка вельмі бедная! Тэлеграфны стыль. Да таго ж няцяжка здагадацца, што ўсё гэта выдумка! Нічога такога ў нашай гісторыі ніколі не было! Адзнака — мінус сто з дзесяці!*
*P. S. І гэта я яшчэ не кажу, што ў кнізе абсалютна жудасныя дыялогі — людзі так наогул не размаўляюць!*
**ТваяDomina2022**

*А вы дык з усімі людзьмі на свеце пагаварылі?* **Дрэсіроўшчык**

*Ну ўжо яўна паболей, чым ты!* **ТваяDomina2022**

*Вам, вядома, лепш відаць, але я як чалавек, які ўдзельнічаў у апісаных у кнізе падзеях, хачу сказаць, што прачытаў яе з вялікім задавальненнем! Гэтая кніга праўдзівая на 100%*
**Дрэсіроўшчык**

*Ды нічога такога і блізка не было! Я таксама ўдзельніца падзей і нічога такога не бачыла! Гэта ўсё хлусня!*
**ТваяDomina2022**

*Hoci trahatsia! Dam lyboy! Pishite v licnye! Otwechu wsem! Fotki prishly! Izlybly vas! Vylyju kisku!!!!!* **Гонза**

*Мне здаецца, гэты раман — поўха, дадзеная ўсім нам... з любоўю* **Ася**

*Любіш чытаць? Хочаш напісаць свой раман, але не ведаеш як? Школа пісьменніцкага майстэрства “Пяро і прамень” за месяц навучыць цябе таленавіта выбудоўваць сюжэт, ствараць інтрыгу і правільна выпісваць персанажаў. Не самазванцы, а дыпламаваныя пісьменнікі патлумачаць табе, як плесці нітку аповеду і (за дадатковую плату) навучаць майстэрству дыялогу. Напрыканцы курса ты атрымаеш дыплом аб тым, што ты сапраўдны пісьменнік!*
*“Пяро і прамень” — па рамане штодзень!* **Спасылка выдаленая ў сувязі з правіламі суполкі**

*Усім прывітанне! Хацеў купіць гэты раман, але кошт кусаецца. Ці можа хто-небудзь скінуць сюды хаця б пачатак, каб зразумець, ці варта ў яго ўкладацца і пра што ён наогул?* **Кніжны чарвяк**

*Лаві!* **Добры самаранін**

*Павел, прывітанне.*

*Гэта мой апошні ліст.*

*У мяне было шмат часу, каб прыняць рашэнне. Я прыслухоўвалася да сябе і да цябе. Як мне падаецца, зрабіла ўсё, што магла. Магчыма, я ўзяла сабе занадта шмат часу і расцягнула твае пакуты. Я прашу ў цябе прабачэння за гэта.*

*Я не хачу працягваць нашы стасункі.*

*Прычына простая: я не хачу.*

*Я бясконца табе ўдзячная за той цудоўны час, які ў нас быў.*

*За ўсю тую любоў і цеплыню, за цікавасць, якія ты мне даў.*

*Я вельмі спадзяюся, што ты будзеш паважаць маё рашэнне, яно канчатковае, і не будзеш пісаць, тэлефанаваць, шукаць сустрэчы ці чакаць мяне.*

*Ганна*

Штораніцы, ледзь толькі кава напаўняе парцалянавыя філіжанкі з чорнымі сланамі, мама сядае насупраць бацькі і позіркам, якім многа гадоў свідруе мужа, дае зразумець, што можна пачынаць. Хоць ежа, як і кожная закаханасць, імкліва астывае, калісьці муза, а цяпер сакратар, ведае, што сняданак не адбудзецца, пакуль муж не выступіць. Гэты рытуал паўтараецца дзень пры дні: чарнавікі туляцца паміж срэбных прыбораў, падлогавы гадзіннік б'е дзевяць, і прыжыццёвы класік пачынае апавядаць ідэю новага рамана:

— Уявіце сабе, — звычайна з запалам пачынае бацька, — якая-небудзь заходняя краіна, у якой набліжаюцца выбары. Прэм'ер-міністру кладуць на стол вынікі апытанняў грамадскай думкі, і аказваецца раптам, што, паводле папярэдніх даных, у лідарах не яго партыя, якая цяпер ва ўладзе, а нядаўна арганізаваны Саюз неандэртальцаў...

— Неандэртальцаў?! — быццам бы не ўчуўшы, выяўляючы захапленне і поўную ўключанасць, абавязкова ўдакладняе мама.

— Так, так, менавіта неандэртальцаў! — чакаючы гэтага пытання, адразу адказвае бацька і працягвае пераказ фабулы: — З першых старонак чытач разумее, што ў краіне, дзе стартуюць выбары, раптам з'яўляецца палітычная партыя неандэртальцаў, і людзі гатовыя за яе галасаваць, бо: а) аказваецца, што сярод нас яшчэ шмат неандэртальцаў, якіх мы раней не заўважалі, і б) у іх добрая праграма, якая падабаецца і "зялёным", і левым, і экаактывістам...

— Брава, брава, Аляксандр! Але што ж будзе далей?! — у тысячны раз за апошнія гады імітуючы зацікаўленасць, пытаецца маці.

— А далей, як звычайна, я стаўлю чытача перад маральнай дылемай: прэм'ер-міністр і ўсе яго паплечнікі разумеюць, што да ўлады вось-вось прыйдуць неандэртальцы, але хіба можна гэта дапусціць? Хіба можна зрабіць так, каб краіна павярнула назад? Прэм'ер і яго кабінет усведамляюць, што дэмакратычнымі спосабамі, сумленна, неандэртальцаў ужо не перамагчы, і таму яны ўжываюць вялікую колькасць забароненых прыёмаў...

— Ах, як цікава! І сапраўды, які ж цікавы і складаны выбар для чытача! — як і ў кожную іншую раніцу, працягвае ўдаваць маці.

— Так-так, я хачу паразважаць пра тое, як далёка мы гатовыя зайсці, абараняючы нашы каштоўнасці, свабоду і дэмакратыю? І як быць з тым, што большасць сапраўды хоча галасаваць за неандэртальцаў?!

— Ці магу я задаць вам пытанне?

— Вядома, мілая!

— А ці гэта паліткарэктна — пісаць пра неандэртальцаў у такім негатыўным ключы?

— У літаратуры няма месца паліткарэктнасці!

— Брава, брава, Аляксандр! У вас, як звычайна, бліскучая ідэя, але што ж будзе напрыканцы?

— А напрыканцы, як, зрэшты, і заўсёды, у мяне будзе вельмі прыгожы фінал...

— Раскажыце нам хутчэй!

— Чаму ж не расказаць? Вельмі нават ахвотна магу расказаць! Карацей, дзяржаўная машына будзе так захопленая барацьбой з неандэртальцамі, што не заўважыць, як да ўлады прыйдуць...

— Ну? Ну хто ж? Ну не цягніце ж, калі ласка!

— Краманьёнцы!

— Ох! Брава, брава, Аляксандр! Ну хіба не бліскуча?!

Мама размаўляе з бацькам на “вы”, ён з ёй на “ты”. Ужо ў адной гэтай дэталі Ганна бачыць крывізну і недалужнасць бацькоўскіх стасункаў, аднак хоць і шкадуе маці, ніколі не гаворыць пра гэта ўслых. Дачка пакрыўджаная, дачка нясе сваю крыўду, як (*буйная жывёла, прыстасаваная для жыцця ў пустыні, 19 па гарызанталі, 7 літар*) цяжар, з самага дзяцінства, праз пустыні сталення. Ганна мяркуе, што ў бацькоўскім доме даўно няма месца ані жанчыне, ані яе цяпер ужо трыццаціпяцігадовай дачцэ, якая жыве ў суседнім асабняку, але кожную раніцу заходзіць на сняданак да бацькоў, якіх не любіць.

“Мы, — не сумняваецца Ганна, — не блізкія людзі, але ўсяго толькі добрыя памочнікі — збраяносцы вялікага лёсу. Доўгія гады ўсё паветра, уся прастора ў гэтым доме належыць вялікаму літаратурнаму таленту, сапраўднае існаванне якога магчымае толькі дзякуючы шматгадовай і ўпартай мамінай працы”.

Ганна ведае, што яе маці так баіцца аднойчы быць кінутай і застацца адной, што гатовая пайсці

на ўсё, абы толькі задаволіць бацькавы запыты. Усе яны засяроджаныя вакол узнагарод, ордэнаў і іншых атрыбутаў прызнання, таму Сафія нярэдка праводзіць доўгія перамовы з выдаўцамі і сябрамі журы, нават калі для гэтага трэба заставацца на некалькі гадзін у гатэльных нумарах. Зрэшты, апошнім часам рабіць гэта ўсё больш складана: Сафія старэе і больш не выклікае зацікаўленасці мужчын. Гледзячы на яе, Ганна больш за ўсё баіцца аднойчы гэтак жа сама пастарэць.

"Няма нічога горш, — думае Ганна, — чым ператварыцца ва ўласную маці".

Між тым, Сафія жыве ў пастаянным страху. Маці Ганны працягвае захапляцца творчасцю мужа, запаўняючы за яго анкеты і правячы рукапісы. Усё сваё жыццё яна прысвячае служэнню выбітнаму аўтару і таго ж патрабуе ад дачкі:

"Калі мяне не стане — ты будзеш захоўваць вялікую спадчыну таты, перападпісваць кантракты з выдавецтвамі, разбіраць яго рукапісы і час ад часу цешыць публіку старонкай не апублікаванага раней вялікага чарнавіка..."

"Мама, я ніколі не буду табой!" — рэзка адказвае Ганна і скаланаецца ад адной толькі думкі, што калі-небудзь ёй давядзецца працаваць.

"Шэсць па гарызанталі: пачуццё моцнага раздражнення і варожасці, скіраванае на пэўны аб'ект ці сітуацыю. Шэсць літар". — Ганна вельмі любіць разгадваць крыжаванкі.




Стравы падае Памазок — служка, класічны персанаж другога плана. Памазок заўсёды быў Памазком. Гэтая мянушка прыклеілася да яго адразу, у тую самую раніцу, калі ён пагрукаўся ў дзверы шыкоўнай вілы ў пошуках працы, маючы пры сабе толькі памазок для галення:

— Гэта не вы згубілі? — запытаўся Памазок у соннага Аляксандра.

— Не, — прамармытаў вядомы пісьменнік і хацеў быў зачыніць дзверы, але невысокі хлапец паставіў нагу ў праём.

— Я хачу служыць вам! Такому важнаму пану, безумоўна, спатрэбіцца дапамога ў нудных бытавых справах!

Аляксандр любіць лёстачкі — Памазок застаецца. Персанаж, якому трэба суперажываць, але не так, як галоўным героям. Амаль хатні гадаванец, Памазок выклікае замілаванне і стрыманы жаль, аднак роўна такі, каб у выпадку чаго яго можна было хутка ператравіць. Чытаючы пра такога персанажа, вы адразу разумееце, што на адной са старонак яго абавязкова заб'юць, прынёсшы ў ахвяру сюжэту. З такімі, як ён, аўтары любяць распраўляцца ў трэцяй частцы кнігі, прымушаючы чытачоў яшчэ больш суперажываць галоўным героям, з некаторымі з іх вы ўжо знаёмыя.

У гэтую раніцу не мусіць адбыцца нічога звышнатуральнага: адпаведна даведзенаму да ідэалу пратаколу, Памазок накрывае на стол, мама разлівае каву па парцалянавых філіжанках (так-так, з чорнымі слонікамі), і заўсёды незадаволеная Ганна глядзіць на Паўла, свайго маладога чалавека, ад якога чакае выбачэнняў. Пераканаўшыся, што ўсе гатовыя слухаць, Аляксандр, урачыста патросшы старонкамі чарнавіка, пачынае:

— Значыць, сёння ў нас невялікі гарадок. Шчаслівая сям'я. Ён (малады, але ўжо ветэран супрацiву), яна ў дэкрэце. Ён быў паранены і таму ўмее цаніць тое, што мае. Ён вельмі любіць

жонку і дзіця. Любіць па-сапраўднаму! Моцна, без цьмяных пачуццяў...

— Падмурак зразумелы... — робячы пазнакі ў сваім чарнавіку, спакойна заўважае Сафія.

— Аднойчы раніцай ён адпраўляецца на прабежку і, вярнуўшыся дадому, даведваецца, што яго жонка і дачка толькі што загінулі: на пешаходным пераходзе іх збіў стары, які заснуў за стырном...

— Якая добрая трагедыя для пачатку гісторыі!

— Так-так, я апісваю спусташэнне маладога чалавека, апісваю пахаванне ў вельмі спякотны дзень і тое, што падчас развітання ён раптам бярэ слова і кажа: “Ва ўсім вінаватыя старыя!”

— Падчас пахавання, стоячы перад трунай, ён кажа, што ва ўсім вінаватыя старыя?

— Каля трун! Слухай уважліва! Я ж сказаў, што дзяўчынка таксама загінула!

— Так-так, Аляксандр, даруйце!

— Значыць, ён стаіць у царкве і гаворыць, што ва ўсім вінаватыя старыя. Малады ўдавец выдае даволі-такі сур’ёзную прамову, з якой вынікае, што ўсе нашы праблемы ад старых, што нават цягнікі пастаянна спазняюцца праз пажылых людзей, і калі б іх не было — краіна зноў зрабілася б вялікай. Ну, і сваякі, і сябры яго, вядома, слухаюць, а куды падзецца (?), яны ж у царкве (!), але ніхто, ясная справа, у дыялог не ўступае, бо ў хлопца шок, і ўсе разумеюць, што ён знішчаны і раз’юшаны. Карацей, пахаванне заканчваецца, усе паволі разыходзяцца, але тут раптам да яго падыходзіць стрыечны брат і пытаецца: “Слухай, братка, мне вельмі

спадабалася твая прамова, але што ты прапаноўваеш рабіць?”

— Так, сапраўды, што ж ён прапаноўвае рабіць?

— “Мы іх усіх заб’ём!” — спакойна, я б сказаў нават безэмацыйна адказвае хлопец.

— Ён прапануе забіць усіх старых у краіне?

— Менавіта! Пра гэта і раман!

— Інтрыгуе...

— А як жа! Я хачу напісаць кнігу пра маладога амбітнага чалавека, які разам са стрыечным братам сядае ў мікрааўтобус і пачынае ездзіць па краіне, шукаючы паплечнікаў (я ж даўно хацеў апісаць усе гэтыя малыя, нікому не патрэбныя гарады, у якіх мне даводзілася выступаць з прэзентацыямі кніг), дык вось, яны ездзяць, спыняюцца ў барах, размаўляюць з моладдзю і пераконваюць неакрэплыя, простыя розумы, што ўсе праблемы ад старых. Кажучы палымяныя прамовы, ён пераконвае новых паплечнікаў, што калі знішчыць усіх пажылых людзей — астатнім ад гэтага будзе толькі лепш і нават вызваляцца сродкі, каб вынайсці бессмяротнасць...

— І што, у іх атрымліваецца?

— Так! Я пакажу, як вельмі хутка ён знаходзіць тысячы паплечнікаў і як імкліва, літаральна ў адзін момант, збірае групы штурмавікоў і прыходзіць да ўлады, ігнаруючы выбары, бо “Надышоў час знішчаць нямоглых старцаў, якія кіруюць краінай!”. І я пакажу, як вар’яцкая ідэя здольная апанаваць грамадства, якое заспакойвае сябе тым, што нібыта перарадзілася...

— І што ж, яны сапраўды пачнуць знішчаць старых?

— Так, усіх да аднаго!

— Значыць, гэта будзе цяжкая і сумная кніга?

— Гэта будзе вельмі моцная і важная кніга пра тое, што абсалютна любое грамадства можа вельмі хутка дэградаваць!

— І як гэтая кніга будзе называцца?

— Альтэрнатыва для...

Вядомы пісьменнік не паспявае скончыць, бо Павел, малады чалавек Ганны, раптам перапыняе яго:

— А чаму б вам усё ж такі не напісаць пра вашага слана?!

Думаю, тут неабходна зрабіць пэўнае тлумачэнне. Пралог. Калі зараз вы пераведзяце позірк з раззлаванай Ганны, калі адарвяцеся ад абражанага Аляксандра і ані секунды не будзеце затрымлівацца на здзіўленых Сафіі і Памазку, то лёгка заўважыце, што пасярод пакоя стаіць слон, жывы і велізарны. Займаючы ледзь не ўсю прастору, якая прымыкае да гасцёўні, жывёла спакойна пражоўвае сена, якое, разам са сняданкам, падала прыслуга.

Так, так, вы не памыліліся — слон!

Ён з'явіўся тут некалькі месяцаў таму, напрыканцы лютага. Досвітак, грукат і... Сафія, якая прыбегла на шум, аслупянела. Пасярод вялікага

пакоя, падмяўшы пад сябе (*музычны інструмент, асноўны від фартэпіяна, у якім струны і ўся механічная частка размешчаныя гарызантальна, 11 па гарызанталі, 5 літар*), нерухома стаяў слон. Карціна гэтая да таго ўражвала і здавалася непраўдападобнай, што гаспадыня дома не закрычала, не самлела, але толькі, затуліўшы рот рукой, паспрабавала праміргацца. Зноў зірнуўшы на жывёлу і ўсвядоміўшы, што нічога не змяняецца, што слон усё яшчэ стаіць там, дзе стаяў, і толькі зрэдку ўзмахвае хвастом, Сафія пляснула ў далоні. Чарадзейства? Цуд? Сон?

Слон!

Асцярожна, упершыню за доўгія гады трымаючыся за парэнчы, жонка вядомага пісьменніка вярнулася на другі паверх і, пагрукаўшы ў дзверы спальні, запрасіла мужа спусціцца:

“Што там яшчэ здарылася?!” — нацягваючы піжаму, нехаця развітваючыся з недагледжаным сном, у якім адразу дзве аголеныя чытачкі стаялі на каленях, прабурчэў аўтар.

“Хадземце, Аляксандр, гэта важна!”

“Гэта ж трэба...” — пабачыўшы жывёлу, якая стаяла пасярод пакоя, ціха прашаптаў бацька.

Іх слон аказаўся спакойным і ціхім. Велікан саванны, слон не варушыўся і глядзеў у адну кропку. Вялікая, чыстая і міралюбівая жывёла зачароўвала і прываблівала. Да слана хацелася падысці бліжэй, разгледзець і, магчыма, нават дакрануцца. Пераадольваючы страх, мама так і зрабіла. Сафія

ступіла некалькі крокаў, потым спынілася, быццам бы шукаючы падтрымкі, паглядзела праз плячо на мужа і, дачакаўшыся ўхвальнага кіўка, падышла ўшчыльную. Скура слана была прыемная на дотык. Пах, як ні дзіўна, зусім не адштурхоўваў. Слон Сафіі спадабаўся. Яна ўсміхнулася, а Аляксандр дыханнем сваім затуманіў шкельцы і працёр акуляры. Нават тое, што жывёла раздушыла надзвычай дарагі раяль, нікога ў тую раніцу не абурыла — адно захапленне!

"Трэба як мага хутчэй усім расказаць!" — вызіраючы з-за спін гаспадароў, асмеліўся прапанаваць Памазок, які прыбег на шум.

"Чакай..." — спрабуючы пэўна ацаніць усё тое, што адбываецца, адказаў бацька.

Хаця ў гэтую карціну немагчыма было паверыць, з тым, каб пахваліцца перад сябрамі (і ўжо пагатоў склікаць, напрыклад, прэс-канферэнцыю), галава сям'і вырашыў пачакаць. Вядомы пісьменнік і вялікі інтэлектуал, Аляксандр разважыў, што спярша варта праверыць саміх сябе і пераканацца: ці не калектыўнае гэта вар'яцтва адбылося ў доме?

"Памазок, ты ж таксама гэта бачыш?"

"Не ведаю, што бачыце вы, але асабіста я бачу велізарнага слана!"

Літаральна ў гэтыя ж хвіліны ў гасцёўні з'явілася задыханая Ганна.

"Прыйшоў! Слон прыйшоў!"

"Так-так, мілая, мы бачым!"

"Давайце хутчэй сфатаграфуемся!" — прапанавала маці і пачала прычэсвацца для здымка.

Так і не зразумеўшы, ці сапраўды гэта добрая ідэя, усе пагадзіліся.

Памятныя кадры (на ўсялякі выпадак на некалькі фотаапаратаў) рабілі хвілін дваццаць. Пераканаўшыся, што гэта не сон і ўсё тое, што адбываецца, адлюстравана на выплюнутых "палароідам" здымках, Аляксандр нарэшце ўпаў у фатэль і дазволіў запрасіць сяброў — найперш сям'ю вядомага дрэсіроўшчыка, які жыў у канцы вуліцы.

"Заплюшчыце вочы!" — увёўшы суседзяў у гасцёўню, запатрабаваў бацька і ўсміхнуўся. Прамаўляючы гэты ўрачысты загад, галава сям'і адчуваў сябе сапраўдным фокуснікам, які ўжо праз імгненне, узмахнуўшы чарадзейнай палачкай, здолее агаломшыць гледачоў. Аляксандр хваляваўся, трыумфаваў і, наколькі гэта было магчыма, адцягваў дзівосны момант, бо хацелася не толькі ўразіць гледачоў, але і (што было куды важнейшым з прафесійнага пункта гледжання), паназіраць за іх рэакцыяй — авохці, каб пасярод дома стаяў жывы слон?!

"Расплюшчвайце!" — нарэшце гучна сказаў бацька, аднак, пабачыўшы рэакцыю суседзяў, зараз жа азадачыўся і нават расчараваўся. На дзіва, госці заставаліся спакойнымі.

"Я, вядома, разумею, што вы звыкліся бачыць сланоў у цырку, але вам хіба не падаецца гэта абсалютна дзівосным?!" — быццам засмучанае дзіця, фокус якога дарослыя не ўспрынялі ўсур'ёз, запытаў Аляксандр.

“Калі ты патэлефанаваў, у нас дома з’явіўся такі ж самы...” — апраўдваючыся, адказаў вядомы дрэсіроўшчык.

“Ты жартуеш?!”

“Не...”

“І ў мяне...” — нарэшце прызналася Ганна.

Бацьку агарнулі супярэчлівыя пачуцці. Спачатку ён вельмі засмуціўся, бо зрабілася відавочна, што ніякай выключнасці яго слон не мае, і значыць, наўрад ці было варта тэлефанаваць журналістам і ствараць тое, што называлася інфармацыйнай нагодай, аднак расчараванне і трывога даволі хутка змяніліся на захапленне ад усведамлення маштабаў усяго таго, што адбывалася: атрымлівалася, што слон быў не адзін, а значыць, адбывалася штосьці грандыёзнае — сапраўднае нашэсце!

“А вы не ведаеце, у каго-небудзь з суседзяў таксама ёсць?”

“Я бачыў ува ўсіх!” — спакойна адказаў дрэсіроўшчык.

Фантастыка! Нягледзячы на пазаранак, бацька загадаў падаць шампанскае і, залпам выпіўшы келіх, пачаў зручней уладкоўвацца ў фатэлі, аднак, не здолеўшы стрымліваць эмоцыі, зноў падскочыў:

“Давайце ўключым тэлевізар! Памазок, давайце зараз жа ўключым тэлевізар! Калі з самай раніцы ў кватэрах і ў прыватных дамах з’яўляюцца сланы — значыць, пра гэта ўжо павінны гаварыць па ўсіх каналах!” — у гэтае імгненне падалося, быццам вядомы пісьменнік перахапіў эстафетную

палачку і памяняўся з жонкай ролямі. Цяпер Аляксандр быў у захапленні, а Сафія, наадварот, пераходзячы да наступнага акта ашаломленасці, змяняла маску экзальтацыі на страх.

“Мы нічога не пабачым праз слана!” — застаючыся не столькі цвярозым, колькі вечна незадаволеным сямейнікам, заўважыла Ганна.

“Нічога, паслухаем!” — парыраваў бацька і загадаў Памазку прапаўзці пад жывёлай. Слуга праслізнуў у арку слановых ног і ўключыў тэлевізар.

Ніякага экстраннага выпуску навін не было. У сетцы галоўнага канала сапраўды стаяла перадача пра жывёл, але гаворка ў ёй ішла зусім не пра сланоў, што было б лагічным, але пра страусаў, якія, як жартаваў голас за кадрам, калі спалохаюцца, хаваюць галаву ў пясок.

“Ну не можа ж быць такога, каб усе разам не заўважылі таго, што адбываецца?! Хадземце на двор!” — прапанаваў Аляксандр, і ўсе (апрача Памазка, які так і працягваў стаяць у позе пытальніка пад брухам слана) выйшлі з дома.

*Значыць, гэта раман пра нашэсце жывёл?* **Ананім**

*Так, гэта кніга пра нашу гісторыю...* **Добры самаранін**

*Слухай, а будзь сябрам, скінь яшчэ плз крышачку, што там было далей, а то я так і не зразумеў, ці хачу сабе набыць гэты раман...* **Ананім**

*А вам не здаецца, што прасиць скинуць пирацкую копию — гэта, ни больш ни менш, парушэнне аутарских правощ?!* **Невядомы карыстальнік**

*Зусім не! Мы ж перадаём сябрам кнігі, якія прачыталі! Што такога, калі Добры самаранін падзеліцца са мной урыўкам, які ўжо прачытаў? Да таго ж, калі мне сапраўды спадабаецца пачатак — я абяцаю, што набуду сабе гэтую кнігу і нават каму-небудзь падару!* **Ананім**

Нягледзячы на балоцісты ландшафт, гэта быў самы раскошны раён горада. Тут, на значнай адлегласці адна ад адной, сярод паваслых чаротам выспаў узвышаліся дзівосныя вілы найбольш уплывовых людзей краіны. Мясцовую фаўну складалі пераважна дыпламаты і палітыкі, вядомыя рэжысёры і чыноўнікі найвышэйшага звяна. Не прайшоўшы і ста метраў, абмінуўшы дом прэм'ера і вілу галоўнага трэнера футбольнай зборнай, Аляксандр налічыў пяць сланоў. Таўстаскурыя, бурага і шэрага колеру, хордавыя млекакормячыя тырчалі з-за масіўных бетонных платоў і кутых агароджаў, з-за кіпарысаў, прадвеснікаў смерці, і вялізных гаражоў, у якіх гадамі пыліліся рарытэтныя аўтамабілі, што дапамагалі іх гаспадарам перажываць імпатэнцыю, дэпрэсію і штодзённую хлусню блізкім.

Асляпляльныя біўні, шлангі-хобаты і ветразі-вушы. Сланы стаялі цяпер ледзь не на кожным лужку, аднак самым дзівосным быў той, што ўзвышаўся напрыканцы вуліцы. У месцы скрыжавання з кругавым рухам, быццам будынак, тырчала жывёліна, памеры якой ашаламлялі: гэта быў аграмадны, вышынёй з пяць ці шэсць паверхаў, гігант, які маштабамі сваімі больш нагадваў цэпелін.

“Вы таксама гэта бачыце?!” — адчуваючы вострае паколванне ў грудзях, звярнуўся сам не ведаючы да каго Аляксандр.

“Так...” — ва ўнісон адказалі тыя, каму здалося, быццам пытаюцца ў іх.

Вуліца запоўнілася людзьмі. Збянтэжаны натоўп! Суседзі, усе як адзін у ядвабных піжамах з вышытымі залатымі ніткамі ініцыяламі, з замілаваннем і здзіўленнем разглядалі сланоў. Стоячы на ганку перад бацькоўскім домам, Ганна бачыла, як зусім агаломшаны бацька працягваў перабягаць ад аднаго знаёмага да другога. Увесь час штосьці запісваючы, вядомы літаратар Аляксандр звяртаўся то да міністра культуры, то да вядомага касманаўта, які ўсяго некалькі тыдняў як вярнуўся дадому. Усе гэтыя людзі стаялі цяпер пасярод вуліцы з кубкамі кавы і, быццам гуляючы ў гарачую бульбу, перакідваліся пытаннямі:

“Што за херня тут адбываецца, га?! — дапытваўся вядомы рок-музыка.

“Напэўна, з хвіліны на хвіліну выступіць Прэзідэнт?” — меркаваў міністр.

“Вядома! Хтосьці ж павінен патлумачыць усім нам, што адбылося!” — гаварыла куратарка біенале сучаснага мастацтва.

Пытанняў сапраўды было шмат:
“Чаму прыйшлі сланы?”
“Адкуль?”
“Што ім трэба?”
Загадка!

Пакуль уладныя людзі жанглявалі пытаннямі, Ганна вырашыла ўзяць ровар і паехаць у цэнтр, дзе сланы стаялі на кожным кроку. Вялікія і малыя, жывёліны ўзвышаліся цяпер над дрэвамі, займалі паркі і баскетбольныя пляцоўкі, паркоўкі і скрыжаванні. Нягледзячы на выключную дзіўнасць усяго, што адбывалася, гараджане не панікавалі і ў большасці сваёй успрымалі ўсё добразычліва і весела. Пазней, успамінаючы той дзень, Ганна ажыўляла ва ўяўленні толькі ўсмешкі, смех людзей, якія фатаграфаваліся са сланамі, і хтосьці нават спрабаваў залезці на іх, што, зрэшты, адразу ж прыводзіла да першых траўмаў, але дробных.

*Я, дарэчы, таксама даволи добра памятаю той дзень. Аписана, трэба прызнаць, дакладна. Наш слон зъявіуся на досвитку, тольки у мяне з жонкай ниякага асабняка не было, таму грамила занящ усю нашу спальню. Я тады яшчэ падумау: а што адбываецца з людзьми, якія жывуць у аднапакаёуках?*
*Памятаю, нягледзячы на тое, што слон нейким цудам аказауся щ кватэры на сёмым паверсе — ниякага асабливага страху мы з жонкай не адчували. Хутчэй нямое здзиуленне. Наш таустун паводзищ сябе спакойна и, я б нават сказау, мирна. Яшчэ памятаю, што, вызирнуушы щ акно, я пабачыу, што многия и сапрауды бегали ад слана да слана и фатаграфавалися. Памятаю яшчэ, што жонка тады запыталася, што мы цяпер будзем рабиць, и я адказау ёй, што щся гэтая ситуацыя, дакладна, ну максимум на тры дни...*
**Невядомы карыстальнік**

*Ды не было і блізка нічога такога! Вы нармальны?!*
**ТваяDomina2022**

Вярнуўшыся дадому, Ганна ўвайшла ў вялізную кухню і заспела бацьку ў кампаніі здранцвелай жонкі і некалькіх скамянелых суседзяў. Усе, хто сабраўся, быццам загіпнатызаваныя, назіралі за сланом, які ўпершыню на іх вачах спраўляў патрэбу. Відовішча гэтае захапляла і заварожвала! Ніколі раней Ганна не бачыла нічога падобнага. Наўрад ці яна магла ўявіць, што падобны да ржавай вады струмень слановай мачы можа быць да таго магутным, а карычневыя камкі спаражненняў настолькі вялікімі.

“Божа, мае дываны!” — ціха прашаптала мама.

“Купім новыя!” — усміхнуўся бацька.

“Я збегаю ў краму па вёдры”, — скеміў Памазок.

Калі жывёліна скончыла, бацька прапанаваў агаломшаным гасцям перабрацца ў сад, дзе паспрабаваў раптам адцягнуць увагу суседзяў ідэяй новага рамана:

— Ведаеце, я даўно хачу напісаць кнігу, якая будзе складацца толькі з каментароў...

— Гэта як? — азірнуўшыся на слана, які віднеўся ў акне, запытаў сусед-дрэсіроўшчык.

— А вось так! — стараючыся стрымліваць хваляванне, адказаў Аляксандр. — Вы толькі ўявіце сабе: прыходзіце вы ў краму, падыходзіце да паліцы, цягнецеся па кнігу, разгортваеце яе, а ніякага рамана ўнутры няма — адны толькі каментары, чытаючы якія, вы і здагадваецеся, пра што была кніга...

— То-бок самога тэксту няма, але ёсць толькі рэакцыя на яго?

— Менавіта!

— Які цікавы фармат, Аляксандр! — спрабуючы бадзёрыцца, сказала Сафія, але перадаць гэты запал гасцям не атрымалася. Усе працягвалі круціць галовамі, разглядаючы сланоў: ці таго, што стаяў у доме, ці суседскага.

— Мне даўно хацелася паразважаць пра форму і межы літаратуры, — не здаваўся Аляксандр, — паразмаўляць пра тое, дзе раман пачынаецца, а дзе заканчваецца, хто робіцца яго героямі, а хто — не, і, у рэшце рэшт, я заўсёды хацеў адказаць на пытанне, якое мучыць мяне яшчэ з універсітэцкай лаўкі, а менавіта: кніга чытае нас ці ўсё ж такі мы яе?

Атрымлівалася дрэнна. Як ні стараўся вядомы пісьменнік ды (*чалавек, які піша эсэістычныя творы, 32 па гарызанталі, 6 літар*) заставацца нязмушаным, госці, як студэнты на нуднай пары, увесь час гублялі ўвагу. Тое, што адбывалася, прымушала адных недарэчна жартаваць, а іншых, наадварот, быццам пад панцыр, уціскацца ва ўласныя целы, падсвядома стараючыся паменшыцца і схавацца. І хаця на выгляд гэтая “сустрэча з чытачамі ў садзе” нічым не адрознівалася ад соцень папярэдніх, усім у тую раніцу было відавочна, што голас Аляксандра — не больш як фон. Так чалавека, які вось-вось страціць прытомнасць, медыкі, што прыбылі на месца, пераконваюць працягваць гаварыць. Назіраючы за суседзямі, Ганна бачыла, што ўсе яны не хацелі слухаць бацьку, але ў той жа час марылі, каб ён ніколі

не змаўкаў: апынуцца ў цішыні ў тую раніцу азначала ўпершыню застацца сам-насам са сваім/чужым сланом...

*А я вось роўна тут і перастала чытаць! Ну якія сланы? Ну якое нашэсце? Можа, у той дзень з заапарка і ўцякла адна ці другая жывёліна, але раздзьмухваць з гэтага цэлы раман і расказваць, што мы тут чагосьці там не заўважалі, што сланы былі ў кожным доме, ну камон!* **ТваяDomina2022**

*Любіце чытаць? Робіце гэта нават па начах пры прыглушаным святле? Праглынаеце па дзесяць кніг у месяц, але ўсё часцей заўважаеце, што вочы пачынаюць балець, а літары распаўзаюцца? Не перажывайце! Найлепшыя спецыялісты клінікі "Вострыя вочкі" абавязкова дапамогуць вам! Пераходзьце па спасылцы, уводзьце прамакод lyblychytac і атрымлівайце зніжку 15% на лазерную карэкцыю зроку!* **<u>Спасылка выдаленая ў сувязі з правіламі суполкі</u>**

*Я защсёды, кали чытаю каментары на книжных форумах, думаю, да чаго ж няшчасным и незанятым павинен быць чалавек, каб прыходзиць сюды и выказвацца?* **Невядомы карыстальнік**

*А мяне першы раздзел, наадварот, вельмі захапіў! Мяне ўразіла, як дакладна і пэўна апісана ўсё, што з намі тады адбывалася! Асабіста мне было вельмі цікава вярнуцца ў мінулае...* **Антон**

*Чаму ж у мінулае? У сучаснасць жа!* **Дрэсіроўшчык**

ЗУСІМ САКРЭТНА

Міністру ўнутраных спраў

Аб тэрміновай неабходнасці стварэння інспекцыі сланоў пры Гарадскім упраўленні МУС

У сувязі з масавым і хаатычным з'яўленнем груп жывёл на тэрыторыі сталіцы адзначаецца рост нестандартных і праблематычных сітуацый, якія патрабуюць удзелу паліцыі. Для каардынацыі дзеянняў і мінімізацыі наступстваў прапануецца стварыць Слановую інспекцыю (далей — Інспекцыя) як падраздзяленне Гарадскога ўпраўлення МУС з мэтай прадухілення/змяншэння павелічэння колькасці парушэнняў грамадскага парадку, такіх як блакаванне аўтамабільнага руху або пашкоджанне/знішчэнне дзяржаўнай або прыватнай маёмасці.

Лічым мэтазгодным стварэнне рэгістрацыйнага рэестра (зводнай міжведамаснай табліцы) уліку ўсіх сланоў, якія знаходзяцца на тэрыторыі горада, з апісаннем характарыстык (вага, рост, паводзіны) жывёл, кантролем за іх перамяшчэннем, а таксама працай з насельніцтвам: навучаннем грамадзян правілам узаемадзеяння са сланамі.

Для службовага карыстання

Жывёлы не зніклі. Паліцэйскія пачалі патруляваць горад і ўжо ў першыя суткі сутыкнуліся з мноствам праблем у вопісе прыбылых сланоў. Нягледзячы на тое, што нязваныя госці ў масе сваёй стаялі нерухома, супрацоўнікі правапарадку, якія перабягалі з месца на месца, асцерагаліся, што той ці іншы слон, магчыма, ужо быў улічаны — некаторыя жывёліны занадта нагадвалі сваіх ужо апісаных суродзічаў. У сувязі з гэтым у першыя ж гадзіны назірання ўзнікла разуменне, што, апрача звычайных рукапісных фіксацый, варта б нумараваць сланоў, рабіць фотаздымкі і нават, калі на тое будуць вылучаныя дадатковыя сродкі — ужыўляць жывёлам спецыяльныя чыпы і праводзіць аналізы ДНК. Прапановы гэтыя былі рашуча адхіленыя, бо ніхто ў тыя дні не сумняваўся, што ў найбліжэйшы час, нацешыўшыся стаянкай, жывёлы пакінуць горад і рушаць далей.

Гэтай жа версіі прытрымліваўся і Аляксандр. Ужо на наступную раніцу, спусціўшыся ў сталовую, бацька Ганны кінуў абыякавы позірк на жывёліну, што стаяла ў гасцёўні, і абсалютна спакойна сказаў:

“Цікава, ён усё яшчэ тут...”

Бацька сказаў гэта так, нібыта ведаў дакладны час, у які слон павінен пакінуць дом. Учарашняе вялікае здзіўленне не пражыло і суткі. Перамена, якая адбылася ў бацьку ўсяго за ноч, уразіла Ганну, якая прыйшла на сняданак.

“Яшчэ ўчора, — думала яна, — ён бегаў ад дома да дома і штосьці там сутаргава запісваў у свой дзённік, а сёння раптам абыякавы...”

Ганна, якая ў гэты момант сядзела за сталом разам з маці, чакала, што бацька падыдзе да жывёлы і, магчыма, нават пагладзіць яе, але памылілася. На дзіва, Аляксандр прайшоў у сталовую і пачаў чытаць крыжаванку, якую звычайна і ў рукі не браў:

"Напэўна, нам трэба даць яму імя?" — спрабуючы зразумець, што адбываецца з бацькам, запыталася Ганна.

"Гэта яшчэ навошта?!" — не адрываючыся ад крыжаванкі, але ўдавана прыўзняўшы брыво, парыраваў Аляксандр.

"Будзе дзіўна, калі наш гадаванец застанецца без мянушкі..."

Сафія паглядзела на мужа, аднак той нічога не адказаў. Замест гэтага Аляксандр усміхнуўся і пацягнуўся па каву. У тую марозную лютаўскую раніцу, калі снегу не было, але паветра, якое ўрывалася ў прачыненае акно, халадзіла і бадзёрыла, усім сваім выглядам бацька жадаў данесці, што тое, што адбываецца, яго больш не цікавіць. Перамена па шчаўчку. Адной ночы аказалася больш чым дастаткова. Хваляванне выпарылася, захапленне сышло. Нягледзячы на тое, што з моманту з'яўлення слана прайшлі ўсяго суткі, вядомы пісьменнік гордым позіркам маніфеставаў поўную страту ўсялякай цікаўнасці. Цуд — не цуд. Ганна спапяляла бацьку позіркам, і маўчаннем сваім ён пасылаў ёй ясны і дакладны сігнал: тэма закрытая. Экстраардынарная сітуацыя заставалася гэтакай для ўсіх, але больш не для яго. Аўтар дзясятка бестселераў, вялікі пісьменнік і мысляр, як і чакалася ад

сапраўднага інтэлектуала, вырашыў раптам заставацца “над сітуацыяй”.

Слон, раптам сцвердзіў бацька, — дробязь, лухта і, калі ўдумацца, нават не стрэмка!

“Значыць, цябе, тата, жывёла, якая стаіць пасярод гасцёўні, больш не здзіўляе?” — не жадаючы здавацца, працягвала свідраваць бацьку позіркам Ганна.

Кантроль над сітуацыяй прадугледжваў глыбокі ўдых і павальнейшы за ўдых выдых. Аляксандр набіраў поўныя лёгкія паветра, асцярожна выпускаў яго назад і... не адказваў.

“Дзеля чаго? — разважаў ён. — Навошта траціць столькі часу на прахадную, па сутнасці, гісторыю?” Ну колькі падобных (вялікіх і не вельмі) здарэнняў засталося ззаду? Перавароты і заказныя забойствы, палітычны пераслед і землятрусы, эпідэміі і каранціны. Інтрыгі ў тэатрах, разводы з першымі жонкамі і нараджэнне таемна ад Сафіі, на старане, пазашлюбнага сына. Аляксандр бачыў так шмат! Ён столькі перажыў! Абвінавачванні ў нявыплаце падаткаў, бясконцыя паклёпы зайздроснікаў і палюбоўніц-аднадзёнак, скандалы на тэлебачанні і авіякатастрофа, пасля якой ён цудам застаўся жывы і цяпер ходзіць з кіем. Біяграфія вялікага пісьменніка налічвала некалькі соцень драматычных старонак, і той раніцай, напэўна, крыху штучна, але ўсё ж даволі зразумела ён патлумачыў сямейнікам, што бяскрыўдны і да таго ж даволі сімпатычны слон — не самае запамінальнае здарэнне ў яго напоўненым яскравымі падзеямі лёсе.

“Ау! Я з кім размаўляю?! Ты што, так і будзеш рабіць выгляд, што нічога не адбываецца?!”

“Мілая, навошта нам рабіцца падобнымі да панікёраў і алармістаў, якія пры кожнай магчымасці імкнуцца разгайдаць лодку ў нашай краіне? Я пагаварыў з уплывовымі людзьмі, і, паводле маіх звестак, сітуацыя абмяркоўваецца на самым высокім узроўні — у найбліжэйшы час пытанне будзе вырашанае. Гэта ўсяго толькі заблукалы слон. Лепш паслухайце з мамай, што я прыдумаў!”

“Пацешце, Аляксандр, зрабіце ласку!” — радуючыся змене тэмы, тут жа ўключылася Сафія.

“Тату, ты сур’ёзна?!”

“Больш чым! Дык вось, мая новая гісторыя такая: значыць, у нас у «дадзена» простая правінцыйная сям’я. Ён звычайны электрык, яго жонка настаўніца літаратуры. У іх ёсць дзеці, многа дзяцей, і ўсе яны такі ж просты працоўны люд. Яму пад шэсцьдзясят, жонцы таксама. Ён непрыгожы, як і яна”.

“Так-так, Аляксандр, базіс, як заўсёды, ясны!”

“І вось аднойчы мужык раптам знікае — ён збірае рэчы і, кінуўшы жонку, з’язджае за акіян!”

“У пошуках прыгодаў?”

“Можна і так сказаць. Ён закахаўся ў порнаакторку, фільмы з якой глядзіць штодзень”.

“Ён закахаўся ў жанчыну, якая здымаецца ва ўсіх гэтых агідных, вульгарных ролiках?”

“Менавіта! Штодзень ён зачыняецца ў гаражы і глядзіць фільмы з адной і той жа акторкай. І вось аднойчы ён пачынае адчуваць, што шалёна закаханы ў яе. Усвядоміўшы гэта, ён збірае

неабходныя дакументы, атрымлівае візу, кідае ўсё сваё папярэдняе жыццё і адпраўляецца ў доўгае падарожжа, каб адшукаць жанчыну сваёй мары...”

“Значыць, гэта будзе кніга пра глупства?”

“Гэта будзе кніга пра вялікае каханне!”

“І што ж, ён кіне прыстойную сям’ю дзеля шлюхі?”

“Дзеля акторкі і жанчыны ўсяго свайго жыцця!”

“І ён знойдзе яе?”

“Не...”

“Чаму?”

“Бо, адолеўшы бясконца доўгі шлях (думаю, я напішу класічнае роўд-муві), ён дабярэцца нарэшце да яе горада, знойдзе кінастудыю і даведаецца, што акторка, якую ён шукае, ужо некалькі гадоў як памерла. Прадзюсары працягваюць выкладваць серыі з яе ўдзелам, але самой дзяўчыны, на жаль, даўно няма. Яна пяшчотная і ні да кога не падобная толькі на плёнцы, але не ў рэчаіснасці...”

“Так яму і трэба!”

“Ну, як вам ідэя?”

“Думаю, Аляксандр, вы маглі б лепей!”

“Сапраўды?! А мне падаецца, што выдатная ідэя! Я б назваў гэты раман «Мне падабаецца»”.

“А мне — не!”

“Ой, гэта было б абсалютна цудоўна, калі б у каментарах людзі адразу б так і пачалі пісаць: мне не падабаецца...”

Ганна злавала. Усяго суткі, як дома стаяў слон, сапраўдны, жывы, вялізны слон, і вось ужо татка,

як нічога ніякага, расказваў ідэю новага рамана пра закаханага ў порнаакторку мужчыну.

"Ён сур'ёзна?!"

Тое, з якім спакоем і нават абыякавасцю бацька казаў пра жывёлу, адначасова ўражвала і здзіўляла. Тут былі два варыянты: ці бацька заставаўся чалавекам велізарнага ментальнага здароўя, ці (у што Ганна цяпер верыла больш) старым канфармістам, які, не ведаючы, што рабіць, хаваўся за штучным спакоем. Так ці інакш, забыўшыся дома крыжаванку, не жадаючы разгадваць бацькоўскую, нудзячыся без маладога чалавека, Ганна не пакідала Аляксандра ў спакоі:

"Тату, у цябе пасярод хаты стаіць слон, а ты снедаеш, быццам нічога не адбываецца?!"

"А ты чаго не снедаеш? Памазок, прынясі яшчэ вішнёвага джэму, калі ласка!"

"Снедаю, але я хаця б заўважаю слана!"

"І я заўважаю, але чаго ж пра гэта другі дзень запар размаўляць?"

"Значыць, будзем проста назіраць?"

"А што ты прапануеш?"

"Не ведаю, але ж трэба штосьці рабіць!"

"Вось менавіта! Ты не ведаеш што, але, як заўсёды, прапаноўваеш штосьці рабіць! А ведаеш чаму? Бо ні з адной праблемай у сваім жыцці ты не справілася сама! Бо ўсё і заўсёды ў гэтым доме рабілі за цябе, так што і гэтым разам, зрабі ласку, дай людзям магчымасць падаць табе вынік на спадачку!"

Ганна падскочыла і кінула сурвэтку на стол. Аляксандр менавіта на гэта і разлічваў і таму, калі

дачка вылецела са сталовай, толькі ўсміхнуўся жонцы.

“Навошта вы з ёй так?”

“Мы выхавалі бездапаможную гультайку. Калі ўжо яна нічога ў гэтым жыцці не робіць — няхай хаця б мае ласку не ўказваць, што рабіць іншым!”

Плюхнуўшыся на раскошны ложак у адной са спальняў свайго асабняка, разглядаючы ўласнага слана, Ганна расплакалася, як у дзяцінстве:

“Чаму бацька так павёў сябе? Чаму раптам пачаў выхоўваць мяне? Добра, што хоць не пры Пашу!”

Не, падумала Ганна, я гэтага так не пакіну! Жадаючы праявіць сябе і дапячы бацьку, яна збегла назад па шыкоўнай лесвіцы, перабегла сад, вуліцу, лужок і зноў апынулася ў бацькоўскай сталовай.

Ганна моўчкі прайшла міма бацькі і, склаўшы рукі на грудзях, перавяла позірк на маму. На не меншае здзіўленне дачкі, Сафія так жа сама, як і муж, абыякава ўсміхнулася. Ганна ўсвядоміла раптам, што і мама вырашыла пагуляць у бацькаву гульню. Аднак, калі Аляксандр дэманстраваў поўны кантроль і вытрымку, Сафія, наадварот, была разгубленая і асабліва не разумела, што адбываецца. Невядомая трывога літаральна паралізавала яе. Яшчэ ўчора, адчуваючы шок, мама ўвесь час гаварыла пра слана, а цяпер раптам вырашыла пераключыцца і, на здзіўленне Ганны, заявіла, што збіраецца пачаць у доме рамонт.

“Рамонт?!” — перапытала Ганна.

“Так, мілая, я падумала, што мы даўно нічога не змянялі...”

Вось дык навіна! Звычайна засяроджаная толькі на вядзенні бацькавых спраў, мама раптам агаломшыла Ганну ідэяй перамен. Аказалася, што слон, які з’явіўся пасярод дома, — добрая нагода, каб усё змяніць. Мама пачала прыкідваць, якую варта заказаць сантэхніку і як лепш адцыкляваць падлогу, ці ва ўсіх пакоях неабходна пераклейваць шпалеры і якую менавіта мэблю варта купляць у спальню. На слушную заўвагу Ганны, што слон з вялікай доляй верагоднасці ўсё гэта разматлашыць, мама нічога не адказала і працягнула ўяўляць колер фіранак у спальні:

“Можа, цёмна-чырвоныя?”

“Ці не занадта крывава?”

“Ань, ты мне не дапамагаеш!”

“Напэўна, трэба, каб спалучалася са сланом?”

“Навошта? Тата ж сказаў табе, што зусім хутка яго тут не будзе!”

*Вось гэта вельмі ржачна, бо мае старыя таксама рамонт замуцілі ў тыя ж самыя дні!* **Антон**

ЗУСІМ САКРЭТНА

Міністру ўнутраных спраў

Аналітычная запіска аб стане псіхічнага здароўя насельніцтва

Аналіз бягучай сітуацыі сведчыць, што колькасць зваротаў да псіхіятраў, псіхолагаў, тэрапеўтаў, нумаролагаў, варажбітак і служыцеляў царквы крыху павялічылася, аднак нязначна (працягваюцца назіранні). Таксама зафіксаваны нязначны (у дапушчальных межах) рост спажывання тытунёвых вырабаў, алкаголю (лёгкага і моцнага), а таксама ўсіх відаў наркатычных рэчываў. Установы аховы здароўя адзначаюць невялікае павелічэнне колькасці грамадзян са скаргамі на бяссонніцу і трывожнасць, аднак і гэтыя паказчыкі застаюцца ў межах нормы.

Для службовага карыстання

Сланы заставаліся ў горадзе. Сітуацыя здавалася спакойнай, жывёлы бяскрыўднымі, і ўсё ж, нягледзячы на мяккія і непрыкметныя дзеянні дзяржавы, па сталіцы пайшлі чуткі пра першыя здарэнні. Гаварылі (зрэшты, без асаблівай упэўненасці), што дзе-нідзе жывёлы пачалі паводзіць сябе агрэсіўна і нават кідаюцца на людзей. Хтосьці з суседзяў Ганны сцвярджаў нават, што сярод грамадзян ужо ёсць сур'ёзныя траўмы і нават... пралітая першая кроў, і зусім не слановая! Хтосьці расказаў ёй, маўляў, нават ёсць фотаздымкі, і Ганну гэта вельмі напалохала:

“Тата, ты чуў, гавораць, што слон растаптаў пяцігадовую дзяўчынку?!”

“Божа, ды адкуль у цябе гэтая інфармацыя?”

“Людзі гавораць...”

“Людзі многа чаго гавораць, а ў такіх сітуацыях і пагатоў, але я чамусьці не бачыў аніводнай навіны пра гэта!”

“Гавораць яшчэ, што не толькі на ўскраінах, але і побач з намі сланы таксама атакуюць людзей...”

“Ну што за лухта?!”

Нягледзячы на намаганні МУС, чуткі распаўсюджваліся імкліва (наўрад ці знайшоўся б у тыя дні чалавек, які нічога не чуў пра затаптаных грамадзян). Зрэшты, панікі не было. Рэдкая трывога — так, частковая збянтэжанасць — так, лічаныя нязручнасці — можа быць, але не больш з тое. Калі ў тыя дні і з'явіліся першыя пасіянарыі, якія

заклікалі неадкладна разабрацца ў сітуацыі, людзей такіх было мала. У большасці сваёй грамадства працягвала дэманстраваць спакой:

“Трэба разабрацца з тым, што адбываецца!”

“А пры чым тут наогул я? Я сваімі дзеяннямі магу толькі нашкодзіць! Няхай дзейнічаюць прафесіяналы!”

“Хіба я іх сюды запрасіў?”

“Чаму я павінен адчуваць страх за тое, да чаго не маю аніякага дачынення?”

“Па тэлевізары кажуць, што ўсё пад кантролем!”

Падслухоўваючы размовы ў рэстаранах і кавярнях, адчуваючы першыя адзнакі трывогі, Ганна заўважала ў тыя дні, што замест пошуку рашэнняў гараджане ўсё часцей спаборнічалі ў вынаходніцтве апраўданняў:

“Трэба давяраць уладам! Яны ведаюць, што рабіць! Калі кожны будзе наводзіць парадак па-свойму — атрымаецца хаос!”

“Ну ўжо калі там, наверсе, нават самыя ўплывовыя людзі краіны не могуць нічога зрабіць, то што ж тады магу зрабіць я?”

“Сланы ёсць паўсюль, калі мы пазбавімся гэтых — усё адно потым прыйдуць новыя! Трэба проста перачакаць!”

“На ўсё ёсць свае прычыны — на ўсё воля Божая!”

“Не думаю, што цяпер трэба правакаваць сланоў. Лепш благі мір, чым вайна з велізарнымі жывёламі, якія, да таго ж, зусім непрадказальныя! Калі мы разззлуём іх — будзе толькі горш!”

“Наогул, калі паглядзець на гісторыю, то гэта іх зямля спрадвеку!”

“Я жывёламі не цікаўлюся...”

У тыя першыя тыдні, спрабуючы разабрацца ў сабе, Ганна не разумела: усеагульная абыякавасць супакойвае ці палохае яе? Стараючыся цвяроза ацэньваць сітуацыю, пераадольваючы ўласныя пачуцці, звязаныя з прыходам слана, Ганна заўважала, што людзі ў большасці сваёй паводзяць сябе вельмі спакойна, але ці значыла гэта, што і ёй варта было рабіць тое ж? І што — каб яго! — значыў гэты спакой?!

Знаёмыя і сябры (усе, апрача Паўла) лічылі за лепшае заставацца ўбаку. Гаварыць — так, прапаноўваць ідэі — таксама, але ні ў якім выпадку не пераходзіць да дзеянняў, бо ці мала што...

Ганна назірала, як пачынаецца аблога чалавека і распаўсюджваецца вірус цішыні. Здаецца, толькі праз шмат месяцаў яна зразумее, што ўжо тады, у самыя першыя тыдні нашэсця, свядома ці не, умела ці камічна, гараджане спехам хавалі страхі. Трывогу залівалі віном і заспакаяльным, жах — занюхвалі какаінам. Напалоханасць хавалі пад усмешкамі, а паніку трансфармавалі ў скупку прадуктаў і непатрэбных рэчаў. Цяпер Ганна ўспамінала, што тады, у першыя тыдні, стоячы дзе-небудзь на святлафоры ў цэнтры горада, яна назірала здранцвенне мінакоў. Як ні намагаліся яны рабіць выгляд, што нічога асаблівага не адбываецца, дрыготка выдавала фобіі. Нервовасць і хваляванне

запаўнялі паветра, і, хоць кожны тады стараўся быць халаднакроўнай версіяй сябе, штучная абыякавасць выдавала вялікую напалоханасць, якая, і ў гэтым усё ж варта было прызнацца хаця б тайком і хаця б самой сабе, авалодвала і Ганнай...

*На жаль, мала хто з каментатараў заўважае, што перад намі вялікі зялёны раман — раман новага ветру. Мне дзіўна, што ніхто з каментатараў не бачыць, што ў гэтай кнізе паднятае такое важнае цяпер пытанне кліматычнай павесткі. Чаму гаворка тут ідзе пра сланоў? Адказ на паверхні! Бо прырода патрабуе сваё! Гэты тэкст — сур'ёзны маніфест: наша планета на мяжы вымірання! Гэтая кніга літаральна крычыць нам, што мы не гатовыя хутка і выразна рэагаваць на змены. Мы, людзі, знішчаем нашу Зямлю, і праз тое, што сярод нас няма моцных асоб — жывёлы вымушаныя абараняць нашу агульную будучыню!* **Актывіст13**

*Божа, гэтых хворых левакоў-грынпісаўцаў тут толькі не хапала! Зразумела ж, што гэтая кніга ні пра які ні пра клімат, а пра адсутнасць разумення і блізкасці паміж пакаленнямі! Тут у нас класічная праблема бацькоў і дзяцей! Праблемы ў сям'і, якія ўсім відавочныя, але якія ніхто не хоча заўважаць!* **Арына-балерына**

*А мне падаецца, што, як заўсёды ў гэтага аўтара, гэта раман пра (16 па вертыкалі, 5 літар)* **Ананім**

ЗУСІМ САКРЭТНА

Міністру ўнутраных спраў

Аператыўны план забеспячэння
бяспекі ўрадавых будынкаў

У сувязі з хаатычнай і непрадказальнай абстаноўкай у сталіцы, выкліканай з'яўленнем вялікай колькасці габарытных жывёл, узнікае неабходнасць узмацнення бяспекі аб'ектаў дзяржаўнай важнасці. У тэрміновым парадку прапануецца:

Забяспечыць усталяванне дадатковых камер відэаназірання з дыстанцыйным кантролем прылеглых тэрыторый, а таксама адсочваннем перыметра і подступаў да будынкаў дзяржаўнай важнасці. Правесці работы па ўмацаванні вокнаў, дзвярэй і ўнутраных перагародак з выкарыстаннем браняплёнкі і ўзмоцненай фурнітуры (выканана). Усталяваць металічныя бар'еры на магчымых маршрутах падыходу сланоў да будынкаў (перашкоды павінны выглядаць як элементы добраўпарадкавання (клумбы, агароджы)). Арганізаваць запасныя выхады для эвакуацыі супрацоўнікаў у выпадку небяспекі. Размясціць мабільныя групы паліцыі і ўнутраных войскаў у межах 500 метраў ад урадавых будынкаў. Групы павінны знаходзіцца на закрытых аб'ектах (паркоўках, складскіх памяшканнях) і быць гатовымі да хуткага разгортвання. Забяспечыць групы сродкамі нелетальнага і летальнага ўздзеяння. Выкарыстоўваць суседнія будынкі як часовыя пункты схову для высокапастаўленых асоб.

Для службовага карыстання

Яны пазнаёміліся за год да нашэсця сланоў. Разам з сяброўкай Ганна прыйшла ў бар, дзе выступаў вядомы комік.

— Першы раз бачу, каб падчас майго выступу хтосьці разгадваў крыжаванку! — падсеўшы, з усмешкай сказаў Павел.

— Як называецца чалавек, які вывучае сланоў? Адзінаццаць літар, дзевяць па вертыкалі...

— Можа быць... — Павел узяў у Ганны асадку і ўпісаў слова.

— Падыходзіць...

Ганна ўсміхнулася, і Павел закахаўся. Яна падзякавала яму, і ён быў ашаломлены тым, як яна гаворыць. Слухаючы Ганну, з першых хвілін Павел адчуваў неймавернае шчасце супадзення, калі атрымліваеш фізічную асалоду ад таго, як і пра што гаворыць жанчына, што сядзіць насупраць. Ганна зачаравала яго. Рытмам, пачуццём гумару. Кожная фраза, усялякая заўвага траплялі ў самае сэрца.

Увесь той вечар і ўсю тую ноч, калі ў вялікай кампаніі сяброў яны пераходзілі з бара ў бар, ён адчуваў ціхае захапленне. Ужо ў тыя першыя гадзіны, разглядаючы Ганну, ён разумеў, што зусім прапаў, аднак з апошніх сілаў аджартоўваўся, стараючыся не напалохаць яе.

Кіпцік увяз.

У тую ноч яны не разышліся па дамах і на наступную раніцу ўсё той жа вялікай кампаніяй спачатку паснедалі ў кавярні каля тэатра, а потым адправіліся шпацыраваць па горадзе ў бок яго любімага рэстарана, які ёй не спадабаўся.

Падчас абеду Ганна сядзела побач. Яе ідэальныя, прыгожыя і тонкія рукі былі аголеныя, і Павал не мог адвесці вачэй ад яе татуіроўкі — напісанай ад рукі цытаты вялікага паэта:

*Нястрыманы агонь, гары, жывы, палай**

Увечары на наступны дзень, зноў у бары, падчас яго выступу Павел папрасіў пасадзіць Ганну ў першым шэрагу. Спецаперацыя прайшла паспяхова, і ён адчуваў, што ў яго жыцці адбываюцца самыя шчаслівыя гадзіны: яго жарты падабаліся і ёй, і зале. Трымценне. Эйфарыя. Бура пачуццяў. Яна ўсміхалася. Здавалася, ніколі раней ён не быў настолькі смелы і ўдалы. Прагаворваючы стары і новы матэрыял, ён абавязкова смяшыў публіку і быў упэўнены, што ўсе зайздросцяць яму: ён быў вясёлы, дасціпны і закаханы. Варта было яму страціць увагу і паглядзець на Ганну — па целе адразу ж беглі дрыжыкі. Ён адчуваў сябе футбалістам, які забівае гол у фінале чэмпіянату свету, ён адчуваў сябе хірургам, які ратуе чалавека пасля дзевяцігадзіннай аперацыі на сэрцы, ён адчуваў сябе вялікім віяланчэлістам, які дае найлепшы ў жыцці канцэрт з аркестрам.

На наступную раніцу ён з'язджаў выступаць на поўнач краіны. Да ад'езду заставалася ўсяго пару гадзін, і, набраўшыся смеласці, Павел запрасіў яе на сняданак. Праз некалькі тыдняў

---

* З песні Булата Акуджавы (пераклад Андрэя Хадановіча).

яна прызнаецца яму, што, збіраючыся на тое іх першае сапраўднае спатканне, раптам адчула, што хвалюецца.

Ён саромеўся. Дурэў, жартаваў, стараўся быць сабой і ўгаворваў яе з'есці паштэльку. Глядзеў на гадзіннік і разумеў, што яшчэ ніколі час не раставаў так хутка і невыносна пяшчотна, быццам крэм на яе вуснах. Ён не памятаў, пра што яны гаварылі. Яна таксама.

Яны развіталіся, і абсалютна зачараваным чалавекам ён пакінуў горад, каб на беразе мора смяшыць людзей і тужыць па Ганне. Павел бясконца чакаў таго моманту, калі зможа вярнуцца ў нумар, каб патэлефанаваць ёй. Калі гэта нарэшце здарылася, ён быў на сёмым небе ад шчасця. Яны гаварылі бесперастанку ночы напралёт. Адна тэма змяняла іншую, і гэта былі абсалютна дзівосныя размовы, якія, як яму здавалася, будуць працягвацца вечна.

“Ці сімвалізуе сцяг радзіму?”

“Ці з'яўляецца паразай эміграцыя?”

“Ці магчыма пражыць усё жыццё, так па-сапраўднаму і не пакахаўшы?”

“Ці ёсць сэнс жывіць надзею?”

“Ці можна не паважаць чалавека, якога ўсё яшчэ кахаеш?”

“Ці трэба дараваць чалавеку слабасць?”

Пазней Ганна прызнаецца, што ніколі не думала, што людзі могуць так проста і шчыра размаўляць пра ўсё. Яшчэ пазней Павел даведаецца, што для яе гэта не так ужо і важна...

Але пакуль ён вярнуўся і абняў яе.

Штодзень, як толькі яны развітваліся, ён пісаў ёй:

“Вельмі сумую. Трывожуся трохі...”

“Праз што?”

“Баюся, што ты разлюбіш мяне...”

“Ну не, цяпер гэта ўжо немагчыма...”

Яны сталі падарожнічаць. Куды б яны ні ішлі, дзе б ні шпацыравалі, Павел раз-пораз спыняўся і казаў:

“Тут мы яшчэ ніколі не цалаваліся”.

Яна ўсміхалася і моцна сціскала яго руку.

“Не магу паверыць, што аднойчы ты ўсё ж такі кінеш мяне”, — жартаваў ён.

“Немагчыма кінуць чалавека, які так смяшыць мяне”, — адказвала яна.

Ён гаварыў ёй:

“Ань, я вельмі твой”.

“А я твая!”

“Штодзень ты ўзрушваеш мяне”.

“Бо хочацца ўзрушваць!”

“Табе было добра?”

“Так, вельмі!”

“Праўда?! Сто тысяч мільёнаў адсоткаў? Бярэш адказнасць?”

“Сто тысяч мільёнаў адсоткаў, бяру адказнасць!”

Ён чакаў яе ўсё жыццё. З самага дзяцінства ў ім назапашвалася любоў, якую ён хацеў падарыць, і тыя першыя дні ён хваляваўся толькі

таму, што ўсёпаглынальнага пачуцця было так шмат, што яно магло напалохаць Ганну.

Кожны раз, адпраўляючыся з канцэртамі ў іншыя гарады, ён пасылаў ёй кветкі. Са смешнымі цыдулкамі. Яна дасылала свае фотаздымкі, на якіх была аголенай.

“Будзь такой заўсёды!” — каментаваў ён.

“Толькі калі ты будзеш так глядзець на мяне...” — адказвала яна.

Апынуўшыся ў новай кампаніі, ён вельмі любіў змаўкаць і разглядаць яе. Як найлепшы ў свеце 3D-прынтар, ён мог бы аднавіць кожную яе клетачку. Яна гаварыла, і ён маўчаў. Яму падабалася слухаць, падабалася назіраць, як лёгка яна знаходзіць агульную мову з любым чалавекам і як хутка здабывае прыхільнасць да сябе.

Яго эмацыйнасць, яго стаўленне да яе, яго ўключанасць неймаверным чынам уздзейнічалі на яе. Ганна адчувала, што раней ніхто і ніколі так не ставіўся да яе. І яна паверыла яму. І пайшла за ім. Яна пачала спазнаваць яго і адчуваць закаханасць. Ганна адчувала, што тое, як развіваліся іх стасункі, вельмі адрознівалася ад усяго, што ў яе было раней. І яна вельмі радавалася. У яе не падкошваліся каленкі, яна магла быць спакойнай і свабоднай. Пачуццё кахання расло і развівалася паступова. І ёй вельмі хацелася, каб яно спакойна мацнела, пашыраючыся і робячыся глыбейшым.

“Калі мы ўчора глядзелі спектакль, — пісала яна, — і трымаліся за рукі — гэта было для мяне вельмі важным, я заўсёды загадвала, каб у мяне быў

хлопец, які не адпусціць маёй рукі, бо нязручна, ці надакучыла, ці штосьці яшчэ. Я вельмі сур'ёзна да гэтага стаўлюся!"

"Я вельмі перажываю кожны раз, калі для чагосьці трэба на імгненне выпусціць тваю руку! Хвалююся, што ты падумаеш, што мне не хочацца цябе трымаць..."

*Вось і дурыла! Трэба было адразу разумець, што ёй гэта наогул усё не трэба было, што яна проста забаўлялася ад нуды, што каханне было толькі з яго боку!* **ТваяDomina2022**

*Ты ж казала, што щ самым пачатку кинула чытаць!* **Невядомы карыстальнік**

*Ну, як мы цяпер разумеем, яна не забаўлялася ад нуды (хаця і гэта, вядома, таксама), але проста хацела, каб кінапрадзюсар, які яе вечна дынаміў, прыраўнаваў і вярнуўся. Крыўдна, вядома, што для гэтых мэт яна выкарыстала жывога чалавека, але, зрэшты, усе ж мы так паступаем заўсёды.* **Марта**

*Ну, я прагортвала потым па дыяганалі, але тое, што гэтая лялька абавязкова кіне яго — гэта адразу было зразумела!* **ТваяDomina2022**

*Усім, акрамя яго…* **Ананім**




У першыя тыдні нашэсця Павел праводзіў амаль увесь вольны час у бібліятэцы. Рыхтуючы матэрыял для новых выступаў (вядомы комік быў упэўнены, што людзі чакаюць жартаў пра сланоў), ён хацеў як мага больш даведацца пра гасцей, якія раптам рабіліся нябачнымі гаспадарамі горада. Павел вычытваў з розных кніг, што сланы маюць імёны, і жывёлы прыдумваюць іх адно аднаму самі, што, найбліжэйшыя сваякі мамантаў, сланы насамрэч не баяцца мышэй і выдатна

ўмеюць плаваць, што, стасуючыся з суродзічамі пры дапамозе складанай сістэмы камунікацыі, выкарыстоўваюць вушы і хобаты. Чытаючы артыкул за артыкулам, Павел даведваўся ў тыя дні, што сланы таксама ладзяць выбары, але, у адрозненне ад людзей, кожны раз робяць гэта сумленна. Апрача таго, Павел разумеў, што сланы злапомныя і могуць быць вельмі агрэсіўныя...

*Я таксама мля адразу зразумеў што нічым добрым гэта не скончыцца! Занадта шмат дэбілаў навокал! Ужо ў першы грэбаны дзень калі толькі прывалілі вушастыя было ясна што хана што ўсё змянілася што жытуха ніколі не будзе ранейшай! Трэба быць поўным дзятлам каб гэтага не аддупляць! Сусед мой тупарылы нудзіў што гэта ўсяго толькі на некалькі дзён а я яму адразу так і сказаў, пеўнік, гэта на гады! І так і атрымалася ўжо на наступную раніцу слон затаптаў гэтага доўбня!* **Просты мужык**

*Калі ж скончыцца гэтая так званая "свабода" ў каментарыях?! Я лічу, што гэтаму даўно варта пакласці канец! Кожны піша што хоча, а потым які-небудзь ідыёт зойдзе на форум, прачытае і паверыць, што так яно і было! Які-небудзь замежнік прачытае гэтую кнігу і паверыць, што так усё яно і ёсць у нашай краіне. Я лічу, што кожны пост трэба правяраць і рэдагаваць, што павінна быць створаная спецыяльная камісія цэнзараў, якія чытаюць каментары і даюць ім прававую ацэнку!* **Сапраўдны патрыёт**

*Так, я б яшчэ папрасіла пруфы! Можа нехта выкласці мне хаця б адну фатаграфію свайго слана?!* **ТваяDomina2022**

*Ды лёгка! Трымай!* **Спасылка выдаленая ў сувязі з правіламі суполкі**

Калі пачыналі балець вочы, Павел даставаў з кішэні (*скрынка для захоўвання папярос, партабак, 7 па вертыкалі, 11 літар*), паліў, а потым пераходзіў вуліцу і ныраў у бар, дзе выступаў, а цяпер пастаянна сустракаўся з Ганнай. Пакуль на сцэне не было комікаў, у адкрытай прасторы шумелі незалежныя журналісты, палітолагі і актывісты, дзень пры дні абмяркоўваючы сітуацыю:

"На жаль, мы вымушаныя канстатаваць, што нам не пашанцавала з народам. Людзі ў нас не тыя! Паглядзіце на нашых суседзяў! Хіба можна ўявіць сабе, каб у іх там сланы таксама занялі вуліцы і іх грамадзяне нікуды б не выйшлі?!"

"Так, згода, нашы суседзі куды больш адважныя за нас!"

"Трэба працаваць з тым, што ёсць! Уявіце, што вы трэнер вельмі слабай футбольнай каманды. Які сэнс, калі вы штодзень будзеце расказваць дрэнным футбалістам, што яны дрэнныя футбалісты? Правільна, сэнсу ніякага! Неабходна закасаць рукавы і дабівацца вынікаў з тымі гульцамі, якія ў вас ёсць. Так, наш народ інфантыльны і баязлівы, але для таго мы і лічым сябе інтэлігенцыяй, каб павесці яго за сабой! Мы павінныя зрабіцца добрымі трэнерамі дрэннай каманды!"

"Дык некаторыя ж каманды не выйграюць дзесяцігоддзямі!"

"Так, усё так, не выйграюць, але раней ці пазней вырастае таленавітае пакаленне, якое робіцца чэмпіёнамі!"

"Згода..."

“Так, шкада толькі мы гэтага ніколі не пабачым...”

“Яшчэ як пабачым, калі толькі выйдзем да броўкі, а не будзем назіраць з трыбун!”

“А я прапаноўваю зладзіць акцыю, у якой вядомыя людзі, музыкі і мастакі, паэты і пісьменнікі будуць маўчаць на фоне сланоў...”

“Проста маўчаць?”

“Так, проста маўчаць!”

“Вельмі добра!”

“А я супраць! Грамадства і так маўчыць! Давайце лепш будзем крычаць на фоне сланоў! Што, калі я буду выходзіць на трыбуну і крычаць, напрыклад, дзве-тры хвіліны, каб перадаць боль, які ў мяне ўнутры? Вось так: ААААААААААААА!”

“Цішэй-цішэй, чаго ты так разявілася?! Твой крык адпудзіць і сланоў, і мінакоў! Мы павінны дзейнічаць так, каб наш пратэст быў ментальна экалагічны!”

“Але гэта супярэчыць самой сутнасці пратэсту!”

“Пратэст змяняецца! Наша грамадства не гатовае больш прымаць рэзкую нязгоду. Супраціўленне павінна быць мяккае, далікатнае, асэнсаванае і прасветленае!”

“А я прапаную байкатаваць усё, звязанае са сланамі. Вось, напрыклад, ідзе ў кінатэатры фільм «Слон» — устаём і выходзім!”

“Але фільм жа не пра гэта!”

“А гэта не важна! Важны пасыл! Мы павінны паказаць, што ў нас са сланамі няма нічога агульнага!

Ці вось бачым, напрыклад, у музеі карціну са сланамі — абліваем фарбай!”

“Ды як ты яе цяпер абальеш, калі сланы стаяць ва ўсіх залах?”

“Сапраўды...”

“Я ведаю: нам трэба адмовіцца ад фігурак сланоў у шахматах!”

“О, гэта выдатная ідэя!”

“А як мы будзем гуляць?!”

“Цяпер не час для гульняў — мы павінныя засяродзіцца на барацьбе!”

“Але экалагічнай!”

Размовы інтэлігентаў, якія лічылі сябе рухавіком культурнага супраціву, асаблівай надзеі не давалі. Слухаючы іх, Павел ведаў, якператварыць іх дыялогі ў жарты, але не разумеў, як усе гэтыя ідэі маглі б паспрыяць вызваленню горада. Хіба што (*просьба, паўтарэнне просьбаў у надзеі на літасць і дараванне ўсяго неабходнага, 2 па вертыкалі, 7 літар*)?

У такія моманты, расстройваючыся ад пустой балбатні, ён выходзіў на двор і, закурыўшы, разглядаў сланоў, што нерухома стаялі паміж барам, у якім іх жвава абмяркоўвалі, і ўніверсітэтам, дзе ён выкладаў на філасофскім факультэце і часам расказваў сваім студэнтам, што сланы вельмі разумныя.

*А мне заўсёды цікава ўяўляць тое, чаго ў кнізе няма. Тое, што застаецца за межамі, так бы мовіць, на маргінэсе. Напрыклад, аўтар апісвае Паўла, які глядзіць на слана, але пра што ён думае ў гэты момант? Ты чытаеш гэтую сцэну і робішся яе саўдзельнікам. Гэта ж сапраўднае чарадзейства,*

*ці не так? Я калі чытаў гэты ўрывак, уяўляў, што Павел глядзіць на слана, прыдумвае жарты і адначасова выношвае нейкі план па вызваленні горада, але як закаханы чалавек яшчэ і зрываецца на думкі пра Ганну. Ён успамінае яе ўсмешку, пігментную плямку пад левым вокам, а потым кідае недакурак у сметніцу і вырашае патэлефанаваць: "Прывітанне! Я проста хацеў сказаць, што кожнае імгненне сумую па табе!"*
*"І я..."* **Ананім**

Не зусім так. Перад тым, як патэлефанаваць Ганне, Павел убачыў бацьку. Абсалютна п'яны, у бруднай вопратцы (мяркуючы па ўсім, па дарозе дамоў стары неаднойчы ўпаў), на другім баку вуліцы хістаўся тата. Аловак без грыфеля, бацька хапаўся то за ліхтарныя слупы, то за ногі сланоў.

Выкінуўшы цыгарэту, Павел перабег праз вуліцу і падхапіў п'янага. Напэўна, хто-небудзь на яго месцы пасаромеўся б ісці па цэнтральнай вуліцы горада пад руку з чалавекам, які выглядаў як бяздомны, але Павел рабіў гэта не раз і таму ні секунды не раздумваў. Быццам медык, які выводзіў з поля траўмаванага футбаліста, Павел цягнуў дадому згаслага бацьку. Бадай, адзінае, чаго б ён не хацеў у той момант — каб Ганна выпадкова пабачыла, з якой ён сям'і.

*Я, дарэчы, думаю, што яго паходжанне адыграла немалую ролю ў іх расставанні. Зразумеўшы, што ён з сям'і алкаголікаў, Ганна моцна перапалохалася. Яна адразу зразумела, што раней ці пазней ён абавязкова зробіцца часткай іх жыцця.* **Арына-балерына**

*А можна, калі ласка, не спойлерыць?!* **Актывіст13**

Бацькі Паўла пачалі піць яшчэ да яго нараджэння, прапілі ўсё ягонае дзяцінства і юнацтва, прапілі ўсе яго святы і выступленні, паступленне ва ўніверсітэт і перамогу ў шахматным турніры, усе яго поспехі і няўдачы, прапілі свае лёсы і, калі захацелася дабаўкі, паспрабавалі прапіць і ягоны. Яны так шмат і так часта пілі, што часам, калі Павел вяртаўся дадому, не пазнавалі яго. Павел запомніў гэтыя сцэны на ўсё жыццё. Ён званіў у бацькоўскія дзверы, але п'яная маці ставала на парозе і не разумела, што адбываецца. Вось і цяпер бацька, якога Павел вёў пад руку, не ўсведамляў, што побач з ім ідзе сын.

Зацягнуўшы бацьку ў кватэру, Павел паклаў яго на канапу і агледзеў пакой: бутэлькі ляжалі паўзверх слановага дзярма. Маці штосьці мармытнула, але Павел зразумеў, што яна спіць і варушыць вуснамі ў сне, быццам і язык яе, вымачаны ў гарэлцы, спрабаваў як мага зручней уладкавацца і заснуць у п'яным роце. Зірнуўшы на старога слана, Павел падумаў раптам, што гэтая жывёліна была тут заўжды. Цяпер здавалася, што слон ужо стаяў, калі ў апошнім класе два вырадкі з паралелі некальскі дзён запар чакалі Паўла каля школы, каб збіваць. Аднойчы яны адвялі яго ў парк, прыставілі шыла да горла, а потым разбілі нос і зламалі сківіцу.

Цяпер здавалася, што слон ужо быў тут, калі п'яныя бацькі пачыналі біцца, калі па начах маці прыбягала ў пакой Паўла па абарону. Здавалася, слон быў, калі раніцай Павел ехаў у школу, увесь час усміхаўся, жартаваў, і яго аднакласнікі думалі,

што ў яго найлепшае ў свеце жыццё, і не заўважалі слана, якога ён прывёў.

Здавалася, слон быў побач штораніцы, калі, расплюшчыўшы вочы, Павел адчуваў трывогу. Падобная да той, што адчуваюць людзі, якія баяцца лятаць, падчас турбулентнасці, у тыя часы, калі самалёты яшчэ лёталі, яна была з ім 24/7, як велізарны слон. З гэтай жывёлай, якая заўсёды стаяла побач, ён чысціў зубы, апранаўся і, адзіны з усіх абітурыентаў, пісаў на дзясятку ўступнае сачыненне на філасофскі факультэт. Здавалася, слон заўжды быў побач! Калі ён баяўся вышыні і калі кожнае імгненне думаў, што машына вось-вось патрапіць у аварыю.

Слон быў заўжды. Калі Павел гаварыў, выпіваў, танчыў, чытаў ці выступаў на сцэне. Слон ужо быў, калі ён закахаўся ў Ганну і з першых дзён баяўся, што яна заўважыць яго велізарную непрыгожую жывёліну і сыдзе.

“Слон быў заўжды”, — падумаў Павел і, у тысячны раз прыбраўшыся ў бацькоўскім доме, цяжка ўздыхнуў, выйшаў на вуліцу і толькі пасля гэтага патэлефанаваў любай, каб сказаць, што моцна сумуе.

“І я”, — адказала Ганна.

*Я вось не разумею, чаму ў гэтага аўтара ў кожнай кнізе бацькі галоўнага героя алкаголікі? Колькі можна?! Няўжо нельга прыдумаць штосьці новае? Ну хаця б ужо наркаманамі іх зрабіў для разнастайнасці, а то ўсё п’юць і п’юць, п’юць і п’юць, п’юць і п’юць!* **Арына-балерына**

*Можа, таму, што яны ўсё п'юць і п'юць, п'юць і п'юць, п'юць і п'юць?* **Ананім**

*Не! Таму што гэта боль, які не адпускае яго! Вы ўяўляеце, што гэта такое, калі вы прыходзіце дадому, а бацькі не пазнаюць вас, бо п'яныя? Ці было ў вас так, каб у вас дома пачынаў жыць яшчэ адзін мужчына — сабутэльнік бацькоў, і ён праводзіў у вашым доме так шмат гадоў, што аднойчы, у нейкай бытавой размове, вы памылкова назвалі яго "Тата"?* **Топавы прыхільнік**

*Усе мы маем нейкую траўму з дзяцінства. Не трэба думаць, што ваша ці аўтарава траўма большыя за тыя, што перажылі іншыя людзі. Не бывае людзей без гора і жудасных успамінаў. Усе мы пакалечаныя часам, нашымі равеснікамі і бацькамі. Кожны з нас можа паказаць сваё ўласнае пекла, але гэта не нагода пісаць пра яго з кнігі ў кнігу! Дастаткова аднаго разу!* **Арына-балерына**

*Мы наогул не п'ём.* **Бацькі Паўла**

ЗУСІМ САКРЭТНА

Міністру ўнутраных спраў

Дакладная запіска аб значным скачку міграцыі

За апошнія тыдні зафіксаваныя масавыя спробы грамадзян пакінуць горад. Колькасць ахвочых набліжаецца да 12%. Выезд ускладняецца тым, што ўсе галоўныя магістралі, а таксама аэрапорт заблакаваныя сланамі. Грамадзяне (пераважна навукоўцы, журналісты, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі) маюць сумневы ў здольнасці дзяржавы забяспечыць бяспечныя ўмовы для пражывання. У прыватных размовах многія заяўляюць, што баяцца дэфіцыту прадуктаў, пітной вады і медыкаментаў. Акрамя таго, гараджане, якія спрабуюць выехаць, адчуваюць пагрозу з боку сланоў.

Для службовага карыстання

Эскалацыя страху. Заніжаныя параметры маралі і адмоўны рост абурэння. Старое/новае вынаходніцтва грамадства — компас сумлення на скарыстаных батарэйках. Павел падымаў галаву і бачыў, як, лунаючы ў небе, нябачныя беспілотнікі атакавалі горад разгубленасцю. Сланоў не праганялі. Мінаў тыдзень, другі, аднак замест планаў па вызваленні сталіцы большасць грамадзян усё часцей абмяркоўвала быт жывёл:

“Як зрабіць іх умовы камфортнымі?”

“Колькі ім трэба вады?”

“Ці ядуць яны яблыкі і дыні?”

Улада маўчання. Сланы працягвалі стаяць пасярод гасцёўняў і лесвічных пралётаў, завулкаў і гандлёвых цэнтраў, аднак здавалася, што гэтая неверагодная карціна больш нікога не ўражвала. Большасць гараджан паводзіла сябе так, быццам сланы былі тут заўжды. Пра сваіх лічылі за лепшае маўчаць, чужымі не цікавіліся. Нават пра тых, велічных, што ўзвышаліся на плошчах, стадыёнах ці сцэнах тэатраў, больш не згадвалі. А сэнс? Калі яшчэ і знаходзіліся рэдкія выскачкі кшталту Паўла, якія ўсё яшчэ хацелі гаварыць пра тое, што адбываецца, — грамадзян такіх, хоць і не лічылі вар’ятамі, але ўсё часцей унікалі — пераважная большасць моўчкі падпісвалася пад тым, што госці тут усур’ёз і надоўга.

*Я таксама вельмі добра памятаю гэты момант. Дыскусіі здзьмуліся літаральна за некалькі першых тыдняў. Спачатку ўсе мы штосьці яшчэ актыўна абмяркоўвалі, спрачаліся (як апісана ў сцэне ў бары), нейкі час мы яшчэ*

*верылі ў тое, што на сітуацыю можна паўплываць, а потым, як мне цяпер прыгадваецца, усе быццам згаварыліся — згаварыліся нічога не рабіць...* **Ананім**

“Ты ўяўляеш, мілая, я сёння калі жартаваў пра нашага клубнага слана, ніхто не смяяўся!”

“Можа быць, проста жарты былі не вельмі смешныя?”

“Не-не, справа не ў гэтым! У адзін момант мне проста падалося, што гледачы яго больш не заўважаюць!”

“Як гэта?!”

“А вось так! Я кажу на пачатку выступу: пляскайце ў далоні тыя, хто бачыць за маёй спінай велізарнага слана, а ў залі цішыня — ніхто не пляскае!”

“Прост зусім ніхто?!”

“Ніхто!”

*Праз такіх вось комікаў усё і адбылося! Навошта трэба было выдурняцца? Ну стаялі сабе сланы і стаялі, чаму раптам трэба было жартаваць толькі пра іх?! Быццам бы ў сувязі з прыходам сланоў адваліліся іншыя тэмы?* **Адданы чытач**

*Ну, здаецца, ён і не кажа тут, што жартаваць трэба толькі пра іх. Ён засмучаны, што сланоў раптам перасталі заўважаць, што, наадварот, жартавалі пра што заўгодна, але толькі не пра самае відавочнае...* **Ананім**

*Асабіста мне сланы ніколі не перашкаджалі. Я хадзіла і на стэндап-камедыю, і на балет, і ў тэатр. Я ад самага пачатку ведала, што сланы аднойчы пойдуць, і таму не разумела, навошта патрэбныя ўсе гэтыя недаўгавечныя абмеркаванні жывёл, калі зразумела, што ёсць вечныя тэмы кахання і здрады, жыцця і смерці, бацькоў і дзяцей. Я бачыла такія цудоўныя спектаклі, у якіх акцёры так ігралі, так*

*іگралі, што пра слана, які стаяў пасярод сцэны, гледачы забываліся ўжо праз імгненне!* **Арына-балерына**

*У балет, а не на балет!* **Моль**

*Я наогул не разумею людзей, якія адрываюцца ад сваёй працы. Табе дзяржава раптам дае столькі грошай на кіно пра сланоў і са сланамі! Дык здымай, чаго бузіць?!* **Кінапрадзюсар**

*Мне падаецца, што гэты дыялог важны вось у якім рэчышчы: аўтар ставіць перад намі відавочную праблему — ці павінна мастацтва, тэатр, камедыя хоць штосьці, апрача таго, каб быць чыстым мастацтвам? Ці павінна і ці можа яно супраціўляцца? Ці павінна заклікаць людзей выходзіць на вуліцы і праганяць сланоў? Ці павінна хаця б гаварыць пра паўсядзённасць? Мастацтва для жыцця ці жыццё для мастацтва? Асабіста я, як і Павел, цвёрда перакананы, што немагчыма абстрагавацца ад паўсядзённасці. Немагчыма заплюшчваць вочы на тое, што адбываецца. Нельга проста іграць усе гэтыя вялікія п’есы ці жартаваць пра былую, якая сышла да былога, калі ў гэты ж час на суседняй вуліцы сланы топчуць людзей! Тэатр, кіно, літаратура — усе віды мастацтва павінны гаварыць, павінны крычаць пра гэта!* **Ананім**

*Вы блытаеце мастацтва і культуру! Мастацтва нікому нічога не павінна! Мастацтва самакаштоўнае! Яно не пакліканае засяроджвацца ні на чым, апрача самога сябе. Ну стаяць сланы ў горадзе, і што з гэтага? Сыдуць сланы, прыйдуць ваўкі, прыйдуць ільвы, што, цяпер перастаць іграць тое вялікае, што мы здолелі стварыць за стагоддзі? Вялікае застаецца вялікім, незалежна, запоўняць залы кансерваторый сланы ці фашысты. Галоўнае, што мы застаёмся людзьмі! Мастацтва не павінна вас выхоўваць, не павінна прывучаць да чагосьці добрага, не павінна ўзрошчваць у вас мараль! Мастацтва наогул нічога нікому не павінна! І потым, калі чалавек хоча чагосьці не заўважаць ці маўчаць — ён мае на гэта поўнае*

*права! У гэтым і ёсць фундаментальная свабода, якую вы ўсе тут так адстойваеце! Мы не маем права нікога за гэтае маўчанне ці незаўважанне сланоў асуджаць!* **Самы рацыянальны чалавек**

Адаптаваліся сапраўды імкліва. З трывогай Павел назіраў, як умела падладжваліся не толькі тэатральныя дзеячы і беспрынцыповыя кінапрадзюсары-маўчуны, якія ставілі оперы і здымалі фільмы на фоне жывёл, але і комікі, якія выступалі разам з ім. Некалькі дзён запар ён прыходзіў у свой клуб, спадзеючыся пачуць вострыя жарты пра няпрошаных гасцей, аднак кожны раз сыходзіў расчараваны. Пра біўні і хобаты больш не жартавалі. Пра ўласную бяздзейнасць таксама. Наадварот, калісьці любімыя сябры высмейвалі цяпер толькі яго і толькі тых, хто прапаноўваў прагнаць сланоў. Кпілі не з баязліўцаў, але з такіх, як ён. Смеючыся з уласных досціпаў, дасведчаныя комікі джалілі людзей, якія, на іх думку, не разумелі, што велізарных жывёл ужо не прыбраць. Трэба зарабляць — навошта важдацца?

Слухаючы калег, якія зрабіліся ў адно імгненне бяззубымі, Павел думаў, што над сцэнай цяпер варта было б развесіць чырвоныя транспаранты з заклікамі “Падладжвацца і асімілявацца!”, “Прылаўчацца і прыстасоўвацца!”, “Прывыкаць і звыкацца!”.

“Ладна, — думаў Павел, — калі не будзеце жартаваць вы — буду жартаваць я!” — і штораз, выходзячы на сцэну, гаварыў толькі пра сланоў і пра гараджан, якія іх не заўважаюць. Павел апісваў агульнае маўчанне і наступствы, да якіх яно можа прывесці,

бяздзейнасць і кошт, які давядзецца заплаціць. Нягледзячы на жаданне большасці слухачоў абстрагавацца, выступы Паўла былі заўважаныя праваахоўнымі органамі. Хтосьці расказаў, паведаміў, данёс — і Павел атрымаў некалькі штрафаў за тое, што нібыта выкарыстоўваў ненарматыўную лексіку ў сваіх маналогах. Апрача гэтага, яго два разы выклікалі на гутарку з нейкім нудным паліцэйскім, які сурова загадаў асцярожней жартаваць пра сланоў:

— Чаму? — пытаўся Павел.

— Таму што сітуацыя складаная! — адказваў паліцэйскі і папярэджваў, што штрафаў больш не будзе.

Услед за гэтым здарылася зусім ужо дзіўнае: пэўны час таму Павел пачаў атрымліваць пагрозы. Спачатку ён падумаў, што гэта штосьці несур'ёзнае, нечы дурны жарт, аднак іх упарадкаванасць і дакладнасць не пакідалі прасторы для сумневаў: зусім хутка зрабілася зразумела, што запалохванне добра зрэжысаванае і да яго трэба ставіцца сур'ёзна.

“Малайчына, што выйшаў з бара, азірайся!”

Першай думкай было расказаць Ганне, аднак Павел тут жа зразумеў, што гэта можа напалохаць яе, і не стаў. У гэты момант ён зрабіў памылку закаханага. Увесь час хвалюючыся не за сябе, але за любую, Павел пачаў часцей пісаць Ганне, што яна, на жаль, прыняла за кантроль. План тых, хто ўсчаў ціск, пачаў павольна спрацоўваць...

Павел звярнуўся ў паліцыю, прадэманстраваў дзясятак скрыншотаў паведамленняў, якія атрым-

ліваў па некалькі разоў у дзень, але ўсё той жа нудны паліцэйскі заявіў, што нічога асаблівага ў іх няма:

— Гэтага дабра цяпер ва ўсіх хапае! Да таго ж, вы вядомая асоба!

— І што мне з гэтым рабіць?

— Не звяртайце ўвагі!

Павел стараўся, але дзень пры дні пагрозы рабілі роўна тое, на што былі разлічаныя...

Ва ўнісон бяззубым комікам па новых правілах пачалі спяваць спартсмены і іх трэнеры. Футбалісты і хакеісты гулялі цяпер, не заўважаючы сланоў, якія стаялі пасярод пляцовак, бадмінтаністы перавучвалі тэнісістаў біць праз высокіх жывёл. Прыстасоўваліся фехтавальшчыкі, якія вучыліся біцца пад брухам сланоў, і шахматысты паводле закліку інтэлектуалаў пераасэнсоўвалі ролю "афіцэраў". У тыя першыя месяцы рэдкія журналісты падчас прэс-канферэнцый яшчэ задаваліся лагічнымі пытаннямі "Ці не перашкаджаюць сланы бегаць, скакаць і забіваць галы?", аднак на такія пстрычкі вядомыя спартсмены завучана адказвалі, што лічаць за лепшае заставацца "па-за тэрыялогіяй".

Да сланоў прызвычайваліся. Кіроўцы аўтобусаў спрытна манеўравалі паміж жывёламі, а супрацоўнікі музеяў вучыліся апісваць карціны, заслоненыя сланамі. Да жывёл прыстасоўваліся дворнікі, чый працоўны дзень рабіўся куды больш складаны, і выкладчыкі псіхалогіі, якія тлумачылі, што часам слон — гэта проста слон. Здавалася, цяжэй за іншых мусіла даводзіцца транспартнікам — жывёлы

стаялі пасярод вакзалаў, партоў і ўзлётных палос, аднак і капітаны ўсіх масцей надзіва хутка адмовіліся ад пуцей, мораў і нябёсаў.

“Нейкі час давядзецца пабыць дома”.

“Але колькі?”

“Ды доўга гэта дакладна не працягнецца!”

Нягледзячы на ўсеагульную міграцыю ў бок маўклівай капітуляцыі, у тыя першыя пасля нашэсця месяцы Павел верыў, што праблему сланоў атрымаецца вырашыць. Ізгой. Ігнаруючы папярэджанні паліцыі і няспынныя пагрозы, цвёрда перакананы, што адбываецца нешта абсалютна недапушчальнае, што з кожным днём сітуацыя будзе пагаршацца і аднойчы людзі прачнуцца ў горадзе, дзе зяляніна будзе з’едзеная, рэкі атручаныя і многія будынкі разбураныя, Павел жартаваў — і жартамі сваімі заклікаў не заплюшчваць вачэй на праблему. Усё гэтак жа манатонна і паслядоўна ён выходзіў на сцэну і спрабаваў гаварыць пра ўсеагульную бяздзейнасць і страх:

— Паапладзіруйце тыя, хто сёння бачыць тут слана? (Цішыня) Зразумела... Справа не ў тым, што мы сляпыя — справа ў тым, што мы абіраем быць сляпымі. (Цішыня).

Наогул, напэўна, гэта нармальна, што мы не заўважаем відавочнага... Мы ж усю гісторыю нічога не заўважалі — нават (*аптычная прылада з дзвюх паралельна злучаных падзорных труб для разглядвання аддаленых прадметаў, 14 па вертыкалі, 7 літар*) не дапамагаў: крыжовыя паходы, інквізіцыі, рабства... Нашы прадзеды газавых камер не заўважылі,

што ўжо ад нас чакаць, так?! Атамных бамбардзіровак гарадоў... Мы ўсё жыццё заплюшчваем вочы, бо баімся сапсаваць зрок... (Цішыня, а потым выкрык з залы: "Слухай, гэта ж клуб камедыі — ты пачнеш ужо жартаваць сёння ці не?")

— Не, не пачну! Я толькі скажу вам на развітанне, што канцэнтрацыйны лагер у самай вялікай краіне свету таксама называўся "СЛОН"!

Выступіўшы ў цішыні, Павел сыходзіў за кулісы, але рук не апускаў. Наадварот, адну за адной ён прыдумваў петыцыі ва ўніверсітэце і (пакуль гэта яшчэ было магчыма) публікаваў адкрытыя лісты. Павел арганізоўваў дыскусійныя клубы і запрашаў вядомых калег-навукоўцаў, якія, паводле яго задумы, павінны былі расплюшчыць вочы гараджанам. Дарма. Павел са здзіўленнем канстатаваў, што, нават нягледзячы на чуткі пра першыя смерці, людзі працягвалі ўспрымаць сланоў, што стаялі паўсюль, як нешта абсалютна нармальнае. Колькасць сяброў і знаёмых, якія больш не хацелі марнаваць час на рашэнне раптоўнага пытання, расла. Ужо ў красавіку ў цэнтры горада было зафіксавана адразу некалькі сур'ёзных сутычак: прыхільнікі новай нармальнасці атакавалі тых, хто ўсё яшчэ наважваўся казаць, што сланам тут не месца. У тых сутычках атрымаў і Павел — узбураны кіроўца аўтобуса кінуўся на яго. Павел перакрыў дарогу, імкнучыся звярнуць увагу на праблему сланоў, аднак ідэя гэтая нікому асабліва не спадабалася. Выскачыўшы з аўтобуса, кіроўца вырваў кардонны плакат і некалькі разоў ударыў Паўла па твары.

Калі на месца сутычкі прыбылі ахоўнікі правапарадку, затрыманы быў зусім не хуліган, а Павел. Ужо ва ўчастку, афармляючы пратакол, паліцэйскі працягнуў яму папяровы ручнік і раздражнена запытаўся:

“Ну што, дагуляўся?!”

“Па-вашаму, можна збіваць чалавека толькі за пікет?”

“А навошта ты дарогу перакрыў? Людзі працуюць, кормяць сем’і, спяшаюцца на працу, а такія, як ты, сядаюць пасярод праезнай часткі і перашкаджаюць простаму люду!”

“А тое, што сланы перакрываюць дарогу, вам нармальна?!”

“Ну сланы ж не разумеюць, што яны робяць, а ты ж разумны!”

*Я, дарэчы, цалкам згодны з паліцэйскім! Па-першае, у тыя дні ніхто не скардзіўся на сланоў, а па-другое, усе гэтыя праблемы былі толькі ад актывістаў. Мой слон, напрыклад, быў абсалютна нармальным і ніякіх цяжкасцяў нам не ствараў. Тое, што дзесьці здараліся няшчасныя выпадкі — ну дык паўсюль бываюць няшчасныя выпадкі!* **Кінапрадзюсар**

Меркавалася, што Павел правядзе ва ўчастку як мінімум ноч, аднак тата Ганны падарыў ахоўнікам правапарадку некалькі падпісаных кніг і быў настолькі велікадушны, што нават пагадзіўся сфатаграфавацца. Кніг Аляксандра паліцэйскія ніколі не чыталі, аднак часта бачылі яго, калі ён выступаў на палітычных шоу і казаў штосьці не зусім зразумелае, але ўпэўненае і, здаецца, разумнае.

Усю дарогу дамоў у машыне, пакуль Аляксандр моўчкі насалоджваўся манеўраваннем паміж сланамі і сілай уласнага аўтарытэту, узбуджаны і стомлены ад пагрозаў Павел спрачаўся з Ганнай, якая, здавалася, была раззлаваная яго паводзінамі:

“Навошта ты пастаянна ўсіх правакуеш?”

“У якім гэта сэнсе, мілая?!”

“Якая карысць ад тваёй гэтай акцыі, калі ты толькі і зрабіў, што напалохаў мяне!”

“Я не хацеў палохаць цябе, любая, проста...”

“Проста калі б не бацька — ты б правёў у гэтым клапоўніку ўсю ноч!”

“Ну і нічога...”

“Чаго ты хочаш дабіцца?”

“Вярнуць сланоў у іх дом...”

“Дык мы нават не ведаем, адкуль яны!”

“І ведаць не хочам!”

“Мне падаецца, мы робім мудра. Пакуль нічога не ясна, мы адаптуемся, вучымся карміць сланоў, вучымся прыбіраць за імі і вучымся быць побач...”

“Аня! Усё гэта скончыцца катастрофай!”

“Не выдумляй!”

“Мы трацім так шмат высілкаў, каб адаптавацца да гэтай рэальнасці, замест таго каб проста разабрацца з ёй!”

“Ты так гаворыш, быццам хтосьці з нас не хоча ці не спрабаваў!”

“А ты спрабавала?!”

“Наогул, не табе мне казаць, што спрабаваць, а што не! Думаеш, ты ў нас адзіны такі змагар, які бачыць праблему?! Думаеш, што сумленныя толькі

тыя людзі, якія працягваюць увесь час крычаць?! Вось сёння ты ўсеўся пасярод дарогі, хаця мог бы патэлефанаваць і запытацца, як я, як мой настрой, як мая галава! І што? Нешта ад гэтага змянілася? Сланы зніклі? Ці не лепш было б для нашых стасункаў сёння пабыць са мной, а не са сваімі сланамі?!”

“Я лічу, што для нашых стасункаў было б лепш, калі б я заставаўся тым чалавекам, якога ты пакахала!”

“Я пакахала вясёлага хлопца, які шмат жартаваў і гаварыў са мной гадзінамі, а не знікаў, займаючыся праблемамі, якія яго нават не датычаць!”

“А якія праблемы мяне датычаць?”

“Ну, напрыклад, твая праца! Ты так і збіраешся ўсё жыццё быць комікам і за капейкі чытаць лекцыі па філасофіі? Ты ўвесь час абяцаеш, што мы будзем жыць разам, але дзе? У тваёй мансардзе, усю прастору якой займае слон?! Ведаеш, Пашачка, абяцанкі-цацанкі не спрыяюць стасункам...”

“Ну прабач, у мяне няма багатага бацькі, які б дарыў мне вілы і кожны дзень выдаваў грошы на абед!”

“Што ты сказаў?!”

Выбітны пісьменнік, Аляксандр зразумеў, што гэтая (*асобная частка акта п’есы, спектакля, 29 па гарызанталі, 5 літар*) падыходзіць да канца, і таму зараз жа прыстроіўся да ходніка, каб Павел хутчэй адчыніў дзверцы і выйшаў з машыны.

Так і адбылося. Малады чалавек не стаў выбачацца і цалаваць Ганну, не падзякаваў за дапамогу ў вызваленні (пра якое не прасіў) і развітаўся.

Па дарозе дадому Павел злаваўся на сябе і на любую. Ён вінаваціў сябе за тое, што не стрымаўся і нагрубіў, але ў той жа час злаваўся і на Ганну, чалавека, ад якога чакаў калі не падтрымкі, то ўжо дакладна не асуджэння.

“Калі б яна наогул ведала, што ўсе гэтыя дні адбываецца!”

“Азірайся, калі выходзіш з машыны!” — у той жа момант прыйшла чарговая пагроза.

“Сямейка канфармістаў, — закіпаючы, працягваў разганяцца Павел, — вядома, чаму Ганна магла навучыцца, калі яе бацькі — адэпты тэорыі малых спраў! Ветэраны адступленняў, яны заўсёды ўмелі дамаўляцца з самімі сабой, абіраючы асабісты камфорт, а не грамадскія змены. Пераўтварэнні, на іх думку, адбываюцца паступова, а жыццё пралятае імгненна, і значыць, няма ніякага сэнсу траціць яго на ўсялякага кшталту супраціў. Страусы!”

Супакоіўшыся і пашкадаваўшы пра свае словы, Павел патэлефанаваў любай, каб выбачыцца, але Ганна не ўзяла трубку, бо размаўляла з кінапрадзюсарам. Павел даслаў некалькі паведамленняў, і толькі на апошняе Ганна адказала, што ён можа зайсці на сняданак і папрасіць ва ўсіх прабачэння. Павел сапраўды прыйшоў, аднак замест выбачэнняў прагучала пытанне, пра якое вы ўжо ведаеце...

ЗУСІМ САКРЭТНА

Міністру ўнутраных спраў

Аналітычная запіска
аб росце бытавых канфліктаў

У сувязі з прыбыццём сланоў фіксуецца значны рост бытавых канфліктаў. Узмацняецца напружанасць паміж жыхарамі цэнтральных і перыферыйных раёнаў горада. За месяц зафіксавана 458 выпадкаў бытавога гвалту, што на 25% вышэй за сярэдні паказчык. 67% затрыманых прызналі, што прычына агрэсіі звязаная з агульным пагаршэннем умоў жыцця з-за з’яўлення ў сталіцы жывёл.

Для службовага карыстання

Калі стары падлогавы гадзіннік б’е дзевяць, а кава запаўняе філіжанкі, Аляксандр пачынае расказваць пра невялікі гарадок, у якім жыве шчаслівая сям’я. Ён сцісла пераказвае гісторыю маладога ветэрана і трагедыю, якая здараецца падчас прабежкі. Аляксандр расказвае пра старога, які збівае жанчыну і дзіця на пешаходным пераходзе, зачытвае развітальную прамову на фоне трун і апісвае доўгае падарожжа па краіне, падчас якога, выступаючы з палымянымі прамовамі пра шкоду пажылых людзей, галоўны герой згуртоўвае партыю малойчыкаў, у рэшце рэшт прыходзіць да ўлады і пачынае ажыццяўляць свой пачварны план. Аляксандр адказвае на некалькі пытанняў жонкі і гаворыць назву будучага рамана, аднак Павел, які прыйшоў на сняданак, перапыняе яго:

— А чаму б вам усё ж не напісаць пра вашага слана?!

Пытанне гэтае чапляе Ганну і Аляксандра. Замест таго, каб выбачыцца за дзёрзкасць, якая прагучала ўвечары ў машыне, замест таго, каб падзякаваць бацьку за дапамогу ў вызваленні, Павел раптам вырашае працягнуць учарашнюю спрэчку.

“Ну што за характар?” — думае Ганна.

Аляксандр не ведае, што сказаць. Гэта зразумела ўсім за сталом, дык навошта пытаць? Дзе ж тут выхаванне? Дзе тактоўнасць? Аня, ты ж казала, што ў цябе нарэшце з’явіўся выхаваны малады чалавек!

Так, Аляксандр разумее, што ў горадзе адбываецца нешта дзіўнае, так, ён прызнае, што калі паспрабуе быць аб'ектыўным і сумленным — давядзецца канстатаваць, што дзяржава бяздзейнічае, а людзі ўсе як адзін робяць выгляд, быццам нічога не адбываецца, але што з таго?! Калі хтосьці і павінен праганяць сланоў, то ўжо дакладна не ён! На гэта няма сіл ні ў яго, ні ў ягонай жонкі, ні ўжо тым больш у іх распешчанай дачкі. І ўвогуле, надыходзіць вясна, і ўсім ім, як ужо павялося, трэба тэрмінова будаваць планы на лета...

Павісае няёмкая паўза. Не занадта доўгая, аднак дастатковая для таго, каб расказаць, што ўжо шмат гадоў у прыватных і шчырых размовах з люстэркам Аляксандр прызнаецца сабе, што далёка не рэвалюцыянер, што яго смеласць абмяжоўваецца тэкстамі.

"У рэшце рэшт, я ўсяго толькі пісьменнік, а не палітык!"

Аляксандр сапраўды ўмее быць рэзкім на старонках сваіх раманаў, нярэдка ўкладае вострыя выказванні ў вусны персанажаў, якіх, зрэшты, тут жа робіць неадназначнымі. На гэтым яго барацьба заканчваецца.

Аляксандр самаўлюбёны і баязлівы. Ён надзвычай любіць камфорт і кожны свой дзень жадае пражываць у лагодзе і спакоі — стаўленне да жыцця, якое ён перадае і дачцэ. Цяжкасці павінны заставацца на старонках кніг, а ў астатнім сям'я любіць хюге. Вось ужо шмат гадоў, распешчаны дзяржаўнымі крытыкамі, Аляксандр марыць толькі пра

новыя прэміі, вялікія пастаноўкі і шматгадзінныя інтэрв'ю, падчас якіх, адказваючы на загадзя абгавораныя пытанні, можа дэманстраваць уласную эрудыцыю і дасціпнасць. Часы змагання і тэкстаў, у якіх прыгажосць мовы саступала месца бунту, даўно мінулі. Калі хтосьці і прыгадвае, што даўным-даўно, у сваіх першых творах, ён бясстрашна крытыкаваў уладу, успаміны гэтыя Аляксандра хутчэй нервуюць, а яго жонку і дачку палохаюць. Аляксандр гатовы крытыкаваць урад роўна настолькі, наколькі гэта прыстойна для дзеячаў мастацтва, якія атрымліваюць ад улады ордэны. Яго літаратурная і грамадзянская смеласць заканчваюцца там, дзе гарантуюцца ўзнагароды, а не гнеў з боку ўладных людзей.

"Усялякай бясстрашнасці жыццёва неабходная самацэнзура!" — любіць паўтараць ён. На выпадак цкавання ў яго даўно прызапашаныя агульныя і ўніклівыя фразы адносна таго, што сучасны раман — далёка не заклік, але ўсяго толькі пляцоўка для дыскусій.

— Пра якога слана? — нарэшце пытаецца пісьменнік.

— Пра гэтага! — здзівіўшыся ўласнай смеласці, паказаўшы пальцам на жывёліну, адказвае Павел.

— Ты зноў? — успыхвае Ганна.

— Ну, а чаму б і не?!

Павел устае з-за стала, робіць некалькі імклівых крокаў у бок жывёлы і што моцы б'е яе ў бок.

— Вось слон! Вось! Вось! Вось! Я збіраюся пра яго жартаваць, а вы?

Удары Паўла, вядома, не могуць нашкодзіць велізарнай жывёліне, аднак слон раптам палохаецца (магчыма, паласатай жоўта-чорнай майкі коміка) і торгаецца. Аляксандр ускоквае з-за стала, Сафія ўздрыгвае, Ганна затуляе твар рукамі. Патрывожаная жывёла пачынае рэзка матляць агромністай галавой і, быццам крыламі, узмахнуўшы вушамі, хапае Паўла хобатам. Ганна і Сафія крычаць. Слон падымае Паўла і шпурляе на падлогу. Ударыўшыся патыліцай, малады чалавек адчувае востры боль, аднак падымаецца на ногі. Жывёла яшчэ раз задзірае хобат, каб паўтарыць кідок, аднак у гэты момант паміж сланом і Паўлам раптам узнікае Памазок. Раззлаваны слон задзірае галаву і што моцы працінае біўнем шыю слугі...

*Тут многія абмяркоўваюць, хто, дзе і чаму кінуў чытаць гэтую гаўняную кніжыцу, і вось асабіста я тут! Вельмі не люблю, калі мяне трымаюць за дурня! Усадзіў у шыю і працяў наскрозь! Фу-ты, ну-ты! Больш за ўсё ненавіджу, калі ў пачатку кніг ці фільмаў з галоўным героем нічога не здараецца, а ў ахвяру прыносяць аднаго-адзінага класнага персанажа, якому суперажываеш! Маўляў, вось гэты Павел нам для чагосьці патрэбны, а з бедным Памазком, бо ў яго на раду напісана, можна і разабрацца. Карацей, вельмі мне не спадабаўся гэты танны ход, і я выкінуў гэтую макулатуру ў сметніцу!* **Топавы прыхільнік**

*У сметніцу?! Паперу?! Вы што, не сартуеце смецце?!* **Актывіст13**

*Ну вось! Сядзеў бы сабе — нічога не здарылася б! Гэтая слабая кніга, якую асабіста я ніколі б не ўзяў у распрацоўку, быццам бы крытыкуе грамадства, якое не заўважае*

*праблемы, але наогул грамадства, у адрозненне ад гэтага Паўла, проста не стварае праблем і не засоўвае палку ў мурашнік. Калі б ён паводзіў сябе спакойна ад пачатку да канца — нічога б з таго, што адбылося далей, не здарылася б!* **Кінапрадзюсар**

*Чакайце! Дык ён памёр ці не, гэты Памазок?* **Невядомы карыстальнік**

*Так... Прыехаўшы на месца, медыкі канстатавалі смерць. Зрэшты, тое, што Памазок мёртвы, зрабілася зразумела яшчэ да прыезду дактароў. Як ні крычала я, як ні махаў рукапісамі бацька, Павел некалькі секундаў спрабаваў зняць з біўня акрываўленае цела Памазка.*
*Калі гэта нарэшце атрымалася, у гасцёўні запанавала злавесная ціша, і жывёла, як нічога ніякага, вярнулася ў сваю звычайную бесклапотную позу.*
*Зразумеўшы, што слон замёр, я кінулася да Памазка. Адцягнуўшы цела бліжэй да стала, Паша пракрычаў, што трэба выклікаць хуткую. Я не дакладна цяпер памятаю, але, здаецца, ніхто не зрабіў гэтага. Мама плакала, я была зусім разгубленая, а бацька, страціўшы ўсялякую вытрымку, замест таго, каб набраць тры лічбы, гартаў запісную кніжку, у якой захоўваліся нумары найлепшых дактароў краіны...* **Ганна**

*Я таксама тут кінула чытаць, але з іншай прычыны: мне падаецца, што літаратура павінна быць лёгкай і вясёлай. У жыцці і так адбываецца шмат усяго дрэннага, таму калі я бяру ў рукі кнігу, мне хочацца ўцячы ад зла, а не занурацца ў яго яшчэ больш!* **Звычайная чытачка**

*Рана кінулі — гэта вы яшчэ далей не чыталі!* **Соня**

*А мне, наадварот, толькі ў гэты момант і зрабілася сапраўды цікава!* **Дрэсіроўшчык**

Канстатаваўшы смерць, медыкі пачынаюць перакладаць цела Памазка ў чорны пакет. Пакуль Ганна захліпаецца, а бацька сутаргава робіць нейкія пазнакі ў запісной кніжцы, Павел размаўляе з брыгадай хуткай дапамогі:

— А хіба паліцыя не павінна прыехаць сюды, каб разабрацца з усім, што адбылося?

— Вы смеяцеся? — стомлена, але без злосці адказвае санітар. — Толькі ў нас за сённяшнюю ноч ужо пяты такі. Мы не спраўляемся...

— Значыць, будзе ўведзена надзвычайнае становішча?

— Наўрад ці — хутчэй за ўсё нам аб'явяць, што гэта не больш як шэраг няшчасных выпадкаў...

Калі машына хуткай дапамогі знікае, дом апаноўвае страшная бязгучнасць. Павел спрабуе абняць Ганну, але дзяўчына адштурхоўвае яго руку і заяўляе, што хоча пабыць адна.

— Я магу праводзіць цябе дадому?

— Не, пакінь мяне!

— Мы зможам пазней паразмаўляць?

— Не ведаю! Цяпер я не хачу цябе бачыць!

Павел падпарадкоўваецца і сыходзіць. Ён ідзе па ціхіх ранішніх вуліцах горада, глядзіць на мірных сланоў і марыць толькі пра тое, каб усё тое, што адбылося, аказалася сном.

Ганна выцірае слёзы і ідзе ў бібліятэку. Быццам соты з вулля, бацька дастае з палічак кнігі. Аляксандр вельмі засяроджаны і захоплены. Ён думае, што зараз жа трэба асвяжыць у памяці тэксты пра

эстэтыку маўчання, паўзы і бязмоўнасць. Бясконцыя (*падвойны аркуш, які злучае вокладку і кніжны блок, 33 па гарызанталі, 6 літар*). У адрозненне ад жонкі і дачкі, вядомы пісьменнік, здаецца, не напалоханы, але, наадварот, вельмі натхнёны. Ганне здаецца цяпер, што на бібліятэку апускаецца абсалютная цішыня, тая нулявая адсутнасць усякага гучання, якую можна памераць толькі пры дапамозе спецыяльных інструментаў. Пераходзячы ад палічкі да палічкі, Аляксандр быццам бы не дакранаецца да падлогі, і нават стары паркет цяпер не рыпіць. Бацька быццам герой з нямога кіно. Ганне так страшна, што яна адчувае, як у жылах стыне кроў.

Між тым, працягваючы засяроджана шукаць неабходныя кнігі, Аляксандр, прыслухоўваючыся да ўласных думак, занатоўвае ў запісную кніжку словы, якія, быццам кубікі ў тэтрысе, звальваюцца на яго:

Бівень

Няшчасны выпадак

Удача

Сюжэт (!)

Хаця цяпер у гэтым сорамна прызнацца, хаця ён ніколі не скажа пра гэта ўголас ў інтэрв'ю на радыё ці на тэлебачанні, выбітны пісьменнік (*ці проста чалавек з хваравітым імкненнем ім стаць, 31 па гарызанталі, 8 літар*) разумее ў гэтае імгненне, што смерць Памазка адкрывае перад ім новыя магчымасці.

"Гэты дом маўчыць цяпер, — думае ён, — бо нараджаецца сюжэт!"

“Гэтая ашаломленасць дачкі, — перад сцяной кніг шапоча вядомы пісьменнік, — фактычная канстатацыя майго таленту!”

“Такія трагедыі, — працягвае пераконваць сябе вядомы аўтар, — не здараюцца проста так... З нашэсцем сланоў і смерцю слугі мне пасланая вялікая непрыемнасць, пра якую патаемна марыць кожны сапраўдны пісьменнік! І я вытрымаю яе, і я прайду гэты лабірынт з высока ўзнятай галавой, і я выканаю свой святы доўг літаратара — я раскажу сваім чытачам, як варта паводзіць сябе ў падобных сітуацыях. І гэта, безумоўна, будзе бестселер!”

*Непрыемнасць! У яго на вачах загінуў, лічы, сямейнік, а ён называе гэта непрыемнасцю! Божа, вось жа хворы вырадак!* **ТваяDomina2022**

*Дык усе ж письменники такия — затое сумленны!* **Невядомы карыстальнік**

*Я не веру, не веру, што ў такі момант, у момант, калі ў цябе на вачах гіне чалавек, хтосьці можа думаць толькі пра тое, каб апрапрыіраваць смерць у сюжэт!* **Арына-балерына**

*Дык а чаго перажываць, калі Памазок гэты ўжо здох? Вашы ахі ды ўздыхі яго што, уваскрэсяць? Яго ж не вярнуць! Правільна робіць Аляксандр — у пісьменніка наогул усё павінна ісці ў ход! Наогул, у гэтай сцэне мы бачым яго сапраўднае (1 па вертыкалі, 7 літар)* **Ананім**

*А чаму нікога не цікавіць, што ў гэты час робіць Павел?* **Актывіст13**

Увесь той вечар і ўсю тую ноч ён спрабуе дазваніцца Ганне. Дзяўчына не адказвае. Ёй хочацца паразмаўляць з былым. Паводзіны Паўла бянтэжаць. Ганна не разумее, як пасля ўсяго таго, што адбылося, можна падтрымліваць размову. Ёй горка. Усяго гэтага ў яе жыцці наогул не павінна адбывацца. Ганна хоча падарожнічаць, піць віно і загараць. Ёй хочацца купацца ў ледзяной вадзе Акіяна, кахацца і шмат разоў за ноч перажываць (*1 па гарызанталі, 6 літар*). Ганна хоча здымацца ў выбітных фільмах, не праходзячы кастынгу, красавацца перад фатографамі на чырвоных дарожках і, як бацька, даваць інтэрв'ю. Ганне патрэбныя лёгкасць, спакой і танга. Яна марыць жыць ва ўласным рытме, прачынацца, разгадваць крыжаванкі, павольна ісці ў душ і, пераходзячы з асабняка ў асабняк у халаце, сядаць за ўжо накрыты бацькоўскі стол. Ганна хоча ездзіць у крамы адзення, дзе прадаўцы не дакучлівыя, на машыне, якая заўсёды запраўленая. Яна не супраць часам пражываць моцныя эмоцыі, але толькі тады, калі да гэтага гатовая, у тэатры ці ў кіно, але не ў жыцці. Ганна плача цяпер, бо разумее, што, можа, і кахае Паўла, але з ім заўсёды будзе вельмі складана. Ёй трэба хтосьці больш зразумелы і просты. Былы быў норм, але шмат нюхаў. Павел жа добры і кахае яе, але з ім усё больш робіцца нудна. Да таго ж, ён вечна будзе змагацца з ветракамі, а цяпер вось і наогул апынецца ў турме.

"Смерць Памазка, — думае Ганна, — заўсёды будзе вісець над намі, і хто цяпер будзе абмахваць мяне (*20 па гарызанталі, 7 літар*) у спякотныя дні?

Напэўна, бацькам нават давядзецца памяняць дом, а ў яго ж такое добрае месцазнаходжанне...”

Ганна прызнае, што стасункі з Паўлам ёй цікавыя, што ён дарыць ёй шмат цеплыні і любові. Ганна прызнае таксама, што ніхто і ніколі так не глядзеў на яе, ніхто і ніколі так не цікавіўся ёю, ніхто і ніколі так не клапаціўся пра яе, і ўсё ж, здаецца, упершыню за год стасункаў яна думае цяпер, што іх гісторыя, здаецца, асуджаная...

*Чагосьці я не разумею, яна яго толькі што кахала, а цяпер ужо стасункі асуджаныя? Як такое бывае?! Як можна так хутка пераабуцца? Словы, атрымліваецца, нічога не значаць і патрэбныя толькі для крыжаванак?* **Топавы прыхільнік**

*Вам, мужчынам, незразумела, што калі чалавек праявіў сябе так раз, то праявіць і два, і тры. Відаць, што яна дарослая і мудрая жанчына, якая ўжо была ў аб’юзіўных стасунках і не хоча іх паўтараць. Вось гэты Паша, ён жа ныцік, ён жыць без яе не можа, а навошта ёй чалавек, які не самадастатковы? У стасунках два чалавекі павінны быць цэласнымі, і разам ім добра, і асобна, а навошта ёй мужчына, які так прыліпае да яе і не дае дыхаць? Зразумела, што яна заўсёды выбера таго, хто спраўляецца і без яе.* **Арына-балерына**

*І без кахання цудоўна спраўляецца, а так, перапіхнуцца рады, калі адпусціць...* **Ананім**

Жывёліна загароджвае алтар. Труну ставяць перад ім. Седзячы на апошняй лаўцы, Павел разглядае слана і думае цяпер, што арганізатары пахавання перабралі з пудрай. У святле прамянёў, што прабіваюцца праз вітражы, цыркавы царкоўны

слон падаецца беласнежным, што, зрэшты, дазваляе яму цудоўна спалучацца з мноствам лілей, крэмавым раялем і белым крыжам пад купалам царквы... без Хрыста.

Святар гаворыць коратка і па справе. Прамова яго карэктная і спакойная. Хаця Павел і чакае, што смерць Памазка будзе патрабаваць нейкага выгароджвання бога, нічога падобнага не адбываецца — паводле меркавання худога, як кій, святара, Гасподзь забірае сваё.

Думку гэтую ў трох альтэрацыях паўтарае, выступаючы следам, Аляксандр. Праяўляючы эталонную вытрымку, у прысутнасці ўсяго некалькіх чалавек (блізкіх людзей ці сваякоў у Памазка не было) вядомы пісьменнік гаворыць мякка, мудра і спакойна. Развітанне яго выбудаванае ідэальна, вычышчанае ад пошласці і вульгарнасці. Можна нават падумаць, што Памазок не заслугоўвае такога вывернанага некралога.

Аляксандр чытае з паперкі, горда, без надлому і труізмаў. Выбітны літаратар разумее, дзе, калі і пры якіх абставінах выступае. Узорная, добрая для публікацыі і, магчыма, патрачаная дарма на не такога ўжо і паважанага персанажа, прамова ўзлятае да купала царквы і атрымліваецца да таго добрай, што, калі заканчваецца, Сафія міжволі пачынае апладзіраваць, аднак строгая дачка спыняе яе.

Услед за Аляксандрам раптам выступае Павел. Рэзка ўстаўшы, ён перасякае царкву. У адрозненне ад бацькі Ганны, Павел куды больш эмацыйны.

Нават не спрабуючы стрымліваць пачуцці, ён бярэ з месца ў галоп:

— Чаму вы ўсе робіце выгляд, што нічога не здарылася?! Чаму вы седзіце тут і робіце выгляд, што гэта быў няшчасны выпадак? Я ж ва ўсім вінаваты! Я ж забіў Памазка! Чаго ты маўчыш, Аня?

— Кінь гэты мітынг! — спакойна кажа Аляксандр, і святар, незаўважна падышоўшы, акуратна адводзіць Паўла ўбок.

Чарговы выбрык маладога коміка не падабаецца ні бацькам, ні Ганне. Здаецца, стараючыся выправіць сітуацыю, з кожным днём Павел усё мацней закопвае сам сябе і свае стасункі з Ганнай. Ён у чарговы раз страшна палохае яе, і ўсё ж маладыя людзі знаходзяць магчымасць пагаварыць. Ужо каля магілы Памазка Павел звяртаецца да любай:

— Прымі, калі ласка, мае спачуванні...

— І ты мае...

— Я хацеў сказаць табе, што быў у паліцыі і прызнаўся, што Памазок загінуў праз мяне...

— І што яны?

— Яны сказалі, што не прымаюць аніякіх заяў, звязаных са сланамі.

— І што ты збіраешся цяпер рабіць?

— Я ўсё выпраўлю, мілая, проста дай мне час, добра?

— Я хачу пабыць адна, Паш... Я цябе вельмі прашу, не турбуй мяне...

Вечарам у той жа дзень выступае кіраўнік дзяржавы. Яшчэ толькі рыхтуючыся слухаць яго, Ганна

не сумняваецца, што менавіта смерць Памазка робіцца той чырвонай лініяй, якую перайшлі няпрошаныя госці. Памазок, мілы Памазок, згубіўшы вернага слугу, пераконвае сябе Ганна, менавіта ён аддаў сваё жыццё, каб сітуацыя нарэшце вырашылася і ўсё зрабілася як раней — спакойна і зразумела.

Звярнуўшыся да грамадзян, лідар нацыі тлумачыць, што ў краіне складаецца небяспечная сітуацыя, бо ў грамадстве пачынаюць цыркуляваць неправераныя чуткі. Так, пацвярджае кіраўнік дзяржавы, насамрэч зафіксаваная нейкая колькасць няшчасных выпадкаў, да якіх (з вялікай доляй верагоднасці) самае непасрэднае дачыненне маюць сланы, што прыйшлі ў горад, аднак справы яшчэ працягваюць разглядацца, і ўсялякія высновы паспешныя і заўчасныя. Жывёлы, запэўнівае, звяртаючыся да нацыі, лідар, застаюцца пад поўным кантролем адпаведных органаў і ні ў якім выпадку не пагражаюць бяспецы. Калі і ёсць павелічэнне фатальных выпадкаў, звязаных са сланамі, мы, тлумачыць лідар, тым не менш, павінны заставацца стрыманымі і працягвацьназіраць. Для правільнага рашэння патрэбны працяг даследаванняў, на якія сыдзе сама меней год, а быць можа, і два. Чым больш мы атрымаем лічбаў, разжоўвае кіраўнік дзяржавы, тым лягчэй будзе зрабіць наступныя крокі, аднак для таго, каб не памыліцца, усім нам трэба набрацца мужнасці і цярпення!

У другой частцы свайго выступу безаблічны, але надзелены ўладаю чалавек засяроджваецца

на выкананні міжнародных пагадненняў і канвенцый, згодна з якімі краіна бярэ на сябе абавязацельствы па абароне поўнай разнастайнасці флоры і фаўны, што выключае ўсялякі гвалт у дачыненні да сланоў, што прыйшлі ў гарады, у тым ліку і ў сталіцу. Больш за тое, акцэнтуе кіраўнік дзяржавы, вельмі строга забараняецца ўсялякі самасуд і паляванне на сланоў. Звяртаючыся да тэлегледачоў, нацыянальны лідар запэўнівае, што краіна будзе прытрымлівацца ўсіх міжнародных нормаў і ні адна жывёла не пацярпіць ні ад рук вар'ятаў, ні ад рук браканьераў, ні ад рук хуліганаў.

Напрыканцы даволі кароткага і безэмацыйнага выступу кіраўнік дзяржавы яшчэ раз супакойвае грамадзян і заклікае іх насалоджвацца жыццём побач з новымі цудоўнымі суседзямі.

Услед за маналогам лідара на грамадзян накідваюцца эксперты, аналітыкі і сланазнаўцы. Усе гэтыя аднолькавыя і бясконцыя людзі з пенай на губах пачынаюць тлумачыць, што раптоўнае з'яўленне сланоў — гэта не што іншае, як перамога цывілізаванага грамадства!

"Мы, — ва ўнісон кажуць спецыялісты і прафесіяналы, — зрабіліся самай экалагічна чыстай краінай у свеце! З'яўленне мудрых жывёл у нашых гарадах — гэта не што іншае, як прызнанне якасці нашага жыцця, нашай зеляніны, нашай вады і нашага паветра! Доўгія гады мы планамерна займаліся паляпшэннем экалогіі, сартавалі смецце, расчышчалі лясы, і вось, у якасці ўзнагароды за ўсе высілкі нашага ўрада, які ўзначальвае наш мудры

лідар, нашы вуліцы запоўнілі ўдзячныя сланы, якія адным сваім выглядам сцвярджаюць, што няма на свеце лепшага месца, чым наша краіна!”

“Мы, — працягвае тлумачыць міністр прыродных рэсурсаў, — павінны ганарыцца ўжо тым, што, адмовіўшыся ад буржуазных запытаў на камфорт, аддалі магутнай сіле прыроды сваю тэрыторыю. Доўгія гады людзі знішчалі жывёльны свет вакол сябе, і ад пэўнага часу зрабілася відавочна, што рэвалюцыя іклоў непазбежная! Як жа добра і слаўна, што мы аказаліся самым прагрэсіўным і перадавым грамадствам, якое не бярэ за аснову зручнасць і ўтульнасць, але праводзіць вялізную работу над прыняццем сапраўды важнага шляху. Сёння ўсе мы можам з гонарам казаць, што з’яўляемся адзінай краінай на кантыненце, якая ставіць інтарэсы планеты Зямля вышэй за ўласнае задавальненне. Мы мыслім не тактычна, але стратэгічна! Мы сплачваем доўг прыродзе — прыродзе, якая дала нам усё! Мы выбралі адзіна правільна шлях не тэхнічнага прагрэсу, але натуральнай эвалюцыі, у якой чалавек не ставіць сябе вышэй за іншых, але робіцца таварышам і братам”.

“Слон, — пераходзячы на крык, тлумачыць вядоўца, падхапіўшы эстафетную палачку міністра, — сімвал даўгалецця, стабільнасці і мудрасці. Тое, што сланы выбралі менавіта нас, сведчыць толькі пра тое, што мы дасягнулі ўсіх гэтых цнотаў. Мы — радзіма сланоў!”

“Так, — усё ж прагаворваюцца эксперты, — сапраўды было зафіксавана некалькі няшчасных

выпадкаў, аднак важна прызнаць, што ўсе яны адбыліся выключна праз людзей! Усё, што ад нас патрабуецца, — паводзіць сябе паважліва і спакойна. У найбліжэйшы час, — супакойваюць вядучыя, — будуць апублікаваныя памяткі, якія дапамогуць усім нам!”

“Гэта добра, — думае Сафія, гладзячы па галаве дачку, якая задрамала, — калі ёсць дакладныя ўказанні, жыць куды больш проста і зразумела. Добра б яны яшчэ распісалі рацыён, бо зусім незразумела, чым іх карміць...”

Папулізм.

Тэлевізійныя праграмы, інтэрв’ю і дэбаты зараз жа дасягаюць неабходнага выніку. Тысячы людзей выходзяць на вуліцы, каб вынесці сланам ежы і вады. Не толькі хатнім, але і тым, што цяпер стаяць у парках і ў скверах, гараджане даюць гародніну і садавіну. Сланоў акуратна мыюць, на многіх надзяваюць зробленыя спехам вянкі з жывых кветак. Стаўленне да жывёл змяняецца на вачах. Сланоў перастаюць баяцца — сланоў пачынаюць фарсіравана любіць...

## Я/МЫ СЛОН!


1 АРТАЗМ
2 маленне
3
4
5
6 ЗЛОСЦЬ
7 ПАПЯРОСНІЦА
8
9 Элефантолаг
10
11 РАЯЛЬ
12
13
14 Бінокль
15
16
17
18
19 вярблюд
20 апахала
21
22
23
24
25
26
27
28
29 СЦЭНА
30
31 ГРАФАМАН
32 ЭСЭІСТ
33 ФОРЗАЦ
34
Абліччa

ЗУСІМ САКРЭТНА

Міністру ўнутраных спраў

План мерапрыемстваў па стымуляванні грамадскай любові да сланоў

У сувязі з цяперашняй сітуацыяй і прагнозам павелічэння незадаволенасці значнай часткі грамадства, прапануецца прыняць шэраг мер для ўмацавання грамадскага ўспрымання сланоў як сімвала мудрасці. Акрамя таго, прапануецца павысіць узровень інфармаванасці грамадзян аб важнасці гэтых жывёл для прыроды і культуры, а таксама сфармаваць пазітыўнае стаўленне да сланоў.

Рэкамендуецца стварыць устойлівы пазітыўны вобраз слана (сланяняці/сланіхі) у свядомасці грамадзян, сфарміраваўшы разуменне экалагічнай і культурнай значнасці гэтых жывёл пры дапамозе адукацыйных праграм у школах, а таксама праз маштабную медыйную кампанію, якая будзе ўключаць: дакументальныя і мастацкія фільмы, тэатральныя пастаноўкі, сацыяльныя ролікі, інтэрв'ю з навукоўцамі, а таксама прыцягненне вядомых асоб (акцёраў, музыкантаў, спартсменаў) для папулярызацыі тэмы.

Акрамя таго, прапануецца выбраць адпаведную дату і заснаваць агульнанацыянальнае свята — Дзень слана.

Для службовага карыстання

Прыручэнне абсурду. Змагацца ці здацца, адаптавацца ці змяняць? Трансфармаваць ці прыстасоўвацца? Эвалюцыянаваць ці абжываць? Гэтага разлому больш няма. Пасля выступу нацыянальнага лідара ўсе кропкі над “і” расстаўленыя. План зразумелы — інтэграцыя і асваенне, прыцірка і зліццё. Стагоддзі акамадацыі даюцца ў знакі. Прымірэнне, прынякцце і асіміляцыя. Выроўніванне як працэс. Следам за кіраўніком дзяржавы грамадства выбірае падгонку як стратэгію. Узаемадзеянне — лаяльнасць — захаванне. У жаданні выратавацца чалавечая прырода бярэ сваё, і гараджане канчаткова абіраюць шлях сумяшчальнай стабільнасці. Аплата праводзіцца маўчаннем.

Павел не можа знайсці сабе месца. Ганна не піша ўсяго некалькі дзён, але ён абсалютна не спраўляецца. Ну, і дзе тваё славутае пачуццё гумару, комік? Дні без Ганны бессэнсоўныя і маркотныя. Абрыў мовы. Немата каханага чалавека падобная да блакады. Штохвіліны Паўлу хочацца патэлефанаваць і ўсё патлумачыць, напісаць ліст, але (*26 па вертыкалі, 7 літар*) не чакае. Павел вельмі сумуе без яе голасу, без паўзаў, без яе дзівосна прыгожага смеху. Павел шчыра не разумее, што адбываецца. Паўлу складана прыняць, што Ганна, самы блізкі чалавек, чалавек, які ўсе гэтыя месяцы быў побач, Ганна, з якой ён дзяліўся радасцямі і трывогамі, Ганна, з якой не баяўся быць шчырым і слабым, у гэты складаны момант раптам вырашае знікнуць і змоўкнуць. Усе гэтыя месяцы Павел быў упэўнены, што калі аднойчы

перад імі ўзнікнуць цяжкасці — яны абавязкова пройдуць іх разам, але раптам аказваецца, што не, што Ганна не хоча. Атрымліваецца, усё гэта было падманам? Аблудай? Фікцыяй? Сімуляцыяй? Значыць, не было ніякага сапраўднага кахання? Ён усё надумаў сабе ці яшчэ не час панікаваць? Аларміст? Ці проста закаханы?

Павел не хоча верыць, што такія цудоўныя стасункі, якіх ён чакаў усё жыццё, разбурыліся пры першых жа выпрабаваннях...

Узяўшы паўзу і папрасіўшы пакінуць яе ў спакоі, Ганна не выходзіць на сувязь вось ужо некалькі дзён, але Павел верыць, што ўсё яшчэ здолее выправіць...

*Ага, хіба што акрамя смерці Памазка!* **ТваяDomina2022**

*Але не ён жа вінаваты ў яго смерці?! Памазок сам стаў паміж ім і сланом!* **Ананім**

*Калі б Павел не напалохаў слана, нічога б не здарылася!* **ТваяDomina2022**

*Што значыць не лез? Сланы прыйшлі ў нашы дамы, а не мы ў іх!* **Ананім**

*Мы ведаем, што Павел ні ў чым не вінаваты! Наадварот, ён разумеў, да чаго гэта ўсё прывядзе, і спрабаваў усё спыніць. Я калі чытала, не магла паверыць, што ў такі момант Ганна не працягвае руку любаму, а пакідае яго!* **Топавы прыхільнік**

*Слухайце, а чаго вы ад яе чакалі? Я добра ведаю гэтую сям’ю. Мы шмат гадоў арандавалі вілу паблізу і нават былі ў іх у гасцях. Гэтая Ганна — самая распешчаная*

*дзяўчынка, якую я калі-небудзь бачыла. Яна не працавала аніводнага дня ў сваім жыцці. Жыла на грошы бацькоў. Усе фільмы, у якіх яна знялася, здарыліся ў яе жыцці толькі таму, што бацька ўладкаваў яе ў іх. Яна нават на кастынгі не хадзіла! Цэлымі днямі ляжала на канапе, разгадвала крыжаванкі і расказвала, што ёй баліць галава. Гэты Павел проста ўсё выдумаў. Нічога з таго, што ён бачыў у ёй, не было! Гэтая кніга не пра сланоў, не пра супрацоў — гэтая кніга пра тое, якім сляпым бывае закаханы чалавек!* **Невядомы карыстальнік**

На радыёстанцыях пачынаюць гучаць не толькі забытыя, але і запісаныя літаральна за ноч новыя песні пра сланоў. Жывёлы з'яўляюцца ў сетках вяшчання ўсіх тэлеканалаў і ў рэпертуарах тэатраў, у кінаафішах і ў падкастах. Сланоў афіцыйна прымаюць, сланы нарэшце заўважаныя. Пасунься, (*28 па вертыкалі, 6 літар*)!

Пры дапамозе ўсіх магчымых інструментаў дзяржава тлумачыць сваім грамадзянам, што няпрошаных гасцей цяпер трэба паважаць і шанаваць: паэты кідаюцца складаць вершы, універсітэты — абмяркоўваць адкрыццё новых кафедраў, а ўсе музейшчыкі горада спускаюцца ў сховішча, каб адшукаць штосьці хаця б аддалена звязанае са сланамі (і гэта нягледзячы на тое, што сланы нерухома стаяць у кожнай зале).

*Ці не адбудзецца перадазіроўка сланамі?* **Ананім**

Праз тыдзень у дзверы бацькоўскага дома грукаюць. Сям'я рыхтуецца снедаць, і замест Памазка нечаканым гасцям адчыняе дзверы Ганна,

якая прыйшла наведаць бацькоў. Яна баіцца, што на парозе будзе Павел, з якім давядзецца размаўляць, але, на радасць Ганне, на ганку стаяць некалькі незнаёмых з чамаданчыкамі. Адзін з іх паказвае пасведчанне, якое Ганна, вядома ж, не паспявае вывучыць.

Прайшоўшы ў гасцёўню, група аднолькавых мужчын у бахілах пачынае аглядаць слана, і толькі адзін з іх мае ласку паразмаўляць з Ганнай:

— Як жывёла паводзіць сябе апошнім часам?

— Не ведаю, у мяне свой слон — гэты бацькоўскі...

— Нам вядома, што тут адбыўся інцыдэнт...

— Вы гэта так называеце?

— Мы прытрымліваемся пратакола. Жывёла перажыла сур'ёзны стрэс, і нам важна зразумець, як яна сябе адчувае, ці не адчувае ціск...

— Ого... — не прыхоўваючы сарказму, адказвае Ганна.

— Думаю, вам трэба ведаць, што сланы злапомныя...

— Так, мне мой малады чалавек расказваў...

— Па сутнасці, цяпер у вас дома стаіць вялізнае пакрыўджанае сямігадовае дзіця.

— О, цяпер у нас іх два! — гледзячы на дачку, пакеплівае Аляксандр. Ветэрынар не звяртае ўвагі на сямейныя кепікі і працягвае імправізаваную лекцыю:

— Сланы памятаюць пахі і адрозніваюць галасы. Ваш гадаванец можа злавацца, а цяпер, мяркуючы па ўсім, мае пастаянную трывогу. Больш

за тое, мы ведаем, што сланы адчуваюць посттраўматычны стрэсавы стан, які можа ўскладняць сітуацыю...

— І што скажаце рабіць?

— Вам неабходна быць спакойнай, далікатнай і ні ў якім разе не правакаваць яго. Дарэчы, як вы яго называеце?

— У якім сэнсе?!

— Якая ў яго мянушка?

— Ды няма ў яго ніякай мянушкі...

— Пом... — гаворыць Аляксандр.

— Што?! — павярнуўшыся да яго, са здзіўленнем пытае Ганна.

— Мы клічам яго Пом, ці Помі, — звяртаючыся не да дачкі, а да ветэрынара, адказвае Аляксандр.

— Вось і слаўна. Вам важна разумець, што цяпер Помі раззлаваны праз напад. Крыўда, якую ён адчувае, застанецца з ім на ўсё жыццё, таму вам неабходна быць вельмі тактоўнымі!

— Прынята, — дзелавіта адказвае вядомы пісьменнік.

— Я раю вам пасябраваць з ім, — на развітанне кажа дзяжурны ветэрынар, — пакуль няма ніякіх прычын думаць, што Помі тут ненадоўга...

Калі дзверы зачыняюцца, Ганна з асуджэннем глядзіць на бацьку:

— Помі, гэта ж трэба! І даўно?

— Не ведаю, пару дзён ужо як...

— Значыць, замест таго, каб выгнаць яго адсюль, вы даяце яму мянушку?

— Мілая, — ужо было вяртаючыся ў сталовую, разварочваецца бацька, — часам мне падаецца, што стасункі з тваім маладым чалавекам не ідуць табе на карысць. Можа, табе ўзяць пэўную паўзу ў дачыненнях з ім? Калі я добра памятаю, твой папярэдні кінапрадзюсар быў куды больш жыццярадасны, дык можа, табе вярнуцца да яго?

— Я ўжо як-небудзь сама разбяруся!

— Так-так, ты ўжо разбярыся, калі ласка, але не зацягвай...

ЗУСІМ САКРЭТНА

Міністру ўнутраных спраў

Аб неабходнасці неадкладнай распрацоўкі брашуры
"Догляд слана"

У цяперашні час узнікла вострая неабходнасць забяспечыць грамадзян рэкамендацыямі па доглядзе жывёл у хатніх умовах, якія праз недагляд Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства аховы прыроды і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях дагэтуль не створаныя. Рэкамендуецца стварыць агульны і зразумелы дакумент, які будзе ўключаць кармавыя і санітарныя нормы:

Уборка мачы і фекалій: аднаразовая колькасць мачы можа дасягаць 50 літраў, фекалій — 20–30 кг за адну дэфекацыю. Рэкамендуецца выкарыстоўваць апілкі або салому, а таксама падрыхтаваць лапаты і тачкі. Рэгулярна дэзынфікаваць месца ўтрымання слана.

Купанне слана: 2 разы на тыдзень. Выкарыстоўваць мяккія шампуні без агрэсіўных хімічных дабавак. Прымяняць магутны, але мяккі струмень вады. Старанна прамываць складкі скуры, асабліва за вушамі і пад хвастом.

Харчаванне: 2-3 прыёмы ежы ў дзень. Свежыя трава або сена ў колькасці да 200 кг у дзень. 100 літраў вады. Дадаць у рацыён садавіну, гародніну і караняплоды. Мінеральныя дабаўкі і вітаміны — згодна з рэкамендацыяй ветэрынара. Асаблівыя рэкамендацыі: пазбягаць прадуктаў з высокім утрыманнем цукру або солі. Кантраляваць порцыі, каб прадухіліць атлусценне.

Для службовага карыстання

Падняўшыся па вузкай крутой лесвіцы на мансарду, Павел кідае ключы на столік і глядзіць на сланяня, якое жыве ў яго. Малое, якому ўсяго некалькі месяцаў, абяззбройвае. Як ні стараецца Павел цяпер раззлавацца на яго, нічога не атрымліваецца. Сланяня весела і замілавальна размахвае вушамі і нават, можа падацца, цешыцца вяртанню добрага сябра. Павел разумее, што з кожным днём сланяня будзе расці і ствараць усё больш нязручнасцяў, аднак па-ранейшаму мае да малечы самыя цёплыя пачуцці. Выпрабаванне. Дылема. Разглядаючы мілую жывёлу, Павел згадвае пра "парадокс Пета": сланоў не павінна існаваць наогул — чым больш у жывёлы клетак, тым больш дзяленняў, а значыць — вышэйшая верагоднасць выпадковага пашкоджання ДНК і таго, што, выйшаўшы са строю, няправільная клетка запусціць рак. Клетак у сланоў да таго шмат, што ўсе яны павінны паміраць яшчэ да нараджэння, аднак дзякуючы геннай латарэі жывёлы навучыліся падманваць смерць.

— Цябе тут наогул не павінна быць! — з горыччу, але спакойна гаворыць Павел. Ён яшчэ раз піша Ганне. Яна чытае яго паведамленне, але не адказвае.

Сланяня трасе галавой так, быццам не згоднае з папярэднім выказваннем гаспадара, і пачынае бавіцца з уласным хобатам. Падышоўшы да жывёлiны ўшчыльную, Павел гладзіць малое і раптам кажа:

— Мы павінны сысці адсюль, малы, я цябе адвяду...

Самым складаным аказваецца спусціць сланяня ўніз. Старая вітая лесвіца не прызначаная для вялікіх жывёл. У сланяняці ўвесь час падгінаюцца ногі, яно пралятае некалькі прыступак уніз, аднак, падняўшыся ў пралёце, не злуецца, а цешыцца, быццам удзельнічае ў вясёлым атракцыёне. Сланяня добрае.

— Ты малайчына! — з жалем кажа Павел і, калі яны ўжо на двары, накідвае на жывёлу падрыхтаваны загадзя павадок. Малы не супраціўляецца і пакорліва ідзе следам. Мінакі не зважаюць ні на Паўла, ні на сланяня. І сапраўды, што тут такога? Хто ў гэтым горадзе не бачыў слана?

Завулак за завулкам, пастаянна думаючы пра Ганну, Павел моўчкі ідзе ў бок заапарка, аднак, не дайшоўшы двух кіламетраў, утыкаецца ў доўгую чаргу. На хвіліну пакінуўшы сланяня, Павел падыходзіць да людзей, што стаяць у канцы доўгай змяі, і цікавіцца, чым выклікане стоўпатварэнне. Аказваецца, сланы пакінулі заапарк. Вось ужо некалькі дзён гараджане становяцца ў доўгія чэргі, каб разглядаць пустыя вальеры. Ахвочых так шмат, што квіткі прадаюць толькі на кароткія слоты. Падышоўшы да вялікага ўчастка, на якім калісьці пасвіліся сланы, гараджане хутка фатаграфуюцца на фоне пустаты і саступаюць месца наступным ахвочым — ад свабоды, якую цяпер паказваюць у заапарку, займае дух!

"Гэта яшчэ што! — гаворыць адзін стары, які стаіць у чарзе. — Мы ўчора з жонкай змаглі за трайны кошт дастаць квіткі ў цырк!"

“Ого! Гэта ж цяпер амаль немагчыма! А як у вас атрымалася?”

“Сувязі!”

“І што, праўда, што там сланоў таксама няма?!”

“Чысцейшая! Аніводнага! Вы толькі ўдумайцеся: відовішча доўжыцца паўтары гадзіны, і ўвесь гэты час на арэне пуста! Толькі клоўны!”

“Ох, нават складана ў гэта паверыць!”

Павел раптам заўважае, што сланяня знікла. Ён хоча паклікаць яго па мянушцы, але разумее, што дагэтуль ніяк не празваў свайго гадаванца.

“Малы! Слон! Сланяня! — спярша быццам бы толькі для сябе, але з кожным разам усё гучней і гучней крычыць Павел. — Сланяня, ты дзе?”

Людзі, якія стаяць у чарзе і якія праходзяць міма, не звяртаюць увагі. Ніхто не спыняецца і не пытаецца, ці патрэбная Паўлу дапамога. Гэта і зразумела — крычаць на ўсю вуліцу “Слон!”? Шукаць вялізную жывёлу ў горадзе, дзе ад іх і так няма дзе падзецца?

“Кожны вар’яцее па-свойму”, — думаюць мінакі, не гледзячы на Паўла, які працягвае бегаць ад будынка да будынка.

Пасля некалькіх гадзін марных пошукаў, сустрэўшы на сваім шляху як мінімум некалькі соцень сланоў, што мірна пасвіліся ў горадзе, абсалютна зняможаны, Павел вяртаецца дадому і бачыць, што яго сланяня, якое здаецца цяпер крыху большым, чым было, спакойна стаіць пасярод маленькай мансарды.

Павел кладзецца на падлогу, заплюшчвае вочы і вырашае, што абавязкова прыдумае, як вызваліць горад і вярнуць Ганну.

*Ну добра, а што б вы зрабілі, калі б у вас дома аказаўся слон?* **Добры самаранін**

*Спалохалася б, напэўна, і ўцякла б з кватэры.* **Таццяна**

*Напэўна, я б захацеў у першую чаргу даведацца, адкуль узяліся жывёлы, зразумець прыроду таго, што адбываецца. Без гэтага было б складана знайсці нейкае рашэнне.* **Джон**

*Думаю, я б паспрабавала зрабіць так, каб слану і мне было б камфортна суіснаваць нейкі час і паралельна займалася б высвятленнем, што адбываецца і ці можна перанакіраваць яго ў больш адпаведнае месца.* **Марта**

*Стаілася б…* **Алена**

*Я б карміла яго, пакуль грошы не скончацца. У мяне паслядоўна былі: сабака, котка, слімакі і мурашы. Нікога не заводзіла сама. Ну, слон дык слон. Тым больш цяпер яны паўсюль. Ёсць істоты страшнейшыя за слана.* **Вольга**

*Я б раўла каля кожнага вугла “Тут жа сланы паўсюль!”, а большасць бы рабіла выгляд, што нічога не адбываецца і ігнаравала б гэтую тэму. Некаторыя шэптам параілі б мне маўчаць і рабіць выгляд, што ўсё акей. Давялося б ісці туды, дзе няма сланоў, каб мець магчымасць гаварыць, што яны існуюць.* **Кацярына**

*Паклапаціўся б пра слана, каб ён сам сабе і ўсім навокал не нашкодзіў. Паспрабаваў бы разабрацца, адкуль яны ўсе ўзяліся. Калі гэта новая нармальнасць — успрымаў бы яго як сямейніка.* **Дзяніс**

*Навучыў бы яго гуляць у шахматы і пазнаёміў бы яго з яшчэ чатырма сланамі, каб ён не нудзіўся, пакуль мяне няма дома.* **Стан**

*Купіў бы льва і, прагнаўшы свайго слана, здаваў бы льва ў арэнду іншым карыстальнікам.* **Антон**

*Я б расказаў яму сваю гісторыю, і ён сам бы сышоў...* **Ананім**

ЗУСІМ САКРЭТНА

Міністру ўнутраных спраў

У адпаведнасці з вашым запытам прадстаўляем падрабязнае тлумачэнне асаблівасцяў дынамікі пачуццяў Ганны:

На дадзены момант грамадзянка адчувае глыбокія пачуцці, якія можна ахарактарызаваць як каханне, якога, разам з тым, яна надзвычай баіцца (глядзець дадатак да дакумента).

Вялікае пачуццё выяўляецца ў шчырым захапленні некаторымі асобаснымі характарыстыкамі Паўла, яго каштоўнасцямі і, верагодна, значнымі агульнымі ўражаннямі, якія сфарміравалі моцную эмацыйную сувязь паміж маладымі людзьмі. Разам з тым, нягледзячы на наяўнасць сур’ёзных пачуццяў, Ганна схіляецца да поўнага разрыву стасункаў у сувязі з разыходжаннямі і адрозненнямі датычна жыццёвых мэт. Асноўная прычына адмовы Ганны ад уз’яднання з Паўлам заключаецца ў тым, што яна аддае перавагу асабістаму камфорту — як фізічнаму, так і эмацыйнаму. Гэтае рашэнне прадыктаванае наступнымі фактарамі:

Стабільнасць: Ганна мае ў прыярытэце прадказальнасць і спрошчаны лад жыцця, тады як стасункі з Паўлам могуць успрымацца як крыніца эмацыйнай турбулентнасці.

Аўтаномнасць: яе выбар палягае на імкненні захаваць незалежнасць (ад Паўла, але не ад бацькі), пазбягаючы неабходнасці адаптацыі да абставін, якія могуць суправаджаць іх сумеснае жыццё ва ўмовах абмежавання абставінамі.

Каханне, якое Ганна працягвае адчуваць да Паўла, знаходзіцца ў канфлікце з яе прагматычным падыходам да жыцця. Хоць эмацыйная прывязанасць моцная, рацыянальнае асэнсаванне сітуацыі прымушае яе рабіць выбар на карысць камфорту і прадказальнасці.

Дадатак да тлумачальнай запіскі аб дынаміцы пачуццяў Ганны:

*Калі Ганне споўнілася чатыры, ёй падарылі плюшавае сланяня. З гэтага дня яно заўсёды было з ёю. Ганна спала з ім, брала яго ў ванну, хаця і старалася не замачыць, карміла яго падчас сняданку. Нягледзячы на незадаволенасць выхавацеляў і пазней настаўнікаў, сланяня суправаджала яе і ў дзіцячы садок, і ў школу. Яно стаяла на парце, калі яна пісала ўступны іспыт ва ўніверсітэт, і на тумбачцы каля ложка, калі Ганна губляла цнатлівасць. Калі аднойчы на вакзале Паўднёвага гарадка зладзюжка скраў торбу, Ганна не турбавалася ні пра грошы, ні пра дакументы, але пра сланяня, якое было з ёй усё жыццё. Яна крычала на паліцэйскіх і абяцала, што здзейсніць самагубства, калі да раніцы яе сланяняці не будзе ў гасцінічным нумары, дзе яна беспрастанку плакала. Адзінае, што ёй было трэба, — слон, якога яна абдымала штодзень перад сном і з якім віталася раней, чым з мужчынамі, якія ў розныя гады дзялілі яе ложак.*

*Каб перажыць гэтую страту, Ганна пайшла да псіхолага, які гадамі дапамагаў ёй прапрацаваць траўму ўсяго жыцця. Цяпер часам яна думае даць шанец любові, але кожны раз страх аказваецца мацнейшым. Ганна больш не верыць у добры фінал. Яна ўпэўненая, што сланы ў рэшце рэшт заўсёды знікаюць. Як ні стараецца Павел пераканаць яе, што ўсё абавязкова будзе добра — па-ранейшаму маленькая дзяўчынка, Ганна не можа пераадолець уласны страх.*

*Апошнім часам Ганна ўсё часцей бачыць адзін і той жа сон. Ёй сніцца, што яна вялікая прыгожая абсалютна чорная слаґіха. Такім чынам, калі і ёсць у Паўла магчымасць быць з любай — то толькі калі яму самому зрабіцца сланом.*

Для службовага карыстання

Штопятніцы Аляксандр бывае ў Міністэрстве ўнутраных спраў. Яшчэ адзін рытуал, які паўтараецца вось ужо некалькі гадоў, з тых самых часоў, калі яго пазашлюбны сын Макс узначаліў ведамства. У другой палове дня ў кабінеце міністра некалькі афіцыянтаў падаюць абед усяго для дзвюх асоб — Макса і яго частага госця:

— Пра што пішаш на гэтым тыдні? — адклаўшы службовую запіску і працягваючы руку, пытае Макс.

— Чую сарказм з тваіх вуснаў, — абдымаючы сына, адказвае Аляксандр.

— Калі чакаць новую кнігу?

— Не ведаю, цяжка сказаць...

Так паўтараецца кожную пятніцу. Доўгія гутаркі, якія дазваляюць сыну адчуць сваю значнасць у вачах бацькі, які пакінуў яго, і, наадварот, бясконцыя выбачэнні Аляксандра, што застаюцца непрагаворанымя, але вісяць у паветры. Усё жыццё ён дапамагае Максу ўзбірацца па кар'ернай лесвіцы, але пры гэтым не робіць самага галоўнага — публічна не прызнае сваяцтва.

— Сафія ўсё гэтак жа працуе замест цябе? — раптам пытае Макс.

— Што ты маеш на ўвазе?

— Я ведаю, што ты даўно толькі робіш накіды сюжэтаў, але ўсе кнігі за цябе піша жонка. Асабіста я не бачу праблем у літаратурных рабах, але чытачы, думаю, могуць не зразумець...

— А нехта яшчэ чуў пра гэта?

— Чулі ўсе, каму трэба, але табе не варта перажываць на гэты конт. Як стронга?

— Выдатная...

— Слаўна... Слухай, я сёння хацеў пагаварыць з табой вось пра што...

— Так, даражэнькі, — разгублена выціраючы сурвэткай куточкі вуснаў, прыслухоўваецца Аляксандр.

— Твая дачка ж сустракаецца з маладым комікам, так?

— Здаецца, яна збіраецца кінуць яго...

— Гэта добра, бо ён і нам стварае шмат праблем, і створыць вашай сям'і...

— Якія менавіта праблемы?

— Мы яго нібыта прыстрашваем, але ён працягвае выступаць па барах, запраўках і бібліятэках. Штодзень з'яўляецца ў розных месцах і падбівае людзей супраць сланоў...

— І што, у яго добра атрымліваецца? — спрабуючы ўдаваць здзіўленне, але ўсё яшчэ думаючы пра жонку і пра ўласныя тэксты, з разгубленай усмешкай пытае Аляксандр.

— У яго не так ужо і шмат прыхільнікаў, да таго ж палова з іх нашы агенты, і ўсё ж мы назіраем, што некаторых пасіянарыяў ён запальвае...

— Думаю, ён верыць у тое, што мы павінны пазбавіцца сланоў...

— Пазбавіцца сланоў — нескладана. Як бачыш, у міністэрстве няма аніводнага. Пытанне навошта.

— Але ж раней мы неяк жылі без іх...

— Глядзі ў будучыню — сланы тут усур'ёз і надоўга. Трэба здабываць з гэтага выгаду, думаць пра

тое, як незаўважна для жывёл атрымліваць косць, а не ствараць праблемы. Карацей, паразмаўляй з ёй, няхай ушчуніць хлопца, інакш пасля яго затрымання на допыты будуць цягаць і вас...

У гэтую пятніцу пра сланоў больш не гавораць. Бацька дзеліцца ідэямі новых раманаў, а Макс расказвае пра пастаноўкі, якія паспеў паглядзець за мінулы тыдзень. Апрача гэтага, як звычайна, абмяркоўваюць спорт, кіно і новую архітэктуру. Як і належыць, тэмы змяняюць разам са стравамі, і толькі напрыканцы абеду, ужо развітваючыся, Макс кладзе руку на плячо бацьку, які збіраецца сыходзіць, і пытаецца:

— Ты ўсё гэтак жа пішаш каментары за сваіх чытачоў?

— Ну не за ўсіх, — крыху пакрыўджана адказвае Аляксандр.

— Так-так, я разумею. І ўсё ж будзе добра, калі ў большасці сваёй яны перастануць заўважаць сланоў, добра?

— Дык яны быццам і не заўважалі асабліва...

— Вось і слаўна!

Шмат гадоў таму маладая і прывабная студэнтка Сафія прыйшла на літаратурную сустрэчу з Аляксандрам і прызналася, што гатовая на ўсё, толькі б зрабіцца сакратаром любімага аўтара. Ад прапановы гэтай немагчыма было адмовіцца. Расшпіленая больш за дазволенае блузка зрабіла вялікае ўражанне, а багатая фантазія аўтара давяршыла задуманае дзяўчынай. Толькі на секунду ўявіўшы,

што гэтая мілая асоба будзе дапамагаць яму, Аляксандр капітуляваў. Першыя месяцы аўтар і сакратар рабілі выгляд, што паміж імі няма нічога, апрача працоўных стасункаў, і таму Аляксандр быў дзелавіты і часам нават строгі. Сафія бліскуча падыгрывала яму, уступаючы ў перапіску з выдаўцамі з розных краін, абмяркоўваючы ганарары за перавыданні ранніх аповесцяў і высылаючы надыктаваныя аўтарам заўвагі перакладчыкам. З часам даручэнняў рабілася ўсё больш. Сафія арганізоўвала выступы, адвозіла кашулі ў хімчыстку і ладзіла тэатральныя пастаноўкі па кнігах Аляксандра. Яна размаўляла з журналістамі, заказвала білеты толькі ў першы клас і займалася падборам гасцініц, нумары ў якіх павінны былі выходзіць на мора, раку ці возера — адным словам, на ваду, якую ён ліў. Аднойчы ў нумары, пасля таго, як былі зробленыя ўсе распараджэнні, Аляксандр папрасіў Сафію разаслаць пасцель і застацца. Яна паслухалася, і з той ночы калегі ператварыліся ў каханкаў. Дзяўчына была на сёмым небе ад шчасця, і Аляксандр нейкі час таксама. Цяпер Сафія не толькі купляла паперу, якой аддаваў перавагу вядомы пісьменнік, але і рэдагавала рукапісы, што ў рэшце рэшт прывяло да размовы, якой не чакала нават яна:

— Паслухай, мілая, я прыдумаў апавяданне пра такую спецыяльную камісію, якая вучыць людзей правільна смуткаваць...

— Бліскучая ідэя, Аляксандр!

— Чакай, паслухай! Дык вось, дапусцім, ёсць такі кабінет, у які трапляюць людзі, якія,

паводле меркавання грамадства, няправільна перажываюць тую ці іншую трагедыю. Мала рыдаюць перад журналістамі, не асабліва гучна плачуць і гэтак далей. Карацей, я хачу напісаць пра ветэрана вайны, якога абвінавачваюць у тым, што ён не вельмі ўжо пакутуе праз тое, што ідзе вайна. І вось ён трапляе ў гэты кабінет, і там павінна быць такая абсалютна шалёная баба, напрыклад, рудая, дапусцім, Кацярына, якая ўсім расказвае, як трэба правільна пакутаваць. І вось яна пачынае допыт гэтага чалавека, і я не ведаю, што там будзе ў сярэдзіне, але я прыдумаў фінальную сцэну: яго прыкоўваюць да койкі і закапваюць кроплі, каб вочы пачалі слязіцца. І назву нават прыдумаў — "Вось так лепей!".

— Брава, брава, Аляксандр! Якая цудоўная ідэя! Упэўненая, у вас атрымаецца выдатнае апавяданне!

— Не-не, ты не зразумела — я хачу, каб яго напісала ты...

— У сэнсе?

— У прамым. Ты ведаеш мяне як аблупленага. Разумееш, як я пішу, адчуваеш мой стыль, ведаеш усе мае прыёмы і выкруты. Мне не хочацца губляць час на рамяство, разумееш? Я хачу тварыць! Навошта мне сядзець, згарбаціўшыся над сталом, і ўсё гэта запісваць, калі гэты час я магу патраціць на творчасць?!

— Так, але я не магу пісаць так, як вы!

— Божа, ды што за глупствы? Хто заўгодна можа пісаць, як я!

— Не, Аляксандр, я не вазьмуся!

— Давай не дуры! Накідай мне да канца тыдня апавяданнечка на пяць-шэсць старонак, такое, каб не зусім кароткае, але і не вельмі доўгае, а я там ужо папраўлю, адрэдагую, палепшу... А цяпер хадзі сюды, пацалуй татачку...

Напісаны Сафіяй тэкст Аляксандру спадабаўся. Як ні хвалявалася яна, вядомы пісьменнік ацаніў перайманне яго рытму і здольнасць будучай жонкі выдумваць метафары, падобныя да яго ўласных. Толькі злёгку адрэдагаваўшы тэкст, Аляксандр даручыў разаслаць яго ўсім літаратурным часопісам (каб паглядзець, хто дасць больш) і прапанаваў пажаніцца:

— У сэнсе? Вы хочаце, каб я зрабілася вашай жонкай, Аляксандр?

— Так, мілая, наўрад ці я знайду чалавека, лепшага за цябе!

З таго часу Аляксандр ніколі не пісаў, але толькі рабіў накіды сюжэтаў. Добры (*двухмесны двухколавы ровар, 34 па гарызанталі, 6 літар*). Штораніцы ён сядаў за стол, разгортваў чарнавікі і дзяліўся з жонкай ідэяй новай задумы:

— Ведаеш, мілая, я хачу напісаць такі раман, у якім у кожную главу будуць уплецены пытанні з крыжаванкі. І ўсе гэтыя пытанні і правільныя словы будуць узаемадзейнічаць з сюжэтам, а галоўны герой ці гераіня, як пойдзе, на працягу кнігі будзе разгадваць гэтую крыжаванку, ну і чытач, ясная справа, таксама...

— Ідэя дзівосная, Аляксандр! Як, зрэшты, і ўсе вашы ідэі, але толькі не ўпэўненая, што я спраўлюся...

— Так, з гэтым ты сама наўрад ці справішся — там давядзецца вельмі шмат лічыць, але я ж не кіну цябе адну!

Ледзь толькі заканчвалася снеданне, Аляксандр ішоў да возера, каб натхніцца мясцовымі краявідамі, а Сафія сядала за стол, каб паралельна пачаць пісаць чарговую кнігу. З часам у яе кабінеце назбіраліся рукапісы некалькіх дзясяткаў раманаў, над якімі яна працавала адначасова (у залежнасці ад таго, пра якую са сваіх даўніх ідэй згадваў аўтар).

На шчасце, часам раніца пачыналася з таго, што вядомы пісьменнік звяртаўся да жонкі-сакратара з прапановай прыпыніць працу над тым ці іншым творам і вярнуцца да старога:

— Слухай, а вось памятаеш, у мяне была ідэя, што я апісваю шахматную партыю ад імя пешкі, такі агляд вялікай бітвы ад першай асобы? І людзі разумеюць, што, з аднаго боку, гэта проста шахматная партыя, але апісаная яна так страшна і так прыцягальна, што абсалютна немагчыма адарвацца?!

— Так-так, Аляксандр, вядома, як жа можна забыцца пра такую ідэю?!

— Дык вось яна мне больш не падабаецца! Адкладзі яе!

— Вы ўпэўнены?

— Так, а што, ты думаеш, што разумееш у літаратуры больш за мяне?!

— Не-не, што вы, мне проста падавалася, што гэта цудоўная ідэя!

У такія дні, прыхоўваючы сваю радасць, Сафія літаральна бегла ў кабінет, каб, адшукаўшы рукапіс, — не, не знішчыць, а перакласці яго ў шафу адкінутых ідэй, да якіх, зрэшты, Аляксандр час ад часу вяртаўся.

Самымі складанымі былі моманты, калі выбітны пісьменнік патрабаваў справаздачу:

— А як ідзе праца над раманам "Кніга падманутых"? Колькі ў ёй ужо гатова старонак?

Ці:

— Памятаеш тую гісторыю пра стэндап-коміка, які селіцца ў горным шале, нягледзячы на тое, што аб'яўленая пагроза сходу лавіны? І ўся вёсачка выязджае, а ён, наадварот, прыязджае туды і заяўляе, што нікуды не паедзе. Як жа я тады назваў гэтую гісторыю?

— "Праверка сувязі"?

— Дакладна! Якая цудоўная і паэтычная назва! Дык што там з гэтай кнігай? Я падумаў, што хацеў бы ў гэтым годзе выдаць яе.

— Вы тады вырашылі, што гэта будзе не раман, а апавяданне, — рызыкуючы, але разумеючы, што раман зусім не гатовы, хлусіла Сафія.

— Я сапраўды так змеркаваў?

— Так...

— Ну што ж... апавяданне — гэта нават складаней. У апавяданні, у адрозненне ад рамана, пісьменніку не схавацца за формай, у апавяданні чытача не падмануць! Што ж, апавяданне дык

апавяданне! Пакажы мне як-небудзь у бліжэйшы час!

— Так, так, вядома!

Вяртаючыся ад сына, Аляксандр прызнаецца сабе, што сумуе па сустрэчах з чытачамі.

“Трэба як мага хутчэй выпускаць новы раман!” — думае ён.

Аляксандр хоча сядзець на сцэне, жартаваць і зрываць апладысменты. Выбітны аўтар жадае быць пісьменнікам, але не пісаць. Сумесная праца з жонкай магла б працягвацца гадамі, аднак цяпер... Аляксандр думае, што, каб пазбегнуць чутак і нават агалоскі, мабыць... мабыць, варта нейкі час папісаць самому. Больш за тое, працягвае на хаду разважаць Аляксандр, каб у будучыні ў чытачоў не ўзнікла сумневаў адносна аўтарства, трэба зняць штосьці накшталт вялікага дакументальнага фільма ці нават серыяла, які мог бы адлюстраваць яго рабочы працэс.

Некалькі наступных дзён, як і прасіў сын, Аляксандр прысвячае любімым героям. Адразу пасля сняданку, расказаўшы жонцы ідэю чарговага рамана, выбітны пісьменнік ідзе ў кабінет і, сеўшы за камп’ютар, пачынае пісаць каментары да ўласных кніг. Зайшоўшы адразу на некалькі літаратурных форумаў пад рознымі нікамі, ён па пяць гадзін стварае бачнасць абмеркавання сваіх прац і, разам з тым, сітуацыі, якая складаецца ў горадзе. За гады імітацый Аляксандр выгадаваў цэлую групу каментатараў, якія цяпер калі і не здаюцца яму блізкімі

сябрамі, то ўжо дакладна даводзяцца старымі знаёмымі. Тут ёсць **Арына-балерына**, жанчына, якой, як ён прыдумаў, было каля пяцідзесяці гадоў. Усё ў яе жыцці збольшага наладжана, адзінае, што яе сапраўды хвалюе, — літаратура. Зрэшты, калі быць да канца шчырай, **Арына-балерына** не ведае, падабаецца ёй творчасць Аляксандра ці не, але працягвае чытаць яго і нярэдка абмяркоўвае з псіхааналітыкам сваю няўпэўненасць. Паводле аўтарскай задумы, **Арына-балерына** стараецца быць аб'ектыўнай і не скочвацца ў пошласць, хаця атрымліваецца не заўсёды. Услед за Арынай, калі толькі трэба "накінуць на вентылятар", Аляксандр пераключаецца на **ТваюDominu2022** — адчайную і дзёрзкую каментатарку, якая сапраўды яго ненавідзіць. **ТваяDomina2022** значна маладзейшая за **Арыну-балерыну**, нядаўна скончыла бакалаўрыят — цяпер яна дыпламаваны этымолаг, што, як ёй падаецца, дазваляе мець безапеляцыйную пазіцыю ў дачыненні да сапраўднай і эталоннай літаратуры. **ТваяDomina2022** таксама піша свой першы раман і не сумняваецца, што ён будзе настолькі геніяльным, што сучаснае грамадства яго, на жаль, не ацэніць. Творы Аляксандра **ТваяDomina2022** не выносіць. Яго стыль, такт, думкі — усё падаецца ёй павярхоўным і вульгарным. **ТваюDominu2022** раздражняе поспех і да хрусту выпрасаваныя белыя каўнерыкі самазадаволенага аўтара. **ТваяDomina2022** не сумняваецца, што ў гісторыі літаратуры застануцца сапраўдныя, вагавітыя тэксты, а не гэты напышлівы індык. І калі дзяўчына шчыра, усім сэрцам

не любіць аўтара, то **Добры самаранін**, напрыклад, не адчувае ніякіх асаблівых эмоцый. Вядомы адвакат, ён любіць чытаць, папулярызаваць літаратуру і да твораў Аляксандра ставіцца як да чарговай свежай кнігі, але не больш за тое. **Добры самаранін** наогул не разумее, навошта людзі пара́ўноўваюць кнігі, вырашаючы, якая лепшая, а якая не, калі адзіным аб'ектыўным крытэрыем, на яго думку, застаецца толькі тое, прачытаная кніга ці не. **Добры самаранін** любіць букіністычныя крамы і бібліятэкі. Яму падаецца, што сабраныя разам дзясяткі тысяч фаліянтаў ураз здымаюць усе гэтыя бязглуздыя спрэчкі пра тое, якую кнігу можна лічыць лепшай. Як наогул можна ўсур'ёз гаварыць пра тое, што хтосьці больш значны ці больш важны, калі перад вамі мільёны кніг?

Ёсць каментатары, якіх Аляксандр ведае вельмі павярхоўна. Здараецца, для адной толькі рэплікі, якую нельга даць пастаянным спрачальнікам, з'яўляюцца **Антоны**, **Актывісты13** ці **Топавыя прыхільнікі**. Трэцярадныя персанажы, якіх Аляксандр, безумоўна, паважае за іх унёсак, але не любіць. Пакуль не выходзяць новыя кнігі, каментатары працягваюць абмяркоўваць ужо апублікаваныя, а цяпер па просьбе сына пераключаюцца на спрэчкі пра сланоў, якіх большасць, мяркуючы па ўсім, сапраўды не заўважае:

*Даруйце, што ўлажу, але я не вельмі разумею, да чаго нам гэтая тэма тут, на літаратурным форуме?* **Арына-балерына**

*Цалкам згодны! Што, мы тут кожную навину будзем абмяркощваць? Давайце размауляць пра вечнае, пра литаратуру, а не пра нейких там жывёл!* **Невядомы карыстальнік**

*Чакайце, гэта што ж атрымліваецца, што нас усіх насамрэч няма?!* **Ананім**

Пакуль Аляксандр старанна замыльвае тое, што адбываецца, і нармалізуе ненармальнасць, Павел, наадварот, працягвае супраціўленне. Памылкова мяркуючы, што вызваленне горада дапаможа яму рэабілітавацца ў вачах любай, ён выступае ў барах і ўніверсітэцкіх аўдыторыях, на выпадковых бензакалонках і ў парках. Пагрозы мацнеюць, аднак Павел, пераадольваючы трывогу і ўласнае хваляванне, заклікае тых выпадковых мінакоў і тых, хто прыйшоў адмыслова паслухаць яго, не ігнараваць відавочнае: паўсюль сланы!

Павел жартуе, а пасля канцэртаў гаворыць пераканаўча і нават горача. Ён прапаноўвае праявіць салідарнасць, знайсці сродкі і, пабудаваўшы для сланоў новыя пашы, прачарціць (*13 па вертыкалі, 7 літар*) міграцыі.

— Але чаму вы ўпэўнены, што сланы паслухаюць нас і сыдуць? — пытаюцца тыя, хто сабраўся ў бары.

— Таму што я знайшоў Чорную самку!

Пра тое, што ў горад прыйшоў і галоўны, цёмны, як ноч, слон, пачалі гаварыць ужо ў першыя дні нашэсця, аднак нейкі час здавалася, што ўсё гэта толькі чуткі. Штовечар, скончыўшы выступы

і адклаўшы тэлефон, каб адпачнуць ад пагроз і абраз, Павел сядаў на ровар і доўга ездзіў па горадзе, спадзеючыся знайсці галаву вялізнага статка. Не перастаючы думаць пра Ганну, Павел марыў пагаварыць з Чорнай сланіхай, запатрабаваўшы адказаў. Выразна асэнсоўваючы, што нашэсце немінуча скончыцца бядой, Павел хацеў вызваліць горад і аднойчы ноччу, ужо вяртаючыся дадому, наткнуўся на Чорную самку.

Выязджаючы з порта, у якім і без таго праверыў, здаецца, кожны ангар, Павел вырашыў (нейкая нязнаная сіла літаральна магнітам цягнула яго туды) зазірнуць у адзін з адчыненых ангараў — пабачанае прымусіла рэзка даць па тармазах, і Павел ледзь не пераляцеў праз руль.

Тут пахла сенам і далёкімі краямі. Спачатку Павел падумаў, што сланіха не чорная, што так падае цень. Зрэшты, ужо праз імгненне ён усвядоміў, што вочы не падманваюць яго. Знайшоўшы рубільнік і асвятліўшы вялізнае памяшканне, Павел застыў ад здзіўлення. Пасярод ангара стаяў вялікі, быццам з чорнага мармуру, слон. Павел зрабіў некалькі крокаў бліжэй, аднак жывёла некалькі разоў пахітала вялізнай галавой, папярэджваючы, што далей ісці не варта. Павел спыніўся і нейкі час з захапленнем разглядаў сланіху, якая была адначасова вельмі прыгожай, страшнай і прывабнай. Масіўнае цела, вялікія веера-вушы і хобат, што нагадваў абуджаную змяю. Кароткая, але вялізная шыя, невялікія бурштынавыя вочы і вялікія вейкі. Нязвыкла чорная скура і, быццам высахлы стэп, дзясяткі тысяч

зморшчын. Мудрая, цяжкая, быццам цёмная гара, што ажыла, сланіха стаяла ў профіль, аднак калі Павел пачаў гаварыць, павярнулася да яго:

— Навошта вы прыйшлі?! — крыкнуў чалавек. Жывёліна ўдарыла нагой па бетоннай падлозе ангара.

— Але гэта наша зямля — у вас ёсць свая! — набраўшыся смеласці, гучна пракрычаў Паша.

Сланіха адмоўна паматала галавой.

— Вы павінны сысці адсюль!

Сланіха задрала хобат, быццам горн, і затрубіла з такой сілай і лютасцю, што Павел зрабіў некалькі крокаў назад.

— Я не баюся цябе!

Сланіха паднялася на заднія ногі і з такой моцай ударыла ў падлогу, што на імгненне знікла ў воблаку складскога пылу.

— Я ўсё адно не баюся цябе! Загадай сланам сысці адсюль!

Сланіха яшчэ раз затрубіла, але ўжо праз імгненне, быццам згубіўшы цікавасць да размовы, заціхла і адвярнулася.

Павел быў агаломшаны. Ён хацеў патэлефанаваць Ганне, каб расказаць пра дзівосную сустрэчу, зрэшты, ён цудоўна разумеў, што Ганна не адказала б.

У тую ноч Павел яшчэ доўга глядзеў на Чорную самку і, пакідаючы ангар, не сумняваўся, што знойдзе рашэнне, вызваліць горад і Ганна будзе вельмі ганарыцца ім і даруе яму!

ЗУСІМ САКРЭТНА

Міністру ўнутраных спраў

Службовая запіска аб крызісе водазабеспячэння
ў сувязі з забруджваннем крыніц вады сланамі

У некаторых раёнах горада ўведзены рэжым вымушанага адключэння вады ў сувязі з траплянем адходаў жыццядзейнасці сланоў у заборныя станцыі. Праз адсутнасць доступу да чыстай вады павялічваецца рост інфекцый. Зарэгістраваныя дызентэрыя і халера. Медыцынскія ўстановы адчуваюць сур’ёзны ціск, працуючы на мяжы магчымасцей.

Для ўнутранага карыстання

Стаптаўшы і з’еўшы амаль усю зеляніну, сланы бяруць звычку атакаваць супермаркеты, рынкі і склады. Як ні стараюцца валанцёры накарміць усіх жывёл, нічога не атрымліваецца. Не страўнікі, а студні і чорныя дзіркі. Ежы цяпер не хапае ні людзям, ні сланам. Як вынік, галодныя і злосныя, велізарныя госці ўсё часцей траўмуюць мінакоў. Многія цяпер баяцца, што раней ці пазней, пайшоўшы насуперак уласнай прыродзе, сланы пачнуць есці людзей...

Апрача таго, жывёлы выпіваюць амаль усю ваду. Адкрыццём робіцца і тое, што сланы вельмі любяць алкаголь. Напіваючыся, веліканы нярэдка грамяць усё вакол сябе. У сувязі з гэтым чуткі пра загінулых памнажаюцца цяпер штодзень. Здаецца, аповедаў гэтых столькі, што яны перастаюць рабіцца навінамі. Месцаў не хапае ні ў хірургічных аддзяленнях, ні ў моргах. На могілках (гавораць) тэрмінова разраўноўваюць новыя ўчасткі, якія, здавалася раней, ніколі не будуць запоўненыя. Заставацца на вуліцы робіцца сапраўды небяспечна, аднак разгубленыя гараджане пры падтрымцы журналістаў і ўлады працягваюць рабіць выгляд, што нічога асаблівага не адбываецца. Заплюшчаныя вочы і адведзены позірк. Апушчаная галава. Дзень, тыдзень, месяц, два, горад ператвараецца ў разрабаваныя сланамі руіны, і, выступаючы перад гледачамі ў адным з бараў, Павел заяўляе, што часу больш няма: раз дзяржава бяздзейнічае, трэба сваімі сіламі пачынаць выводзіць сланоў. Акурат пасля гэтага

выступу да яго падыходзяць два несамавітыя чалавекі і просяць прайсці за імі.

Пакуль яго вядуць бясконцымі калідорамі міністэрства, ён заўважае, што ў казённым будынку, як і ў доме бацькоў Ганны (ён ніяк не можа перастаць думаць пра яе), кіпіць рамонт:

— А куды зніклі гербы і сцягі? — увайшоўшы ў кабінет, першым пытаецца ён, яшчэ не разумеючы, што яго прывялі да міністра.

— Надыходзяць абнаўленні... — не паварочваючыся да яго, гледзячы ў акно, адказвае Макс.

— А сланоў у вас тут таксама няма?

— Аніводнага...

— Як у вас гэта атрымалася?

— Мы ўмеем адстойваць свае інтарэсы...

— Зразумела... Чым абавязаны?

— Думаю, Паш, ты цудоўна разумееш, — усё гэтак жа, не паварочваючыся да суразмоўцы, адказвае міністр.

— Хочаце, каб я выступіў на Дні ведамства?

— Хачам, каб спыніўся. Я мог бы гэта лёгка зрабіць, але за цябе папрасіў Аляксандр...

— Аляксандр?!

— Менавіта. Дачцэ яго на цябе пляваць.

Павел робіць рэзкі крок у бок Макса, але зараз жа адчувае на плячах чыесьці рукі, што ўзніклі з ніадкуль.

— Ты дарма так журышся па ёй. Яна не тая, хто табе трэба. Вы ніколі б не былі шчаслівыя.

— Ды што вы наогул ведаеце пра нас?!

— Усё, абсалютна ўсё. Я ведаю, Паш, што ты дарма так пакутуеш: яна табе не пара.

— Гэта не вам вырашаць!

— Вырашаць, вядома, не мне, але аб'ектыўныя даныя ў мяне ёсць. Яна не кахае цябе — яна любіць камфорт.

— Цяжка паверыць, што вы мяне сюды менавіта дзеля гэтага запрасілі.

— Запрасіў я цябе, каб папярэдзіць: ты моцна рызыкуеш...

— Хіба я парушаю закон?

— Пакуль не, але, здаецца, збіраешся?

— Я збіраюся зрабіць за вас вашу працу...

— Наша праца — забеспячэнне парадку ў дзяржаве...

— І як? Спраўляецеся?

— Больш чым...

— А я думаў, што ваша праца заключаецца ў тым, каб праганяць сланоў...

— Трэба быць наіўным дурнем, каб нават на імгненне падумаць, што гэта магчыма...

— Мы зможам!

— Навошта?

— Каб жыць як раней!

— Толькі ідыёты глядзяць у мінулае. Сланоў ужо не прагнаць.

— А калі аб'яднацца?

— На шчасце ці на жаль, нашы людзі не ўмеюць аб'ядноўвацца...

— Чаму вы ў гэтым так упэўнены?

— Бо, у адрозненне ад цябе, мы ў гэтых сценах дзесяцігоддзямі вывучаем і добра ведаем наш від. Я хачу табе штосьці расказаць, — усё гэтак жа не паварочваючыся, безэмацыйна гаворыць Макс. — Ведаеш, у чым адрозненне сланоў, якія прыйшлі да нас, і тых, што ўжо былі ў цырках? Ведаеш, чаму цыркавы слон падпарадкоўваецца дрэсіроўшчыку? Бо не ўсведамляе сваёй сілы. З самага дзяцінства яго саджаюць на ланцуг і прывучаюць да бездапаможнасці. З першых дзён свайго жыцця ён ведае, што нічога не зможа. Слон не разумее, што яму вельмі лёгка раздушыць утаймавальніка, — ён разумее, што ў дрэсіроўшчыка ёсць спецыяльны крук, які, у выпадку чаго, вельмі балюча схопіць яго за хобат. Цыркавы слон пакорлівы з першых дзён свайго жыцця і ўжо ніколі не зразумее, наколькі ён моцны.

— Але людзі ж свабодныя! Яны ж не сядзяць з дзяцінства на ланцугу!

— Яшчэ як...

— Хіба што па вашай віне!

— Я б сказаў, што гэта не віна, а вялікае дасягненне! Чалавек куды больш небяспечны за слана, да таго ж даволі дрэнна паддаецца дрэсіроўцы. Некаторым дзяржавам патрабуюцца дзесяцігоддзі, каб пасадзіць свайго грамадзяніна на ланцуг, аднак жа калі гэта здараецца — здзяйсненнем гэтым варта толькі ганарыцца.

— Па-вашаму, чалавек на ланцугу больш бяспечны за чалавека свабоднага?

— У гэтым няма ніякіх сумневаў. Чалавек павінен быць выдрэсіраваны. Для гэтага і прыдуманая

дзяржава. Усё падпарадкавана аднаму-адзінаму імкненню — зрабіць так, каб чалавек не паскудзіў на арэне і не кідаўся на гледачоў.

— Вось вы лічыце сябе ўзорным дрэсіроўшчыкам, але ўвесь гэты час стаіце да мяне спінай...

— Бо ты не драпежнік, Паш, а клоўн... — нарэшце павярнуўшыся, гаворыць Макс і робіць некалькі крокаў да стала. Падышоўшы бліжэй, ён злосна ўсміхаецца і працягвае: — Але ты не крыўдуй! Я ведаю, што ты добры хлопец, я ж толькі таму і запрасіў цябе сюды.

— Я б на вашым месцы выбачыўся!

— О, павер, на гэтым месцы я магу рабіць усё, што мне ўздумаецца. Так што лепш паслухай: я ведаю, што ты заклікаеш людзей праганяць сланоў, але, здаецца, не вельмі разумееш, чым усё гэта можа скончыцца, таму мы з табой цяпер дамовімся, што ты згортваеш свае публічныя выступы і вяртаешся жартаваць у свой бар.

— Вы думаеце, што ўсе людзі вам падпарадкоўваюцца?

— Я не думаю — я гэта ведаю. Кожны мае сваю справу. Табе трэба пісаць жарты, а мне сачыць за парадкам.

— Па-вашаму, гэта парадак?

— А што не так?

— Вы бачылі, у што ператварыўся горад?!

— Не ведаю, у нас тут усё добра, да таго ж добраўпарадкаванне — не наша адказнасць...

— Сланы топчуць людзей, рабуюць крамы, вада атручаная, дамы разбураныя!

— Вельмі добра — ёсць вінаватыя, і народ пры справе.

— Вы ж цяпер жартуеце?

— Я ніколі не жартую — служба не дазваляе. Ты, нібыта, хлопец кемлівы, але, здаецца, не разумееш, у што ўблытаўся. Калі ты зачэпіш хоць аднаго слана — мы абвінавацім цябе ў арганізацыі і падрыхтоўцы дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, а таксама ў стварэнні экстрэмісцкага фарміравання. Ты не выберашся з турмы да канца сваіх дзён. Я даю табе апошні шанец лёгка выскачыць з гэтай сітуацыі, разумееш?

— Я разумею, што хачу быць косцю, якой вы ўдавіцеся!

— Мы цябе абгрызём і выкінем...

— Вы мяне нават не ператравіце...

— Ну што ж... я прапаноўваў...

ЗУСІМ САКРЭТНА

Міністру ўнутраных спраў

По вашым запыце
прапаноўваем шэраг дадатковых
мер уздзеяння на грамадзяніна П.:

Прапаноўваецца не толькі працягнуць запалохванне, але і неадкладна распачаць сістэматычнае падрыванне рэпутацыі з мэтай нейтралізацыі ўплыву грамадзяніна П. праз публікацыю кампрамату. Прапануецца апісаць фінансавыя махінацыі, амаральныя паводзіны і кантакты са здраднікамі Радзімы. Вітаецца дэстабілізацыя найбліжэйшага атачэння шляхам распаўсюджвання чутак пра ненадзейнасць і хлуслівасць грамадзяніна П. Акрамя гэтага, з сённяшняга дня ўступае ў сілу разрыў з грамадзянінам П. усіх працоўных кантрактаў, што паставіць яго ў складанае (невыноснае) фінансавае становішча. У дадатак да гэтага будуць арганізаваныя абвінавачанні ў адміністрацыйных і крымінальных правапарушэннях. Працягнуцца правакацыі з наступнай агалоскай і псіхалагічным ціскам з мэтай знішчэння ўпэўненасці грамадзяніна П.

Для ўнутранага карыстання

Цягнікі спраўна стаяць. Даносы пішуць часцей за вершы, і палітыкі больш няма, бо плодзяцца сланазнаўцы. Са стасункаў выскокваюць імкліва, развітваючыся па тэлефоне. Галоўнае — не ўскладняць, важна — без перасадак. Нам было добра разам, але час свайпіць — не захрасаць жа, мілы, на кімсьці адным. Па складаныя эмоцыі ходзяць у рэстараны, па заспакаенне — занурваюцца ў крыжаванкі. Да высноў прыходзяць, мінуўшы рэфлексію, бо кожны цяпер імкнецца як мага хутчэй мець рацыю.

Зайшоўшы ва ўніверсітэт, Павел даведваецца, што яго выкладчыцкая дзейнасць спыненая. Студэнты смяюцца з яго і, не саромеючыся, хамяць: “Дажартаваўся, філосаф!”

Павел забірае рэчы і, перайшоўшы дарогу, заходзіць у бар, дзе звычайна выступае. Тут яму паведамляюць, што яго вечаровы канцэрт адменены.

— У сэнсе? — пытаецца ён у сяброў.

— У прамым! — з выклікам гаворыць адзін з іх і працягвае тэлефон, на якім інтэрв’ю з п’яным бацькам Паўла. Ледзь варушачы языком, невыносна павольна, седзячы ў запаскуджанай кватэры, стары заяўляе, што асуджае дзейнасць сына, бо той доўгія гады атрымлівае грошы з-за мяжы толькі за тое, што высмейвае нашых людзей і нашу краіну. Тое, што не можа сказаць непрытомны бацька, гледачам тлумачыць вядоўца. Аказваецца раптам, што ў былым дзіцячым пакоі Паўла знойдзеныя парнаграфічныя матэрыялы, якія,

праз тое, што каля экранаў могуць быць дзеці, вядучы не адважваецца паказаць, аднак удакладняе, што ў іх сапраўднасці не варта сумнявацца. Апрача таго, голас за кадрам дадае, што канфіскаваныя пакінутыя ў бацькоўскай кватэры чарнавікі маналогаў Паўла, у якіх ён прама прызнаецца, што распачаў стасункі з дачкой вядомага пісьменніка, Ганнай, толькі таму, што марыць жыць у яе раскошным доме і ездзіць на дарагіх аўтамабілях яе бацькі. Гэтую інфармацыю зараз жа пацвярджае п'яная маці Паўла, якая са слязьмі на вачах расказвае, што ён заўжды сустракаўся толькі з багатымі дзяўчатамі.

"Ён заўжды саромеўся нас", — мямліць п'яная маці.

Гледачы даведваюцца, што побач з імі, па адных з імі вуліцах, ходзіць вельмі брыдкі малады чалавек з дрэннай сям'і. Гэты Павел (цяпер ведае кожны гараджанін) заклікае праганяць сланоў, бо хоча незаўважна забіваць іх і прадаваць слановую косць — пра гэта ён, маўляў, таксама піша ў сваіх дзённіках.

— Вобразы, сюжэты, матывы ў фальклоры і літаратуры? Сем літар, пятая "т", — паралельна разгадваючы крыжаванку, Ганна глядзіць сюжэт разам з бацькамі. Яна ведае Паўла, яна, здаецца, усё яшчэ кахае яго, але цяпер пачынае сумнявацца ва ўласных пачуццях.

Столькі новай інфармацыі і адразу! Ёй не хочацца верыць ува ўсё, што ліецца з экрана. І ўсё ж,

якой бы адкрытай ні была хлусня, як фарба, пушчаная ў чыстую ваду, паклёп пачынае разлівацца па яе целе. Трэба быць моцным чалавекам, каб вытрымаць усю гэтую атаку. Зноў напалоханая, Ганна думае цяпер пра тое, як на яе будуць глядзець сяброўкі і знаёмыя. Што скажуць сябры? Ганна не любіць чутак. Яна не хоча, каб людзі абмяркоўвалі яе ў каментарах. Ёй не хочацца, каб пра яе гаварылі як пра дзяўчыну таго дзіўнага і складанага тыпа. "Штораз, калі нас будуць бачыць разам, людзі будуць казаць, што ён са мной толькі праз грошы..."

Усе гэтыя дні яна думае напісаць Паўлу, даць яму другі шанец. Ганна разумее: каханне ёсць, і ёй хочацца быць разам з ім. Ён самы спагадлівы і добры мужчына ў яе жыцці, аднак як яна можа яму давяраць? А што, калі па тэлевізары не хлусяць, і навошта б ім хлусіць, праўда? Калі б ён быў добрым чалавекам — хіба родная маці так гаварыла б пра яго? Ганна раптам разумее, што Пашавы праблемы раздражняюць яе. Усе гэтыя п'яныя бацькі, уся гэтая барацьба. Зашмат лішняй інфармацыі, якая перашкаджае пачуццям. Цяпер Ганна пачынае перабіраць у памяці мінулы месяц, і аказваецца, што многае сапраўды павінна было насцярожыць. Ганна згадвае, што Павел быў гарачы і спасцярожлівы, што вечна жартаваў пра грошы (быццам яна вінаватая, што ў яе іх больш!). Не, цяпер яна ўжо амаль не сумняваецца, што ён не той, хто ёй патрэбны. Магчыма, ён добры чалавек, але для зручных стасункаў гэтага мала. Дзякуючы ўсім гэтым падзеям яна ўсё больш выразна разумее,

што ёй хочацца прастаты і лёгкасці. Ёй хочацца ездзіць на мапедзе ўздоўж акіяна ў белай празрыстай сукенцы. Калі з кожнай хвілінай праблем робіцца так шмат — хіба ёсць месца святу і тым пачуццям, пра якія яна так марыць? Ганна разумее, што зусім не гатовая да ўсіх гэтых цяжкасцяў, і раптам вырашае напісаць развітальны ліст...

Сябры па клубе тлумачаць, што з выступамі давядзецца пачакаць. Выйшаўшы на вуліцу, Павел хоча закурыць, але зараз жа сустракае незнаёмага, які, падышоўшы ўшчыльную, плюе Паўлу ў твар і вырывае запальнічку, якую яму падарыла Ганна. Незнаёмы ўцякае, і, выцершы шчаку, Павел дастае тэлефон. Ён чамусьці ўпэўнены, што любая вырашыла нарэшце памірыцца і даслала яму паведамленне, але замест гэтага атрымлівае чарговую пагрозу:

“Утрыся, вырадак!”

Павел успамінае, што забыўся пакарміць сланяня. Ён ідзе ў бок дома, але, прайшоўшы паўдарогі, не вытрымлівае і паварочвае да Ганны. Павел разумее, што больш не можа трываць яе маўчання, ён хоча пагутарыць. Усё гэта складана вытрымліваць аднаму. Яму важна праясніць сітуацыю. Павел не разумее, на якім яны свеце, і баіцца, што каханая паверыць ува ўсю тую лухту, што з самай раніцы транслююць па ўсіх каналах.

Шлях да дома Ганны займае паўгадзіны. Толькі за гэты час ён атрымлівае яшчэ дзве пагрозы на тэлефон і адзін каменьчык у спіну.

“Як дзіўна, — з горкай іроніяй думае Павел, — яшчэ ніколі я не быў такі папулярны”.

Ён грукае ў дзверы Ганны. Грукае, грукае, пакуль яна нарэшце не здаецца і не выходзіць на ганак.

— Нам трэба пагаварыць...

— Мне падаецца, я прасіла пакінуць мяне ў спакоі, — не падымаючы вачэй, адказвае яна.

— Аня, мілая, я наогул не разумею, што адбываецца!

— Паша, я баюся цябе! Я баюся тых афектыўных станаў, у якія ты кідаешся і робіш мяне зліўным бачком. Не ведаю, ці быў ты калі-небудзь на маім месцы, але, мяркуючы па тваіх бацьках, вядома, быў. Я баюся цябе, і гэта абсалютна вымотвае і пазбаўляе стасункі той чароўнасці, якая была раней! Яшчэ стасункі разбураюць пустыя абяцанні. Зразумей мяне правільна. Я вельмі веру, што ты добры чалавек, але, каб захаваць спакой і веру ў нашу шчаслівую будучыню, мне даводзіцца энергетычна з нашых стасункаў выходзіць і глядзець на ўсё збоку, рабіцца табе сябрам у нейкім сэнсе. Я адчуваю вялікую небяспеку для нашых стасункаў...

У кішэні вібруе тэлефон. Павел бачыць незнаёмы нумар. Паднёсшы апарат да вуха, ён чуе: “Прыгожая!”

— Хто гэта? — пытаецца Ганна.

— Не важна, — адказвае Павел і кладзе тэлефон назад у кішэню. — Ань, мілая, мне проста трэба крыху часу, каб усё паразграбаць. Карантыша, мне

вельмі сумна без цябе! Мы цяпер упускаем нашы цудоўныя дні! Навошта ты аплакваеш тое, чаго не адбылося? Так, цяпер многа цяжкасцяў, так, я прапусціў удар ад жыцця, але проста мне час усё выправіць! Даверся мне, мілая! Ну які ў цябе план цяпер? Гараваць адной? Шкадаваць, што не ўсё атрымалася ідэальна? Аплакваць нас, зажыва пахаваных? Падшываць да справы толькі памылкі і складанасці? Ускочыць у новыя стасункі і падманвацца, што яны адразу і на першым этапе будуць лепшыя за нашы? Сумнявацца, што я не магу зразумець памылкі і змяніцца? Злавацца за тое, што я некалькі разоў сарваўся? Карантыша, глядзі, — Павел зноў выцягвае тэлефон і знаходзіць фота, на якім яны ў абдымку сядзяць на траве, — паглядзі, давай зробім яшчэ мільён такіх фотаздымкаў, а не выдалім! У нас было столькі шчасця і столькі яшчэ наперадзе, але цяпер без усякіх маіх праблем. Я абяцаю! Я ўсё разрулю! Так, у нас не атрымалася ідэальнага пачатку, так, у наш першы год адразу ўварваліся цяжкасці, але хіба так не бывае? Так, здарыўся фальстарт, я рвануў крыху раней, да стрэлу, бо жыццё сказала нам: давайце я вас крышачку праверу. Павер, на мае паводзіны цяпер уплывае шмат знешніх фактараў, але нават калі такія цяжкасці калі-небудзь паўторацца і нават калі яны будуць больш маштабныя — ты нават не даведаешся пра іх. Аня, слухай, у цябе прыгожы, класны, вясёлы, разумны, спагадлівы, паспяховы, упэўнены ў сабе, чуллівы і пяшчотны хлопец, які, да таго, ж бачыць свае памылкі, і папраўляе іх, і робіць работу

над сабой у самыя кароткія, усталяваныя ДАСТам тэрміны, ну што ты сабе наогул думаеш, га?

— Паша, калі ласка, ты цяпер робіш толькі горш! Ты ведаеш, што такое агрэсіўныя паводзіны? Гэта не толькі калі на цябе равуць п'яныя бацькі. Гэта любая сітуацыя, у якой табе не пакідаюць выбару. Я ўважліва прачытала ўсе твае паведамленні, я ўважліва выслухала цябе. Ты сямнаццаць разоў паабяцаў мне беспраблемную будучыню і шаснаццаць разоў сказаў пра тое, у якіх складаных абставінах аказаўся, але цяпер ты дакладна ўсё выправіш і наладзіш...

— Я выпраўлю!

— Я разумею, што ты вельмі хочаш! Я бачу гэта! Я таксама ведаю, што словы — твая галоўная сіла і зброя. Не ў дрэнным сэнсе. І я падатлівая на словы. Мне хочацца верыць, што ты спакойны. Я не лічу, што ты балбатун ці пустаслоў. І я веру ў шчырасць усяго, што ты гаворыш. І ў намеры. Але на іншым канцы праваду ёсць яшчэ адзін чалавек. І гэты чалавек я. Я не ведаю, гэта нейкі балючы парадокс. Усе словы, ды і нават дзеянні, правільныя і гучаць цудоўна, але ад іх чамусьці страшна! Я не знаходжу слоў, каб табе патлумачыць...

— Я не разумею, чаму мы не можам быць разам, як раней?

— Бо ў стасунках ёсць не толькі тваё пачуццё, жаданне, імкненне, твае складанасці і працэсы вырашэння задач ці ацалення. Ёсць яшчэ і я. Са сваёй нейкай дынамікай, жаданнямі ці нежаданнямі. Таксама працэсамі псіхалагічнымі...

— Я разумею... Але што мы цяпер будзем рабіць?

— Думаю, пастараемся аднавіць кантакт, — раптам кажа Ганна.

— Праўда?

— Так...

Павел адчувае неймаверны прыліў сіл. Чыстае шчасце! Ён разумее, што гэта самыя важныя і патрэбныя словы, якія ён мог бы пачуць. Надзея, дазволены допінг. Цяпер ён не сумняваецца, што справіцца і са сланамі, і з пагрозамі, і з бацькамі, і з паклёпамі. Адно толькі тое, што Ганна верыць у іх каханне, дае крылы! Ён пытае, ці можа абняць яе, і яна кажа “так”. Павел утульваецца носам у яе шыю і стаіць так, здаецца, некалькі хвілін.

— Ты зрабіла новую татуіроўку? — звярнуўшы ўвагу на яе руку, пытае ён.

— Так...

— Чаму сэрцайка?

— Ты ж казаў, што ніхто ніколі не будзе кахаць мяне так, як ты... Я вырашыла зрабіць яе на памяць.

— Вельмі прыгожа! Я буду вельмі чакаць паведамлення ад цябе, — адыходзячы, гаворыць Павел.

ПАСТАНОВА
Міністэрства фінансаў

Неадкладнае ўвядзенне падатку на сланоў

З мэтай кампенсацыі выдаткаў на падтрыманне гарадской інфраструктуры, звязанай з утрыманнем жывёл, Міністэрства фінансаў пастанаўляе неадкладна ўвесці падатак на ўтрыманне сланоў. Аб’ектамі падаткаабкладання робяцца ўсе жывёлы, якія трапляюць у катэгорыю “сланы” і знаходзяцца на тэрыторыі краіны.

Выкананнем дадзенай пастановы зоймецца спецыяльна створанае аргбюро і слановая інспекцыя пры МУС.

Для ўнутранага карыстання

Павел засяроджаны. Ён стараецца не губляць часу. Аванс, які выдае любая, патрабуе рашучых дзеянняў. Ён падзяляе праблемы і вырашае іх адна за адной. Ён упэўнены, што Ганна будзе ганарыцца тым, як ён тэхнічна ўсё разрулiць. Павел адчувае, што час прыйшоў, хаця здаецца, быццам грамадства беспярэчна прымае тое, што адбываецца, няма ніякіх сумневаў: незадаволенасць расце. Няхай і на кухнях, але людзі ўсё часцей пагаджаюцца: далей так працягвацца не можа. Цяпер Павел не сумняваецца: колькасці яго паплечнікаў хопіць, каб вырашыць сітуацыю. Апрача гэтага, ён упершыню прызнаецца сабе: найперш ён хоча разабрацца са сланамі, а пасля — з шалёнымі сабакамі з МУС. Выступаючы ў барах, якія ўсё яшчэ не баяцца яго пускаць, Павел прапаноўвае заснаваць фонд, які дазволіць пабудаваць некалькі рэзервацый для сланоў і сабраць вялікую колькасць грошай. Павел дэманструе паплечнікам, якія прыйшлі на сустрэчу, праекты рэзервацый і свой план:

*Вядома, што сланы баяцца пчол. Маючы выдатную памяць, яны пазбягаюць месцаў, дзе ў вялікай колькасці вiрацца насякомыя. Паводле задумы Паўла, на поўначы горада, каля тысячы вуллёў, будуць усталяваныя сотні дымавых пушак, якія пагоняць пчол з горада на поўдзень. Акрамя гэтага, па ўсёй сталіцы будуць рассаджаныя расліны, якія асабліва любяць насякомыя. Павел разумее этычную праблему выкарыстоўвання пчол, таму прапаноўвае задзейнічаць іх толькі на першым этапе і зараз жа*

*пакінуць у спакоі. Далей, велізарныя, расстаўленыя паўсюль рэтранслятары павінны пачаць выдаваць манатонны працяжны гул, які сланы будуць прымаць за гудзенне пчол і, палохаючыся, пакідаць горад. Разумеючы, што нельга выклікаць у вялізнай колькасці жывёл паніку, працу трэба будзе праводзіць павольна, квартал па квартале.*

Між тым ціск не спыняецца. Адны і тыя ж невядомыя людзі прыходзяць на ўсе яго сустрэчы, пераследуюць і чакаюць каля дома. Прайшоўшы ў пакой, Павел заўважае, што мэбля перастаўленая, а рэчы ў шафе развешаныя ў іншыя парадку ці наогул раскіданыя па пакоі. Нязменнае тут толькі сланяня, якое расце з кожным днём. Часам у дзверы звоніць незнаёмы чалавек, і калі Павел адчыняе, ён не сыходзіць, але нічога і не гаворыць. Мужчына проста стаіць.

“Што вам трэба?” — пытаецца Павел. Незнаёмы не адказвае.

Быццам па раскладзе, прылятаюць пагрозы. Цяпер Павел амаль не заўважае іх. У гэта момант ён больш хвалюецца за Ганну, Павел баіцца, што любая даведаецца пра ціск і зноў спалохаецца, але не за яго, а за сябе. Павел перажывае дарма. Ганна так ніколі пра іх не даведаецца — яна зноў не піша. Арэлі. Дзень, два, тры. Ганна вінаваціць сябе за тое, што чамусьці працягнула яго пакуты. Яна не збіралася ўзнаўляць кантакт і цвёрда перакананая, што з гэтым нервовым хлопцам у яе нічога не выйдзе. Пакуль хапае цярпення, Павел

пераконвае сябе, што любай проста трэба час, бо падзеі апошніх дзён моцна паўплывалі на яе. Павел верыць, што ўсё будзе добра, бо Ганна так сказала, і таму стараецца засяроджвацца на выступах і прыборцы ў бацькоўскай кватэры. І ўсё ж, па вушы закаханы, праз тыдзень ён не вытрымлівае і запрашае Ганну на каву. У адказ прыходзяць яе апошнія словы:

*Павел, прывітанне.*

*Гэта мой апошні ліст.*

*У мяне было шмат часу, каб прыняць рашэнне. Я прыслухоўвалася да сябе і да цябе. Як мне падаецца, зрабіла ўсё, што магла. Магчыма, я ўзяла сабе занадта шмат часу і расцягнула твае пакуты. Я прашу ў цябе прабачэння за гэта.*

*Я не хачу працягваць нашы стасункі. Прычына простая: я не хачу.*

*Я бясконца табе ўдзячная за той цудоўны час, які ў нас быў. За ўсю тую любоў і цеплыню, за цікавасць, якія ты мне даў.*

*Я вельмі спадзяюся, што ты будзеш паважаць маё рашэнне, яно канчатковае, і не будзеш пісаць, тэлефанаваць, шукаць сустрэчы ці чакаць мяне.*

*Ганна*


1 АРТАЗМ
6 ЗЛОСЦЬ
11 РАЯЛЬ
19 вярблюд
20 апахала
23 АРХЕТЫП
29 сцэна
31 ГРАФАМАН
32 ЭСЭІСТ
33 ФОРЗАЦ
34 ТАНДЭМ

Працуючы да раніцы пры святле лямпы, Сафія перачытвае апавяданне, якое на мінулым тыдні, зноў успомніўшы пра яго, запатрабаваў Аляксандр. Заносячы апошнія праўкі, робячы гэта так, як зрабіў бы ён, Сафія адчувае жывёльны страх. Ёй здаецца, што калі не сёння, то ўжо напрыканцы тыдня дакладна, як у апавяданні “Мне падабаецца”, муж, чаго б гэта ні каштавала, знойдзе сабе маладую порнаакторку і кіне сям’ю. Сафія гатовая рабіць усё, што ён запатрабуе, гатовая дараваць яму любыя выбрыкі, толькі б не застацца адной. Ёй здаецца, што ў гэты момант свет спыніцца. Яна не ўяўляе сабе, як можна жыць без чалавека, за якога вось ужо некалькі дзясяткаў гадоў яна піша кнігі.

*З інтэрв’ю газеце “Хобат літаратуры”, якое ніколі не выйдзе:*
*— Сафія, чаму вы ўсё ж такі столькі гадоў пісалі за свайго мужа?*
*— Бо ў яго быў сапраўдны талент!*

*Ну вось вам і адказ! Вось чаму Ганна кідае Паўла: страх зрабіцца такой, як маці, і ўсё жыццё пражыць з адным мужчынам куды мацнейшы, чым перспектыва страціць сапраўднае каханне!* **Ананім**

*Бачна, што аўтар кнігі не любіць Ганну, таму я як чытач не здолеў падключыцца да таго, што яе любіць Паша. Яна не надзеленая рысамі, за якія яе можна любіць, яна пляскатая. Аўтар толькі выкрывае яе ўсю кнігу, праз што факт Пашавага кахання да яе ў маіх вачах — дэкларацыя. І Ганна ад гэтага атрымліваецца зусім выпуклай, знарочыстай, гратэскнай. І Пашавы пакуты відавочна*

*дэкларатыўныя, але не ідавочныя па-сапраўднаму, бо праз пляскатасць Ганны мы не можам нырнуць у Пашава каханне.* **Вадзік**

*Вядома, не любіць — яна ж яго дачка!* **Ананім**

Сафія націскае на кнопку “друк” — і прынтар, які стаіць побач з камп’ютарам, пачынае выплёўваць новае апавяданне вядомага аўтара:

*Праверка сувязі*

*Дождж узмацніўся. Устаў сцяной. Моцны вецер падгаварыў аканіцы, і тыя пачалі хвастаць па хатах. Закружыліся мокрыя лісты, і пераламаныя крохкія галінкі пакаціліся па горнай дарозе, што вяла ўніз.*

*Радавы ўвайшоў у імправізаваны штаб, строс з балонні ваду і, агледзеўшыся, заўважыў, што ў вялікім намёце застаўся толькі капелан. Згорбіўшыся над кацялком, святар моўчкі макаў бульбу ў расплаўлены сыр:*

*— А я больш люблю з хлебам! — гучна заявіў радавы.*

*— Няма нічога смачнейшага за фандзю з грушай... — не падымаючы вачэй, адказаў капелан.*

*Празяблы радавы зрабіў некалькі крокаў да цэнтра намёта, узяў каву і абвясціў, што эвакуацыя скончаная — усе дамы пустыя:*

*— Нялёгкі быў тыдзень, але наша армія паказала сябе з найлепшага боку: які бы разбуральным ні быў апоўзень — ніхто не пацярпіць!*

*Радавы ганарыўся сабой і чакаў пахвалы святара.*

*— Вы сказалі, што эвакуявалі ўсіх — значыць, у вас атрымалася пераканаць і яго?*

*— Вы пра таго звар'яцелага коміка?*

*— Я не думаю, што ён вар'ят...*

*— Не, ён пажадаў застацца ў сваім шале. Мы эвакуявалі ўсіх, апрача яго.*

*Чалавекам, пра якога гаварылі радавы і капелан, быў вядомы стэндап-комік. Некалькі гадоў таму ён пераехаў у вёсачку і з тых часоў вёў пустэльніцкі лад жыцця. Часам, абмяркоўваючы панурыстага суседа, мясцовыя жыхары ўспаміналі, што некалькі гадоў таму мужчына прыехаў не адзін, а з вельмі прыгожай жанчынай, якая, зрэшты, зусім хутка пакінула вёску і больш не з'яўлялася.*

*Калі тыдзень таму геолагі папярэдзілі, што апоўзень, які спыніўся акурат над вёскай, у найбліжэйшы час абавязкова знішчыць усё і ўсіх, ваўкаваты мужчына быў адзіным жыхаром камуны, які адмовіўся пакідаць свой дом.*

*— Быць можа, у будучыні, — заявіў адзін з геолагаў, — мы навучымся прадказваць час сходу з дакладнасцю да хвіліны, але пакуль на календары ... год, мы здольныя гаварыць толькі пра тое, што катастрофа непазбежная — вам трэба неадкладна пакідаць вёску!*

*— Але я не магу, — спакойна адказаў комік.*

*— Ці магу я пацікавіцца чаму? — з павагай і зацікаўленасцю запытаў геолаг.*

*— Я чакаю званка...*

*“Напэўна, важны званок!” — жартавалі ў экстранным штабе паліцэйскія і вайскоўцы, вырашаючы, ці варта рызыкаваць людзьмі, каб арыштаваць коміка дзеля яго ж дабра.*

*“Напэўна, сапраўды важны...” — падумаў капелан і папрасіў даць яму магчымасць пагаварыць з мужчынам.*

*Разважылі, што горш не будзе, аднак параілі спяшацца: дом коміка стаяў на ўскраіне вёскі і ў выпадку сходу апоўзня аказаўся б пад тонамі камянёў і зямлі першым.*

*У тую ясную раніцу надвор’е было надзіва мірным, і, падымаючыся пад гару, палкавы святар думаў, што, цалкам магчыма, усё абыдзецца.*

*“Апоўзень усё жыццё будзе навісаць над вёскай і зробіцца для мясцовых жыхароў своеасаблівым вулканам, які штохвілінна будзе нагадваць пра марнасць быцця”.*

*Грукацца не давялося — з двума кубкамі кавы ў руках вядомы комік сустрэў святара на лужку перад домам:*

*— Я ўбачыў вас здалёку, святы айцец. Прыйшлі мяне ўгаварыць?*

*— Хацеў пагутарыць з вамі...*

*— Вы дзейнічаеце ў інтарэсах бога ці дзяржавы?*

*— Бог любіць нашу краіну...*

*Капелан зрабіў некалькі глыткоў і, пераведўшы позірк на масіўны каменны вужлак, які вырас над домам, запытаў:*

*— Чаму вы не хочаце пакінуць свой дом?*

*— Я ўжо казаў вашым клапатлівым сябрам з паліцыі, што чакаю званка...*

*— Быць можа, вы маглі б перанесці размову на іншую дату ці пагаварыць з суседняй вёскі, куды апоўзень не дойдзе?*

*— Не, дарагі капелан, яна сказала, што перазвоніць на гэты нумар...*

*— Хто яна, калі я магу запытаць?*

*— Мая любая...*

*— Вы адмаўляецеся пакідаць вёску, бо чакаеце званка ад каханай жанчыны?*

*— Так, святы айцец.*

*— Ці магу я задаць вам яшчэ адно пытанне?*

*— Вядома, дарагі капелан...*

*— А як даўно ваша любая абяцала вам перазваніць?*

*— 675 дзён таму...*

*Капелан зноў паглядзеў на гару, якая, хаця і заварожвала, ніяк не дацягвала да таго, каб аднойчы быць адлюстраванай на паштоўцы, якую мужчына, сумуючы па жанчыне, апускае ў жоўтую паштовую скрыню:*

*— А чаму б вам самому ёй не патэлефанаваць?*

*— Яна сказала, што ёй трэба пабыць адной...*

*У тую раніцу капелан больш нічога не запытаўся, падзякаваў за каву і развітаўся. Спускаючыся долу, святар думаў, што каханне — бясцэнны дар, а гэты камедыйны акцёр, без усякіх сумневаў, вельмі шчаслівы ў сваім няшчасці чалавек.*

*Паведаміўшы генералу, што ўгаварыць мужчыну не атрымалася, капелан выслухаў некалькі салдацкіх*

*жартаў, але зачапіўся толькі за словы маёра, што сядзеў побач, які паведаміў усім прысутным, што:*

*— Напэўна, гэты комік — крэпкі хлопец. Даўно вядома, што маўчанне і ігнараванне чалавека прыраўноўваецца да фізічных катаванняў — мы, у разведцы, звярталіся да гэтага спосабу толькі ў самых рэдкіх выпадках...*

*Цяпер, калі прамоклы наскрозь салдат саграваўся кавай, капелан падумаў, што трэба яшчэ раз патэлефанаваць няшчаснаму мужчыну і паспрабаваць выратаваць яго:*

*— Ці маглі б вы перадаць мне тэлефон, радавы?*

*— Думаю, што ў гэтым няма неабходнасці, ураган пашкодзіў кабелі, тут няма сувязі...*

*— Чакайце, але калі пашкоджаная тэлефонная лінія — значыць, яна не здолее патэлефанаваць яму? — раптам усвядоміўшы ўсю цяжкасць і горыч сітуацыі, прамовіў капелан.*

*— Можна падумаць, яна збіралася, — з'едліва сказаў радавы.*

*— Безумоўна! — абрэзаў святар. — Трэба неадкладна аднавіць сувязь!*

*— Дзеля аднаго чалавека?*

*— Дзеля дваіх!*

*Не чакаючы новага злога досціпу, капелан схапіў накідку і адправіўся ў бок шале. Цяпер, узбіраючыся на гару, ён думаў не пра мужчыну, які чакаў званка, але пра яго каханую: "Які боль скоўвае яе? Што надае ёй сілы не тэлефанаваць?"*

*Пагрукаўшыся, капелан штурхнуў дзверы і пабачыў гасцёўню, якую асвятлялі некалькі свечак:*

*— Хочаце віна, дарагі капелан?*

*— Надвор'е пагаршаецца. Я прыйшоў сказаць, што тэлефонная лінія пашкоджаная. Нават пры вялікім жаданні ваша любая не зможа дазваніцца. Думаю, вам трэба праявіць разважлівасць і спусціцца ўніз.*

*— Бадай, вы маеце рацыю, дарагі капелан...*

*Пакорлівасць, з якой раптам загаварыў вядомы комік, усцешыла і адначасова засмуціла святара. Страх? Пакора? Адчай?*

*Мужчыны выйшлі на вуліцу і яшчэ нейкі час, быццам назаўсёды развітваючыся з вёскай, спрабавалі разгледзець гару, што патанала ў цемры. Нарэшце вядомы комік узяў капелана пад руку, і абодва моўчкі рушылі ўніз па слізкім гравіі.*

*Дождж узмацняўся, неба асвятлялі маланкі, і грымеў гром. Вецер свістаў з новай сілай, ва ўнісон ветру гуў лес, але нават гэты хор не мог заглушыць трэль тэлефоннага званка, што прагучала над вёскай...*

*Дык гэта яна звоніць?* **Соня**

*Не, думаю, правяраюць сувязь...* **Добры самаранін**

Неахайнае (*валасы на твары чалавека, 8 па гарызанталі, 8 літар*). Некалькі тыдняў Павел не выходзіць з дома. Поўнае знішчэнне і адмена — анігіляцыя. Штодзень боль, быццам моль, праядае

дзірку ў грудзях. Прывід без замка, цмок без прынцэсы. Павел ведае, што павінен дзейнічаць і праганяць сланоў, што ў гэты самы час жывёлы працягваюць руйнаваць горад, аднак, быццам акрабат, які сарваўся і атрымаў траўму, ён не знаходзіць у сабе сіл падняцца з ложка і пакінуць мансарду. Рэшка без арла, сучаснасць без будучыні.

Гараванне Паўла так здзіўляе сланяня, што тое пераходзіць з маленечкай гасцёўні ў спальню і прапіхваецца паміж ложкам і сцяной. Калі Павел заплюшчвае вочы, сланяня звяртаецца да яго:

— Гавары з ёй, яна чуе цябе!

— Як, калі мы нават не размаўляем?

— Ведаеш пра (*непадзельная порцыя якой-небудзь велічыні ў фізіцы, 15 па вертыкалі, 5 літар*)? Гэта называецца “квантавая заблытанасць”, — тлумачыць сланяня, — з’ява ў квантавай фізіцы, калі дзве субатамныя часціцы застаюцца глыбока звязанымі, нават калі іх падзяляюць мільярды светлавых гадоў.

— Атамы, якія раней узаемадзейнічалі, працягваюць уплываць адзін на аднаго, нават калі іх раздзяліць?

— Менавіта! Яна ўсё-ўсё чуе, Паш, не сумнявайся!

— І ўсю маю любоў, і ўсе мае жарты?

— І нават тое, як ты цяпер храпеш...

Прачнуўшыся, Павел плача.

Некалькі тыдняў ён не можа есці. Слязлівы клоўн. Перавярнуўшыся на спіну, загарадзіўшы ўвесь свет тэлефонам, ён гадзінамі перачытвае паведамленні і лісты ад Ганны. Павел глядзіць

на жоўты бранзалет, які яна яму падарыла. На зашпільцы выгравіраваныя першыя літары ўсіх гарадоў, у якіх яны паспелі пабываць. Іх шмат. Павел успамінае кожны. Быццам ажыўляючы відэа, ён уваскрашае моманты на беразе мора, калі яны балбаталі пра разважлівасць і цуды, пра мастацтва і пра гісторыю. Ён успамінае, як яны чыталі гараскопы і смяяліся, як абдымаліся і цалаваліся. Павел успамінае твар Ганны: сонны, румяны, з кудзеркамі і сабранымі назад валасамі, твар сумны і з усмешкай, твар светлы і родны.

У гэтыя дні ён носіць толькі дзве майкі, тыя, што яны разам выбіралі. Павел успамінае, як разам яны прымяралі іх і як Ганна зноў і зноў цалавала яго ў прымерачнай, забіраючыся, быццам кручком, кончыкам языка пад яго верхнюю губу. Павел успамінае цяпер, як гадзінамі яны адгадвалі сотні пытанняў у крыжаванках:

— Гатунак мяккага тлустага сыру, які ўзнік у Нармандыі? Дванаццаць па гарызанталі, восем літар.

— Лёгка!

— Гэта таксама лёгка! Тры па вертыкалі, шэсць літар: адлюстраванне ідэальнага грамадскага ладу ў мінулым ці ва ўяўнай будучыні...

Павел успамінае, што Ганна любіць параўноўваць людзей з крыжаванкамі.

“Мы такія ж супярэчлівыя. У нас пераплятаюцца самыя дзіўныя рэчы і словы. Мы складаныя. Кожны чалавек — адна толькі напалову, а то і менш, разгаданая крыжаванка”.

Павел спрабуе зразумець, у якім слове зрабіў памылку.

*Яго памылка ў тым, што ён не адчуваў, што яна яго ніколі не кахала.* **Ананім**

Каханне не выдрэсіраваць. Час спыняецца, любая выпырхвае з клеткі, і, не спраўляючыся з расстаннем, Павел успамінае кожны ліфт, у якім яны весела фатаграфаваліся, як у фотабудках. Адну за другой Павел прагортвае фатаграфіі, якія прыходзілі дзень пры дні, і не можа зразумець, у які момант усё пайшло не туды. Стараючыся знайсці ўласную памылку, ён перабірае прычыны:

“Магчыма, справа ў тым, што я напалохаў яе сваім каханнем? Што многа патрабаваў? Што хацеў дзяцей? Што занадта часта пісаў? Не, справа ў тым, што я бедны, што ніколі не змагу падтрымліваць яе ўзровень жыцця... Ці, быць можа, прычына ў тым, што быў занадта шчыры з ёй і маю чуласць яна прыняла за слабасць? Усе гэтыя людзі, з якімі яна камунікуе ў сваіх балотах, усе гэтыя мужычыны, ірвачы і міністры, няўжо і шчырасць маю яна прыняла за слабасць? Няўжо мне трэба было быць грубым, як увесь гэты зброд, няўжо трэба было мацюкацца, гаварыць як яны, каб Аня адчувала, што на мяне можна спадзявацца, што я паспяховы і моцны? Няўжо і сапраўды яна так уяўляла сабе смеласць? Не, не, не!”

*Па ходу, і праўда трэба было, а то хулі цыцкі мяць?* **Антон**

*Для мяне гэты момант падаўся вельмі непраўдападобным! З аднаго боку, аўтар апісвае нам героя, які гатовы змагацца з сістэмай, а з іншага боку, ляжыць дома і рыдае праз нейкую не самую відную дзеўку...* **Топавы прыхільнік**

*Я хачу сказаць (!!!), што ваш Добры самаранін выкладвае не ўсе часткі кнігі!!! Я чытала друкаваную версію і тут чамусьці не пабачыла ўрыўкаў, у якіх аўтар апісвае Ганну. З таго, што я прачытала на форуме, складаецца ўражанне, што яна амаль адмоўны персанаж, а між тым Павел жа закахаўся ў яе не проста так!!! У яе абсалютна цудоўнае сэрца! Ганна вясёлая, дасціпная, начытаная, сапраўды таленавітая акторка! У яе ўвогуле дзве вышэйшыя адукацыі! Яна мудрая, вельмі правільная, калі гаворка пра каштоўнасці! Хіба тут, на форуме, вы ўсё гэта чыталі?! Між іншым, у кнізе гэтаму прысвечана адразу некалькі раздзелаў! Так, у Ганны ёсць свае страхі, так, яна сапраўды не можа цалкам рэалізаваць сябе, бо з самага дзяцінства жыве ва ўмовах, калі ў гэтым няма неабходнасці, але гэта і мучыць яе!* **Соня**

*Дык наадварот гэта вельмі крута, што ён у яе закахаўся, у лянівую, у пустую, у такую, якая яна тут! Каханне — яно ж выпадковасць, яно ніякім чынам не можа падпарадкоўвацца логіцы!* **Ананім**

*Ну... я не выкладаў тут урыўкі пра яе, бо асабіста мне падалося, што яны не вельмі ўплываюць на сюжэт, і наогул мне падаецца, што гэтая кніга ўсё ж не пра каханне, а пра тое, што сланы прыйшлі ў горад. Любоўная лінія тут, мне падаецца, так, для жанчын...* **Добры самаранін**

*Слухайце, як вы ўсе не разумееце, што яна кідае яго роўна праз тое, што не можа рэалізаваць сябе?! Для яе ж гэта момант, калі яна прад'яўляе сябе свету і даказвае самой сабе, што яна хоць штосьці сабой уяўляе! Гэтая Аня не можа адарваць сраку ад канапы, каб уладкавацца на працу, не можа нічога зрабіць, затое яна можа ўзяць і кінуць*

*добрага і вядомага хлопца! Хіба не ўчынак? Хіба не падзея ў жыцці без падзей? Гэтае расставанне — самарэалізацыя і самасцвярджэнне для яе!* **ТваяDomina2022**

*Божа, якая лухта!* **Невядомы карыстальнік**

*Усё з ёй абсалютна зразумела. У яе комплексная дзіцячая траўма. На жаль, з гэтым трэба працаваць гадамі. Справа ў тым, што калі з гэтай траўмай не працаваць — у арганізме адбываюцца хімічныя працэсы, як у наркаманаў, калі трэба знаходзіць боль, каб ён паўтараўся. Справа ў тым, што ціхае шчасце для такіх людзей, як Ганна, — страшна. У добрых стасунках у адзін момант ёй робіцца смяротна нудна, таму яна шукае таго, хто будзе мучаць яе. Прыніжэнне патрэбнае ёй, як наркаману доза, таму яна і выбірае не самых добрых людзей накшталт кінапрадзюсара, пакідаючы Паўла.* **Тэрапеўт. Запіс на кансультацыю па тэлефоне — Спасылка выдаленая ў сувязі з правіламі суполкі**

*Насамрэч гэтая кніга пра тое, што людзі баяцца жыць, баяцца змагацца, баяцца выказвацца, баяцца быць падобнымі да сваіх маці, баяцца ўпасці з каня, баяцца прызнаваць відавочнае, баяцца прызнацца ў здрадзе, баяцца парваць з наркаманам, баяцца пакутаваць, баяцца трапіць у аварыю, баяцца згубіць грошы, якія можна зарабіць на фільме, баяцца паставіць коску не там, баяцца сесці не на свае месцы ў цягніку, баяцца зайсці ў халодную ваду, баяцца змяняць свет вакол сябе, баяцца быць чулымі, баяцца арандатараў, баяцца медуз, баяцца спяваць на вуліцы пры мінаках і не аплачваць праезд, баяцца дыхаць, баяцца спазніцца, баяцца прыйсці раней, баяцца ісці прэч з дрэннай п’есы ў сярэдзіне спектакля, баяцца памыліцца, баяцца ўказаць на памылку, баяцца верыць, баяцца крытыкаў і каментатараў, баяцца хадзіць на бацькоўскія сходы, баяцца абараняць свае межы, баяцца пераязджаць, баяцца не баяцца, баяцца ўладкавацца на працу, баяцца стрэмкі, баяцца турбулентнасці, баяцца, што яна ніколі*

*больш не патэлефануе, баяцца прызнацца, што ён усё ж такі той, хто ёй трэба, баяцца вайны, баяцца падацца чуллівымі, баяцца перасаліць, баяцца гаварыць на іншай мове з памылкамі, баяцца ўзяць у рукі лямпачку, баяцца прызнацца ў рэстаране, што ежа дрэнная, баяцца, што адчытае трэнер у фітнес-клубе, баяцца эскалатараў, баяцца, што не ўстане, баяцца, што будзе недастаткова цвёрдым, што іншы зробіць гэта лепш, баяцца сабак, баяцца напісаць, баяцца пагаварыць, баяцца быць сумленнымі, баяцца прачытаць тое, што ён напісаў, баяцца парушыць дарожныя правілы, баяцца адкласці дрэнныя кнігі, баяцца прапусціць удар, баяцца сфальшывіць, баяцца не ўгадаць памер і баяцца па-сапраўднаму кахаць...*
**Сафія**

ЗУСІМ САКРЭТНА

Міністру ўнутраных спраў

У сувязі з вашым распараджэннем тэрмінова падрыхтаваны тры тысячы ложка-месцаў у бальніцах, а таксама значна павялічана колькасць хірургічных аддзяленняў.

Падрыхтаваны неабходныя медыкаменты.

Мабільныя моргі разгорнуты і гатовы да эксплуатацыі.

Атрады спецыяльнага прызначэння прыведзены ў баявую гатоўнасць.

Меркаваныя маршруты руху сланоў акрэслены і падрыхтаваны.

Для ўнутранага карыстання

Праз некалькі тыдняў Павел нарэшце кажа сабе: “Усё, хопіць! Кахаеш? Кахай яе, радуйся за яе, чакай яе, спадзявайся на сустрэчу і размову, пакуль сэрца будзе біцца, — кахай, але ўставай і рабі тое, што мусіш!”

Павел рассылае паведамленні паплечнікам і папярэджвае, што пачынаецца актыўная фаза дзеянняў, аднак перад тым, як перайсці да агаворанага плана, ён павінен папярэдзіць Чорную самку.

Ангар, як заўсёды, адчынены. Са зменаў тут толькі тое, што над сланіхай, быццам бы спецыяльна, вісяць доўгія калыскі, якіх ён раней не заўважаў. Падышоўшы да Чорнай самкі ўшчыльную (цяпер яна не баіцца яго), перад тым, як расказаць свой план, ён гладзіць яе хобат. Павел рыхтуецца выкласці свае думкі, аднак у гэты момант у ангары загараецца асляпляльнае святло і зверху чуецца знаёмы голас:

— Гэта ж трэба, якія людзі!

Падняўшы галаву, Павел бачыць у калысцы Макса.

— А мы, па шчырасці, думалі, што ты, Павёлка, яшчэ пакутуеш!

— Гэта не ваша справа!

— І што ты ў ёй знайшоў, га? Ані душы, ані сцёгнаў! — паклаўшы рукі ў чорных пальчатках на поручні, са злоснай усмешкай гаворыць Макс.

— Калі вы хочаце працягваць абразы, чаму б вам не спусціцца да мяне і не пагаварыць як мужчына з мужчынам?

— Ах, пакінь гэтыя зухаватыя размовы для народа! І ўсё ж, што прымушае цябе даравацць ёй здрады?

Пытанне гэтае б'е, як маланка. Павел адчувае, быццам бы разрад электрычнасці праходзіць праз грудную клетку.

"Не! Не! Не! — зараз жа гаворыць сабе Павел. — Ты не можаш ні секунды сумнявацца ў любай, ты не можаш паддавацца хлусні! Ты ж сам ведаеш, што Ганна ніколі б табе не здрадзіла! Ты ж сам ведаеш, што калі б яна захацела быць з кімсьці іншым, то не падманула б цябе, а прызналася б ва ўсім! Яна сумленны чалавек! Ты ж ведаеш яе! Бачыш, як лёгка засумнявацца ў любай! Вось і зразумей цяпер, як цяжка было ёй, калі яна глядзела ўвесь той бруд, што вылівалі на цябе!"

— Няўжо табе ўсё роўна, Паш? Няўжо ты заплюшчыш вочы на тое, што зусім нядаўна яна гаварыла табе, што кахае, а цяпер ужо куляецца з іншым, ведаючы, як табе цяжка, ведаючы пра ціск на цябе? Няўжо табе патрэбная жанчына, якая выбірае маўчуна, што падтрымлівае нас?

— Я не веру вам! Аня б ніколі так не зрабіла!

— Хочаш паглядзець на відэа ці на фатаграфіі?

— Хачу забіць цябе! — крычыць Павел і рвецца да лесвіцы, але выскокваюць некалькі паліцэйскіх, збіваюць яго з ног і валяць на зямлю.

— Ты дурань! — усё гэтак жа ганарыста, насалоджваючыся сабой, быццам выступаючы з трыбуны, працягвае Макс. — Усе праблемы ў жыцці праз такіх, як ты! Табе здаецца, што ты бачыш больш,

але ты сляпы як крот! Твая мілая здраджвае табе з наркаманамі-прадзюсарамі, а ты ўсё ўзносіш яе да нябёсаў!

Павел зажмурваецца і стараецца не слухаць. Ён ведае, што да яго Ганна сапраўды сустракалася з нейкім хлопцам са свету кіно, але...

"Не! Не! Не! Яна б так не зрабіла, яна гаварыла, што кахае мяне, яна знаёміла мяне з бацькамі, яна б, у рэшце рэшт, прызналася, што хоча быць з іншым чалавека, — гэта ж нескладана! Так робяць сумленныя людзі, а яна менавіта такая! Гэта ж так проста сказаць: Паша, я вяртаюся да іншага чалавека. Ганна ніколі б не стала хлусіць!"

— Ты думаў, што ёй трэба клопат, але яна, як і яе маці, сузалежная! Ёй трэба, каб на яе плявалі! Ты клапаціўся пра яе, паказваў, якім можа быць сапраўднае каханне, але яна блакуе цябе і бяжыць за тым, каму нахер не патрэбная. Паш, твая любімка выбрала чувака, які нават не гаўно, а проста насрана!

— Сволач! — спрабуе пракрычаць Павел, але паліцэйскі бот з усёй моцы прыціскае яго да бетону.

— Я ўсяго толькі агучваю табе факты, мой дарагі...

Макс на імгненне змаўкае. Павел не можа павярнуць галаву, але разумее, што некалькі чалавек штосьці рыхтуюць у тым месцы, дзе стаіць Чорная сланіха.

— Пачынайце! — загадвае Макс, і Павел чуе, што жывёлу чымсьці абліваюць. Павел спрабуе

павярнуцца, але нага яшчэ мацней прыціскае яго да зямлі. Паўла апаноўвае жах. Спачатку ён адчувае пах бензіну, а праз секунду чуе, як некалькі каністраў з характэрным гукам стукаюцца аб бетон.

— Павярніце яго! — загадвае Макс.

Павел усё яшчэ прыціснуты да зямлі, але цяпер, калі хтосьці падымае яго галаву за валасы, бачыць аблітую бензінам Чорную самку. Жывёла, здаецца, не разумее, што зараз адбудзецца, і прымае паліва за брудную ваду, а ўсё, што адбываецца, — за лазневыя дурыкі.

— Прашу вас, не рабіце гэтага!

— А мы і не хацелі, але цябе ж было не спыніць!

— Прашу вас!

Макс дастае запальнічку, якую Ганна калісьці падарыла Паўлу, шчоўкае і кідае ўніз. Павел крычыць, але бот некалькі разоў з усёй моцы б'е яго па зубах.

Жывёла загараецца і торгаецца з месца. За секунду языкі полымя дабіраюцца ад ног да хобата, і, палаючы, сланіха пачынае хаатычна бегаць па ангары, разносячы ўсё на сваім шляху і палохаючы паліцэйскіх, якія чакаюць цяпер каманды ад Макса, што стаіць у калысцы. Жывёла ярасна раве і ломіць палеты.

— Хадзем!

Сланіха падае на бок, акурат на каністры з бензінам, якія пад яе вагой раздушваюцца, і пажар разгараецца з новай сілай. Палае. Павел, якога пачынаюць падымаць і адцягваць, адчувае жудасны смурод і бачыць, як слановая скура трэскаецца

і лопаецца, выпускаючы вонкі страшную вадкасць. Сланіха працягвае люта і роспачна выць, спрабуючы ўстаць на ногі, але полымя не дае ёй падняцца. Павярнуўшыся, Павел бачыць, што цяпер гарыць ужо большая частка склада, і пажарная сігналізацыя, спрацаваўшы, пачынае заліваць яго. Нягледзячы на гэта, полымя хутка перакідваецца са скрыні на скрыню. Пахне куродымам і гарам. Ангар награваецца і напаўняецца едкім, невыносным дымам...

Выцягнуўшы Паўла з ангара, яго заштурхоўваюць у паліцэйскую машыну, і Макс загадвае паведаміць дзяржаўным журналістам, што забойца Чорнай сланіхі затрыманы на месцы злачынства.

*Асабіста мне ў гэтай сцэне чагосьці не хапіла. Можна было б прапісаць яе і лепей…* **Невядомы чытач**

*Ой, слухай, ідзі ты нахер!* **Аўтар**

Сланы выходзяць на світанку. Магутнасць жалобы. Апошняя даніна. Велічная працэсія: вялікія і малыя, самцы і самкі, з кватэр, з паркаў, з музеяў і канцэртных залаў, павольна, але мэтанакіравана і пакорліва, гордай чарадой, тужліва, жывёлы ідуць да месца, дзе загінула Чорная сланіха і куды кожны цяпер нясе ў хобаце сарваныя кветкі.

Адзіная плынь. Шматгалосае маўчанне. Горад гатовы, ён нібы прыглушаны.

Перакрытыя ўсе вуліцы і праспекты, што вядуць у порт. Аднак наўрад ці знайшоўся б цяпер

вар’ят, які рызыкнуў бы перашкодзіць сланам у жалобе. Без малітваў, усхліпаў і слёз, адзін за адным, велічна, за крокам крок, тысячы жывёл у смутку брыдуць да месца спаленага ангара, дзе ад кінутых паверх папялішча гваздзікоў, быццам раскіданыя па свежай сакавітай траве яркія кропелькі крыві, узвышаецца кветкавы курган.

З усяго горада тысячы сланоў тупаюць да месца спачыну Чорнай самкі, і годнасць, з якой яны развітваюцца з загінулаю, зачароўвае. Дэманструючы салідарнасць, якой людзі могуць толькі пазайздросціць, сланы ідуць бясконцаю чарадой. Вялікі, бясконцы смутак няспыннай плыні. У цішыні ранку сланы ўсё ідуць і ідуць. Яны падыходзяць да магілы, ускладаюць кветкі і схіляюць свае велізарныя галовы.

Над згарэлым ангарам вісіць некалькі верталётаў (адзін паліцэйскі і тры — тэлевізійныя). Прыпаўшы да экранаў, людзі глядзяць на павольнае шэсце сланоў у жывым эфіры, і тыя дарослыя, якім пашчасціла жыць на патрэбных вуліцах, ставяць дзяцей на падаконні, калі жывёлы праходзяць паўз іх дамы, каб будучыя пакаленні назаўжды захавалі гэты неймаверны момант у сваёй памяці.

Ганна глядзіць жывы эфір разам з бацькамі і думае, што ненавідзіць Пашу.

Усклаўшы кветкі, сланы не сыходзяць з порта. Так, у радыусе дзясятка кіламетраў, няма цяпер аніводнага пустога ўчастка, які не займала б ціхая жывёла ў журбе.

Журналісты, якія вядуць рэпартаж з месца падзей, мяркуюць, што на гэтым цырымонія павінна скончыцца, але запрошаныя ў студыю заолагі тлумачаць, што наперадзе яшчэ некалькі дзён аплаквання, бо сланы, як і людзі, развітваюцца цяжка і доўга.

Так і адбываецца. Жывёлы не сыходзяць. Нібы ўкапаныя, быццам помнікі журбы і памяці, сланы застаюцца на сваіх месцах і цяпер пачынаюць трубіць пра боль. Некалькі дзён без перапынкаў, нібы сірэна трывогі, слановым плачам над горадам безупынна цягнецца балесная нота страты, трываць якую з кожнай секундай усё цяжэй і цяжэй.

Ганна безупынна рыдае — ёй вельмі шкада сябе.

Пра гэта не гавораць па тэлевізары, але перадаюць з вуха на вуха: тут і там, не здолеўшы знесці праяўленне жывёльнага гора, разрываюцца і спыняюцца чалавечыя сэрцы, не ўяўна, а сапраўды. Раніцай, апоўдні і на захадзе сланы не маўчаць пра сваё гора.

Толькі на сёмы дзень раптам запаноўвае цішыня. Людзі прыліпаюць да вокнаў і выдыхаюць з палёгкай. Дарма. Сланы ўстаюць на ногі. Пачынаецца тое, пра што ведаюць заолагі і сілавікі, але не папярэджваюць ані дыктары, ані журналісты. Жывёлы пачынаюць помсціць, руйнуючы ўсё на сваім шляху. Натуральны, без дамешку, гнеў. Адплата веліканаў. Усё гэтак жа павольна і паслядоўна яны растоптваюць усё, што трапляецца пад ногі. Машыны, газетныя кіёскі і крамы.

Дарожныя знакі, святлафоры і фантаны. Там-сям у горадзе пачынаюцца пажары, але ніхто цяпер не адважваецца выбегчы на вуліцу, каб патушыць іх. Пажарныя брыгады атрымалі загад заставацца ў частках і не перашкаджаць помсце. Крок за крокам, метр за метрам сланы руйнуюць горад. Кара. Быццам на шампуры, на біўні насаджваюцца рэкламныя плакаты і бяздомныя сабакі, платы і дзеці, што няўчас выбеглі на вуліцу. Сланы равуць і крышаць дамы, затоптваюць цагліны і жыцці. Быццам цяжкія бізуны, хобаты б'юць па дахах мікрааўтобусаў і галовах маці, па вокнах і лёсах. Над горадам узнімаецца пыл і дым. Сланы хапаюць жанчын і мужчын, шпурляюць іх на зямлю і пасля засыпаюць пяском. Жывёлы, якія ідуць следам, не пераступаюць ужо нежывых грамадзян, і праз некалькі хвілін, утаптаныя ў зямлю, раздушаныя чалавечыя целы нагадваюць роставыя фанерныя фігуры. З чырвонымі ад крыві нагамі, жывёлы замешваюць пунсовую фарбу ў зямлю, і няма цяпер сілы, якая была б здольная і жадала б іх спыніць.

Назіраючы за гэтым з акна свайго кабінета, міністр унутраных спраў загадвае ўсім падраздзяленням быць у баявой гатоўнасці, але без загаду не рушыць з месца. Слановаму маршу не перашкаджаюць. Гараджане ведаюць, жывёлы бяруць сваё — вока за вока, зуб за зуб.

Увесь час атрымліваючы зводкі, Макс ведае, што на дадзены момант ахвярамі слановага маршу зрабіліся не менш за некалькі тысяч чалавек — дакладную лічбу назваць складана, але,

выглядае, прадказальнікі з аналітычнага аддзела мелі рацыю.

“Трэба будзе іх прэміраваць”, — думае міністр.

Да вечара жывёлы вяртаюцца ў дамы. Ганна ўсё яшчэ глядзіць трансляцыю, калі заходзіць іх слон. Ён павольна праходзіць у гасцёўню і прымае звыклую позу. Ганна ўпершыню ўстае з канапы і падыходзіць да жывёлы, каб пагладзіць яе. Ёй хочацца прынесці слану вады і папрасіць прабачэння.

Быццам прусакі, па горадзе разбягаюцца агенты тайнай паліцыі. Аблава. Ідучы па спісе, які быў даўно і старанна складзены, аднаго за адным яны затрымліваюць Пашавых паплечнікаў. (*17 па вертыкалі, 5 літар*)! “Заказаных здраднікаў” шпікі павінны прынесці ў зубах, нібы палку.

Пакуль агенты тайнай паліцыі надзвычай добра робяць сваю працу, у горад уваходзяць вайскоўцы. Выдатна падрыхтаваныя, яны складаюцца з трох-чатырох рот (*25 па гарызанталі, 8 літар*). Каля кожнага слана стаіць цяпер некалькі салдат у камуфляжы, якія яго ахоўваюць.

Дзяцей зноў ставяць на падаконнік. Тым, каму яшчэ ўчора паказвалі сланоў, цяпер загадваюць глядзець на суседзяў, якіх запіхваюць у паліцэйскія машыны: “Запомні, гэта яны ва ўсім вінаватыя!”

Разумеючы, што напалоханым грамадзянам трэба выплюхнуць эмоцыі, міністр унутраных спраў выдае таемнае распараджэнне не перашкаджаць самасудам, аднак патрабуе данесці да кожнага жыхара сталіцы, што перад тым, як пачаць паляванне на ворагаў народа, трэба перавесці

дух і выслухаць зварот Лідара нацыі, які вось-вось выступіць.

З'явіўшыся ў кадры, кіраўнік дзяржавы выказвае самыя шчырыя спачуванні: складана ўявіць, што ў гэтыя хвіліны адчуваюць жывёлы, якія страцілі свайго лідара. Несамавіты чалавек заяўляе, што ў сувязі з забойствам Чорнай сланіхі краіна сутыкнулася з сапраўдным выклікам, аднак дзеянні жывёл зразумелыя, і такія трагедыі, на жаль, часам здараюцца. Трэба заставацца моцнымі і перацярпець. Лідар нацыі заяўляе, што забойца Чорнай сланіхі знойдзены і паўстане перад судом. Акрамя таго, запэўнівае кіраўнік дзяржавы, будуць арыштаваныя і ўсе яго супольнікі, чые дзеянні прывялі да таго, што адбылося.

У другой частцы выступу Лідар нацыі заяўляе, што ў сувязі з тым, што здарылася, узнікла вострая неабходнасць унесці праўкі ў Канстытуцыю, для чаго будзе арганізаваны агульнанацыянальны рэферэндум. Кіраўнік дзяржавы перакананы, што Артыкулы 2 і 3 патрабуюць дапрацовак. З гэтага моманту (калі, вядома, грамадзяне падтрымаюць яго ініцыятыву) гэтыя палажэнні будуць гучаць так:

**Артыкул 2.** *Чалавек і слон, іх правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы.*

**Артыкул 3.** *Адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту з'яўляюцца народ і сланы. Народ і сланы ажыццяўляюць сваю ўладу непасрэдна,*

*праз прадстаўнічыя і іншыя органы ў формах і межах, вызначаных Канстытуцыяй.*

Акрамя гэтага, Лідар нацыі цвёрда перакананы, што дзяржаўныя сімвалы (сцяг, герб, гімн) павінны зазнаць некаторыя змены.

Пакуль Ганна глядзіць зварот кіраўніка дзяржавы, збітаму да паўсмерці Паўлу прад'яўляюць абвінавачванні:

*Наўмысныя дзеянні, скіраваныя на ўзбуджэнне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці ці розні, на прыніжэнне нацыянальнага гонару і годнасці. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 або 2 гэтага артыкула, якія былі ўчыненыя групай асоб або прывялі па неасцярожнасці да смерці чалавека/слана або іншых цяжкіх наступстваў.*

*Распальванне варожасці.*

*Здзяйсненне выбуху, падпалу, затаплення, іншых дзеянняў агульнанебяспечным спосабам, або дзеянняў, якія ствараюць пагрозу гібелі людзей, прычынення ім цялесных пашкоджанняў або надыходу іншых цяжкіх наступстваў, з мэтай уздзеяння на прыняцце рашэнняў органамі ўлады, або перашкоды палітычнай або іншай грамадскай дзейнасці, або запалохвання насельніцтва, або дэстабілізацыі грамадскага парадку (акт тэрарызму).*

*Арганізацыя групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак і звязаныя з яўным непадпарадкаваннем законным патрабаванням*

*прадстаўнікоў улады або якія прывялі да парушэння працы транспарту, прадпрыемстваў, установ ці арганізацый.*

*Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, (або) актыўны ўдзел у іх.*

*Стварэнне экстрэмісцкага фарміравання. Здрада Радзіме.*

Раніцай пятніцы, як і павялося, Аляксандр ідзе ў Міністэрства ўнутраных спраў. Нягледзячы на жалобу, якая пануе ў горадзе, Макс выглядае як ніколі ўзрушаным. Ён вельмі рады бачыць бацьку і, адклаўшы чарговае данясенне, якое (для большай аб’ектыўнасці) цяпер складае выключна штучны інтэлект, адразу працягвае Аляксандру келіх з шампанскім:

— Ну, пра што твой раман сёння?

— Да, шчыра кажучы… неяк няма ідэй апошнім часам…

— Сапраўды? Чаму?

— Усе гэтыя падзеі крыху ціснуць на мяне… Не вельмі разумею, пра што і як можна пісаць, калі адбываюцца такія рэчы…

— Хіба штосьці асаблівае адбылося?

— Глабальна, напэўна, не, але ўсё ж…

— Можа быць, напішаш пра мяне? Як думаеш, я мог бы стаць героем твайго рамана?

— Я ніколі пра гэта не думаў, але, калі задумацца, напэўна, так, цалкам…

— Як бы ты мяне апісаў, тата?

— Думаю... як чалавека, які здолеў захаваць парадак у краіне ў такі складаны час...

— Дакладна! Гэта вельмі трапна, тат! Упэўнены, гэты раман мог бы атрымаць шмат літаратурных прэмій!

— Ты сапраўды так лічыш?

— Вядома! Нам цяпер вельмі патрэбныя правільныя тэксты з мараллю, з сапраўднымі героямі!

— Тады, можа быць, я сапраўды за яго вазьмуся?

— Не адкладай! Ну што ты стаіш? Прашу да стала!

Падчас абеду звыкла абмяркоўваюць спорт і тэатр. Пачынаюць з лёгкіх закусак і тэлебачання, пераходзячы да балета і літаратуры. Пасля канапэ, тартару, салата і супу падаюць асноўную страву. Некалькі кухараў уносяць падносы, і Аляксандр, які ўжо ўявіў сабе вялікую літаратурную прэмію, значна павесялеўшы (магчыма, і ад шампанскага), гучней, чым звычайна, пытае:

— Ну-с, якое сёння мяса?

— Сланіна... — спакойна адказвае Макс.

Спачатку Аляксандр крыху разгублены, а праз імгненне, усвядоміўшы пачутае, зусім шакаваны.

— Чакай, гэта ж не?..

— Гэта ж не што?

— Не Чорная самка?

— Не, што ты, яна згарэла дашчэнту! Гэта сланяня. Было ў кватэры гэтага прыдурка. Мяса сланянят куды далікатнейшае. Я папрасіў і патушыць, і пасмажыць, каб ты мог параўнаць. Вось яшчэ хобат, глядзі, адварны. Ты ж раней не каштаваў?

— Ніколі...

— Пачні тады проста з бакоў. Можа злёгку гарчыць, адчуваюцца ноткі медзі, але ў цэлым нашы кухары робяць вялікія поспехі, бо мяса, трэба сказаць, няпростае, да яго трэба прылаўчыцца!

Аляксандр асцярожна надразае першы кавалачак і кладзе ў рот.

— Ну як?

— Насычанае...

— Так, у ім больш калагену. Але ты моцна не наядайся таксама — яшчэ сэрца пададуць (Аляксандр не будзе яго есці, але аднясе сэрца слана ў ланчбоксе Ганне).

Увесь абед вядомы пісьменнік не разумее, як правільна сябе паводзіць. Сланяня яму чамусьці шкада. Не адну сотню разоў выпісваючы персанажаў, Аляксандр разумее, што сын правярае яго, і калі не помсціць, то ўжо дакладна, як і ў кожны іншы раз, хоча зачапіць, каб нагадаць пра крыўду, якую нясе праз жыццё.

“Нам бы, напэўна, трэба калі-небудзь паразмаўляць, высветліць усё, не можа ж гэта так цягнуцца вечна”, — думае Аляксандр, але ў каторы раз не наважваецца. Выпіўшы лікёры і каву, ён устае, спадзеючыся, што гэты не самы прыемны (нягледзячы на абяцаную прэмію) абед нарэшце скончыцца, аднак на развітанне сын уздымае яшчэ адну тэму:

— І яшчэ: я вырашыў ажаніцца з Ганнай.

— Ты жартуеш?!

— Не, я ніколі не жартую — праца не дазваляе.

— Але гэта ж будзе...

— Гэта будзе што? Дваццаць чатыры па вертыкалі?

Аляксандр адчувае разгубленасць. Ён абураны. Яму хочацца насварыцца на сына, але ён ведае, што не мае на гэта права. Галава ідзе кругам. Вядомы пісьменнік намагаецца нешта сказаць, але, здаецца, цэлую вечнасць не знаходзіць патрэбных слоў, пакуль, нарэшце, не чапляецца за ратавальную банальнасць:

— А яна кахае цябе?

— Аня? Яна не мысліць такімі абстрактнымі катэгорыямі. Добра, тату, прабач, сам разумееш — справы дзяржаўнай важнасці! Я паведамлю вам пра дзень вяселля.


АРТАЗМ
ЗЛОСЦЬ
ШЧАЦІННЕ
РАЯЛЬ
КАМАМБЕР
ВЯРБЛЮД
АПАХАЛА
АРХЕТЫП
БАТАЛЬЁН
СЦЭНА
ТРАФАМАН
ЭСЭІСТ
ФОРЗАЦ
ТАНДЭМ

*Ну вось тут і зрабілася зразумела, што Пашу канец...* **ТваяDomina2022**

*Гэта яшчэ чаму?* **Невядомы чытач**

*Паглядзіце на крыжаванку і на цэнтральнае слова, да якога аўтар вёў увесь раман! Зірнуўшы на гэтае слова і на магчымыя варыянты, зусім нескладана здагадацца, чым усё скончыцца!* **ТваяDomina2022**

*Але мы ж яшчэ нават не ведаем пытання?* **Арына-балерына**

*А тут ужо і не трэба ведаць пытанне! Шэсць літар. Другая "ш", пятая "о". Як вы ўжо ведаеце, я дыпламаваны этымолаг, словы — мая спецыяльнасць. Дык вось, тут у нас не так ужо і шмат варыянтаў. Усяго чатыры: "ішачок", адмірал Ушакоў... Наўрад ці маленькі ішак ці гістарычная асоба будуць у кульмінацыі... Так што гэтыя словы мы адкідаем, так?* **ТваяDomina2022**

*Так, а якія яшчэ два словы?* **Ананім**

*Эшалон і эшафот...* **ТваяDomina2022**

*Але, можа быць, абыдзецца проста эшалонам? Можа быць, яго этапуюць у якую-небудзь дальнюю турму?* **Арына-балерына**

*У якую, калі ўсе цягнікі стаяць?* **ТваяDomina2022**

Ганна доўга глядзіць у люстэрка. Нібы трафарэты, яна накладае на ўласны твар успаміны розных гадоў. Тут, у куточках вачэй, калісьці не было зморшчын, тут, каля скроняў, не было сівых пасмаў. Ганна разглядае ўласнае адлюстраванне і думае, як дзіўна ўладкаваны

гэты свет: усе заўжды ўсё ведаюць пра цябе. Аднакласнікі ведаюць, што ты за аднакласніца, сяброўкі, што ты за сяброўка, былы муж — што за жонка. Суседзі ведаюць, якая ты суседка, крытыкі — якая ты акторка. Фінансавая паліцыя ведае, які ты грамадзянін, гінеколаг — якая жанчына. Па адной выпадкова кінутай фразе ў кавярні або на запраўцы афіцыянты ці касіры ўжо ведаюць, што ты за фрукт.

Мінакі ведаюць, што ты за гараджанка, чытачы — што за персанаж, і толькі два чалавекі, якія не маюць аніякага ўяўлення пра цябе... гэта толькі ты і Паша.

Апынуўшыся ў камеры, Павел здзіўляецца яе памерам. “Як дзіўна, — думае комік, — людзі дагэтуль баяцца трапіць за краты, хоць тут куды больш свабоды, чым на вуліцы!” У камеры няма слана.

Увесь дзень койка прышчэпленая да сцяны. Павел можа хадзіць туды-сюды і нават сядзець на крэсле, калі да яго прыходзіць адвакат.

— Як мне да вас звяртацца? — пытае Павел.

— Клічце мяне Добры самаранін.

— Мяркуючы па ўсім, справы мае не вельмі, так?

— Калі быць шчырым, горш, чым вы думаеце. Да абвінавачання дадалі артыкул аб тэрарызме. Вам пагражае смяротнае пакаранне. Больш за тое, на цэнтральнай плошчы ўжо ўзводзіцца эшафот, праўда, чамусьці круглы...

— Круглы?

— Так, калі шчыра, ён больш нагадвае цыркавую арэну.

— Адпавядае духу часу...

— Ага...

— Значыць, мне засталося ўсяго некалькі тыдняў?

— Не думаю. Па-першае, суд пачнуць толькі пасля рэферэндуму, па-другое, я збіраюся змагацца за вас. Раскажыце мне ад самага пачатку ўсё, што здарылася ўчора.

— Я пайшоў у ангар, каб папярэдзіць Чорную самку пра свой план. Я хацеў растлумачыць ёй, што жыццё ў горадзе зробіцца для сланоў зусім непрыдатным, што колькасць пчол, якія з'явяцца ў сталіцы ў найбліжэйшыя дні, дакладна іх не парадуе. Апрача таго, я хацеў паказаць ёй маршруты міграцыі і расказаць пра рэзервацыі, якія мы плануем пабудаваць...

— Так, далей...

— Далей у ангары з'явіўся міністр унутраных спраў.

— Міністр?! Вы ўпэўнены, што ні з кім яго не пераблыталі?

— Так.

— Хтосьці можа пацвердзіць, што ён там быў?

— Вядома! Там было чалавек дваццаць паліцэйскіх! Усе яны могуць пацвердзіць мае словы!

— Сумняваюся... Так, і што адбылося далей?

— Ён пачаў абражаць Аню, мяне. Потым нехта падпаліў сланіху, я дрэнна бачыў, бо мяне прыціскалі тварам да бетону і толькі ў апошні

момант задралі галаву за валасы, каб я ўбачыў, як палае жывёліна...

— Следчы сцвярджае, што сланіха была падпаленая вашай запальнічкай...

— Як яна магла да іх трапіць?

— Гэта я ў вас хацеў спытаць...

— Я не ведаю, але вам не здаецца дзіўным, што ўвесь склад выгараў, а запальнічка — не?

— Мне ў гэтай справе шмат што здаецца дзіўным...

— Я не забіваў яе!

— Я ведаю. Значыць, вы сцвярджаеце, што гэта зрабіў міністр унутраных спраў?

— Так.

— Навошта?

— Каб падставіць мяне і растлумачыць людзям, што ўсе беды не ад сланоў, а ад такіх, як я. Вы мне не верыце? Вы ж усё самі чыталі!

— Чытаў...

— Дык чаму сумняваецеся ўва мне?

— Не столькі сумняваюся, колькі думаю над тым, як вам дапамагчы... Як думаеце, ці ёсць вядомыя людзі, якія б маглі паручыцца за вас?

— Не ведаю, можа быць, бацька Ганны?

— Ён будзе сведкам абвінавачвання.

— Абвінавачвання?!

— Так. Вам трэба падрыхтавацца да гэтага і трымаць удар. Магчыма, хтосьці яшчэ?

— Не ведаю, напэўна, хтосьці з комікаў...

— Наўрад ці яны здолеюць здабыць прыхільнасць суддзі...

— Прынамсі, скажуць нешта смешнае...

— Паверце, Павел, смяшыць, на жаль, будзе збольшага ён. І яшчэ, вас моцна збілі — нам трэба напісаць скаргу.

— Не хачу.

— Зразумела. Хочаце, каб я штосьці перадаў вашым бацькам?

— Не.

— Камусьці яшчэ?

— Так, перадайце, калі ласка, вось гэты ліст маёй дзяўчыне...

У першыя дні прыходзіць і следчы. Парушаючы правілы, без адваката. Зрэшты, навошта ён гэта робіць — не зусім зразумела. У адрозненне ад абаронцы, следчы ніякіх пытанняў не задае. Гэтаму чалавеку, здаецца, усё даўно вядома і зразумела, таму ён толькі глядзіць на Паўла, ківае сам сабе і, штосьці запісаўшы, выходзіць.

Падчас гадзінных шпацыраў Павел думае пра Ганну. Застаўшыся сам-насам з сабой і небам у кратах, ён увесь час размаўляе з ёй. Мінае месяц, два, але няма аніводнага дня, калі б ён не сказаў ёй “Добры дзень, карантыша!” або “Добрых сноў, мілая!”, няма аніводнага шпацыру, падчас якога ён не гаварыў бы з ёй. Згадваючы словы сланяняці, Павел спадзяецца, што, нягледзячы на маўчанне, Ганна пачуе яго і не будзе хвалявацца. Ён расказвае пра свае сны, у якіх цалуе яе, і пра будні, у якіх марыць пачуць яе голас. У гэтыя месяцы ён хоча яе супакоіць, сказаць, што ёй зусім няма пра што турбавацца,

што ён у выдатных умовах і ўсё будзе добра. Павел думае, што Аня, напэўна, трывожыцца за яго...

Калі скрыпіць і адчыняецца акенца камеры, Павел спадзяецца, што наглядчык перадасць яму ліст ад каханай, але адказ не прыходзіць. Павел жа піша кожны дзень — Добры самаранін забірае пачку лістоў раз на тыдзень, але ў адказ нічога не прыносіць. Павел баіцца спытаць, ці бачыў адвакат яе ў горадзе. Паўлу страшна даведацца, што яна гуляе з кімсьці іншым:

*Мілая карантыша, на жаль, у гэтыя дні ў нас няма магчымасці размаўляць, таму я хацеў напісаць, што люблю глядзець, калі ты размаўляеш з іншымі людзьмі. Люблю, калі ты першай, быццам бы выпадкова, цалуеш мяне. Люблю глядзець, як ты чысціш зубы, люблю смятану, калі яна разам з тваімі сырнікамі. Люблю, калі твае шчокі чырванеюць ад перападу тэмператур і люблю прытуляцца да цябе і слухаць, як б'ецца тваё сэрцайка.*

*Мілая Аня, я так люблю радзімку на тваім сярэднім пальцы! Я люблю ўткнуцца ў тваю патыліцу, люблю колер тваіх валасоў, люблю сустракаць цябе ў аэрапорце і не люблю праводзіць цябе ў аэрапорт. Я люблю цябе ў ваўняных шкарпэтках, люблю твае вочы і пігментную плямку крыху ніжэй. Люблю, дастаючы карткі з кашалька, штораз натыкацца на тваё фота, люблю, калі майка падкрэслівае абрысы тваіх вытанчаных грудзей! Я люблю, калі ты чхаеш, люблю, калі ты ў сінім пінжаку, люблю, калі ты без сіняга пінжака. Люблю, калі ты сонная,*

*калі робіш наша сэлфі, калі грукаеш па стале, як па барабане, прамымі далонькамі. Мілая Аня, я так люблю слова "жывы" ў тваёй татуіроўцы, люблю фотаздымкі, на якіх ты глядзіш на мяне, і вельмі люблю фотаздымкі, на якіх гляджу на цябе! Я люблю глядзець, як ты чытаеш, люблю, калі спіш на маім плячы ў цягніку ці ў самалёце, люблю думаць пра цябе і разумець, што існуе яшчэ адно вялікае аўтаномнае "люблю/кахаю" без усялякіх спадарожных дзеясловаў, але, паколькі ў гэтыя дні мы не можам пагаварыць, пра ўсё гэта я, на жаль, пакуль табе не раскажу...*

Павел, здаецца, усё менш цікавіцца справай. Калі прыходзіць адвакат, Павел задае ўсяго два пытанні: як там Ганна і ці пайшлі сланы?

Добрых навін Добры самаранін не мае. Сланы на месцы. Пра Ганну ён нічога не ведае (*хлусня*).

Міністр Ганне, у прынцыпе, падабаецца. Першае спатканне праходзіць добра. Ён зразумелы, прадказальны і паспяховы. Букет дорыць безгустоўны, але пярсцёнак дарагі. З брыльянтам. Будзе што паказаць сяброўкам і выкласці ў інстаграм — твараў каханых Ганна не пасціць. Пакуль...

Ад Макса вее моцай і ўладай. Размаўляючы з ім, Ганна думае, што ён не будзе плакаць у канцоўцы фільмаў і завальваць тэлефон паведамленнямі з пытаннямі "Мілая, куды ты знікла, я хвалююся!". Стасункі добрыя, упэўненая Ганна, калі людзі самадастатковыя. Навошта ёй мужчына, які пастаянна хвалюецца за яе? Ганне патрэбныя камфорт,

прадказальнасць і свабода. Гэты Макс дакладна не будзе ліпнуць да яе, як Паша. У яе застанецца шмат часу на сябе, да таго ж Макс ёй роўня — гэта выключае вялізную колькасць праблем, якія былі б з бедным выкладчыкам філасофіі і комікам. Побыт, упэўненая Ганна, разбурае прыхільнасць.

Тое, што Паша цяпер у турме, напэўна, нават добра. Ва ўсялякім выпадку, гэта многае вырашае. Былы не будзе вечна тэлефанаваць, патрабаваць тлумачэнняў і стаяць пад дзвярыма. Усе апошнія дні Ганна моцна баялася, што Павел зноў апынецца на ганку яе вілы і зацягне свой цяжкі маналог закаханага. Гэта некамфортна, думае Ганна. Не яе віна, што не атрымалася. Можа, яна і хацела б, але...

Ганна ніколі не была адна. З пятнаццаці гадоў яна заўсёды ў стасунках. Без паўзаў. Прагнучы свабоды, Ганна абавязкова з кімсьці. Заслужаны майстар сузалежнасці, Ганна ўпэўненая, што заўсёды кахала. Кахала хлопца ў школе, кахала яшчэ аднаго пасля і, так, кахала кінапрадзюсара, па якога ездзіла па ўсім горадзе, каб выцягваць яго з прыбіральняў. Калі з’явіўся Павел, Ганна была несвабодная, але, спалохаўшыся, што згубіць цудоўнага новага хлопца, хутка ўсё скончыла з папярэднім. Ганна ўмее абсякаць канцы. Ганне не ўласціва шкадаваць. Галоўнае — не быць адной.

У пачатку іх стасункаў ёй не знесла дах, як Пашу, і яна гэтым вельмі цешылася. Ганне здавалася, што тое, што ёсць, — куды лепш і мацней за нейкія дурацкія матылькі ў жываце. Далей, як ёй цяпер падаецца, адбылося наступнае: Паўлам

апанавала ідэя вечнага, сусветнага, неймавернага кахання і блізкасці, якой ёй увесь час даводзілася крыху падыгрываць. Ганна адчувала, што ў стасунках з Паўлам у яе не было магчымасці праявіць сябе, бо як толькі яна рабілася сабой, гэта быццам пагражала вялікаму пачуццю. Цяпер яна не ўпэўненая, што гэта гучыць пераканаўча, але як ужо атрымліваецца — яна так адчувала. І гэта цалкам знясільвала і пазбаўляла стасункі той чароўнасці, якая ёй была патрэбная. Карацей, вердыкт такі: "Калі ўвесь час трэба адпавядаць вялікай ідэі — незразумела, калі кахаць..."

Ганна мяркуе, што з Максам праблем не будзе: ён зразумелая партыя, да таго ж яна ўжо так доўга адна, таму вяселле спраўляюць у той самай царкве, дзе адпявалі Памазка, на фоне ўсё таго ж беласнежнага слана. Макс стаіць у чорным мундзіры, увешаным узнагародамі, Ганна — у вельмі прыгожай і дарагой сукенцы. Яна сабрала валасы так, як любіць Паша.

Прыніжаны Аляксандр бялейшы за слана. Сафія не можа стрымаць слёз. Вось ужо шмат гадоў як яна ведае ўсё пра пазашлюбнага сына мужа. Святар блаславўляе закаханых і пасля ўрачыстай цырымоніі запісвае ў сваім дзённіку:

*І гаворыць Госпад: "Пасаромеліся б!" — і Адам, і Ева адчуваюць сорам. "Добра, давайце апранайцеся!" — фыркае Госпад і кажа ім адляпіцца адно ад аднаго. Абое слухаюць, і следам за гэтым адбірае Бог у Евы імя яе і ўсыпляе Адама. І калі Адам засынае,*

*Госпад расчляняе Еву, і замешвае так, што застаец-ца толькі рабро, і ўспорвае грудзі Адаму, і вяртае яму рабро гэтае. І Бог забірае імёны скаціны, і птушак нябесных, і ўсіх звярэй палявых, і гаворыць Госпад Бог: "На гэтым этапе чалавеку будзе добра аднаму, і калі хочаш — можаш паесці яблыкаў, Адам". І Адам есць. І калі ж Адам даядае, Госпад выпісвае яго з Эдэмскага саду і забірае імя ў ракі Яўфрат. Услед за гэтым безыменнымі робяцца Тыгр, Геон і Фісон. І перастае Рай аброшвацца. І вырубае Госпад усе дрэвы (і дрэва жыцця, і дрэва пазнання, і дрэва зла). І, здавалася б, можна на гэтым спыніцца, але дзе там: Госпад клі-ча да сябе Адама і гаворыць: "Прабач, чувак, усё гэта было дрэннай выдумкай". І Госпад крэміруе Адама. І робіць так, што апускаецца пара і больш не падымаецца над усёй Зямлёй. І, разабраўшыся з людзьмі, Бог бярэцца за зямлю, якую тут жа высушвае, і выкарчоўвае ўсялякую траву, і кустоўе, і адмяняе выходныя. І не робіцца сёмага дня, і застаецца шэсць. І бачыць Бог, што ўсё, што ён стварыў, не вельмі. І пакуль ёсць раніца, і яшчэ ёсць вечар. І забірае Госпад ежу ў жывёл, і забірае душы іх сабе, і забараняе ўсялякім стварэнням размнажвацца, і дэбласлаўляе іх. І не становіцца чалавека, і ні мужчыны, і ні жанчыны, і не становіцца звярэй зямных і гадаў. І шостага дня, дарэчы, таксама не становіцца. І пачынаюць падаць птушкі з неба, і вада робіцца мёртвай. І канчаецца дзень пяты, а за ім і чацвёрты. І затухаюць свяцілы. І зліваюцца дзень і ноч. І не становіцца ні дзён, ні гадоў. Ні зямлі, ні неба, ні мораў. І калі быць да канца шчырым —*

*наогул нічога не пакідае Госпад, акрамя сябе і цемры над безданню. І зірнуўшы вакол, прамаўляе Госпад: “Вось так лепей”...*

І Ганна цалуе Макса.

Пра тое, што яна выйшла замуж, Павел не ведае. Добры самаранін змяркоўвае, што гэтая інфармацыя перашкодзіць яго кліенту засяродзіцца на абароне, і таму кожны раз прапаноўвае канцэнтравацца выключна на працэсе. Добры самаранін прадказвае, што змагацца будзе даволі складана, і ўсё ж: на першым этапе галоўная задача — пазбегнуць смяротнага пакарання, а калі ўжо гэта атрымаецца — можна будзе працаваць далей.

— Вы маглі б перадаць гэты ліст Ганне?

— Але ж гэта чысты аркуш?

— Менавіта! Вы маглі б запакаваць яго ў канверт і перадаць ёй? Яна адкрые яго і зразумее, што я прапаную пачаць усё спачатку...

— Добра, — адказвае Добры самаранін і не можа прызнацца нават у тым, што Ганна не чытае лістоў.

ЗУСІМ САКРЭТНА

Міністру ўнутраных спраў

Дакладная запіска аб вынясенні
прысуду грамадзяніну П.

У сувязі з вашымі даручэннямі праведзеныя тлумачальныя гутаркі са сведкамі абвінавачвання, пракурорам і суддзямі. Агучаныя і замацаваныя стратэгіі паводзін падчас працэсу, а таксама дакладна прагавораны прысуд (копія ў дадатку).

Для службовага карыстання

Капітуляцыя чалавека. На працягу наступных некалькіх месяцаў сланы канчаткова захопліваюць горад. Цяпер яны паўсюль, у прамым і пераносным сэнсе. Жывёлы стаяць на разбураных вуліцах і ў разрабаваных дамах, красуюцца на пачках цыгарэт і на футбольных эмблемах, на этыкетках газіроўкі і на паштовых марках, што клеяць на канверты, якія нікуды не ляцяць. Саколкі з нашытымі слонікамі прадаюцца лепш, чым з кракадзіламі, машыны з біўнямі на капотах, на якіх, зрэшты, нікуды не з'ехаць, цэняцца вышэй за маркі з коньмі, узнятымі дубка, — Аляксандр цяпер купляе толькі першыя. Рэкламныя афішы і туалетная папера, цыферблаты гадзіннікаў і кававаркі, хвасты нерухомых самалётаў і трафарэты на святлафорах — усё цяпер упрыгожваюць жывёлы, што захапілі горад: чырвоны слон — стой, зялёны — ідзі!

У рэшце рэшт пасля паспяховага рэферэндуму жывёлы з'яўляюцца ў Канстытуцыі, чаканяцца на манетах, вышываюцца на сцягах і друкуюцца на пашпартах, вокладкі якіх цяпер упрыгожвае герб з двухгаловым сланом.

Справа зробленая. Адказныя за праўкі ў Канстытуцыі атрымліваюць велізарныя прэміяльныя, і ўсё гатова да першага пасяджэння суда. Добры самаранін у апошні раз перад пачаткам працэсу наведвае Паўла ў камеры:

— Я маю адно пытанне: вы памятаеце, у чым быў міністр?

— Не асабліва. Здаецца, як заўсёды, у гэтым сваім скураным мундзіры. Памятаю, што ў яго былі чорныя пальчаткі.

— У вас добрая памяць і вялікія шанцы на перамогу!

— Чаму? — быццам прачнуўшыся ад шматмесячнай дрымоты, пытаецца Павел.

— Таму што адну ён згубіў!

— Дзе вы яе знайшлі?

— У ангары. Я з'ездзіў на папялішча і знайшоў яе там.

— Здаецца, яна моцна абгарэла.

— Так, але гэта не перашкодзіць нам даказаць, што міністр быў там!

— Вы ўпэўнены, што яна яго?

— Мяркуючы па фотаздымках з парадаў — так.

— Значыць, цяпер у мяне ёсць шанец?

— Яшчэ які! Цяпер мне трэба паехаць у офіс, бо я хачу перапісаць усю прамову, а вам прапаную яшчэ раз перагледзець усе адказы і, па магчымасці, з улікам новых абставінаў, перарабіць апошняе слова, добра?

— Так! — натхнёны, Павел сядае за маленькі драўляны стол:

*Паважаны суд!*

*Я нарадзіўся ў 1984 годзе. У тры гады быў подла аддадзены бацькамі ў дзіцячы садок, дзе спазнаў на сабе ўдары шырокай далонню і раз і назаўжды разлюбіў рыбныя катлеты. Пасля садка я паступіў ва ўніверсітэт. Паміж універсітэтам і садком была*

*школа, якая дала мне самыя важныя навыкі ў жыцці любога мужчыны — чаўночны бег і чытанне па ролях. Трэба сказаць, што мая настаўніца рабіла ўсё, каб я зненавідзеў літаратуру. Тануць было весялей, чым яе слухаць, аднак, нават нягледзячы на гэта, кнігі я заўжды лічыў крыніцай узбагачэння — мама хавала ў іх грошы... Трэба сказаць, што я рос у вельмі небагатай сям'і. З нерухомасці ў нас быў толькі п'яны бацька, што вечна ляжаў на канапе. У дзяцінстве было шмат смутнага, таму я пачаў жартаваць. Дапамагаць мне не было каму, і таму я паступіў ва ўніверсітэт, дзе стаў вывучаць філасофію і паралельна займацца стэндапам — адным словам, адправіўся ў доўгае падарожжа ў бок беднасці. Я вучыўся думаць, сумнявацца і пісаць жарты. Я спазнаваў наш складаны свет і, як мне падаецца, штодзень стараўся зрабіць яго на кропельку лепшым. Я не чыніў зла. Паважаны суд, сёння я хачу сказаць, што мне заўсёды верылася, што я змагу зрабіць нашу планету крыху больш свядомай і вясёлай. Я не ідэаліст. Я не думаў, што змагу ўсё выправіць, але ў той жа час заўсёды свята верыў, што здолею хоць бы не зрабіць яе горшай. Я разумею, наколькі малы чалавек, але ўсё ж часам у нас атрымліваецца штосьці змяніць вакол сябе. Усе гэтыя гады я вельмі верыў, што каханне і смех — менавіта тое, што ўсім нам патрэбна. І сёння, паважаны суд, я хачу прызнацца, што вельмі закаханы! Упэўнены, гэта немагчыма не заўважыць! Вось ужо некалькі гадоў я адчуваю самае цудоўнае пачуццё, якое дадзена чалавеку. Яно акрыляе і дапамагае ў цяжкія моманты. Яно дапамагае мне цяпер і дае веру! Паважаны суд,*

*калі б вы толькі бачылі яе, то зусім бы не сумняваліся, што ў мяне цяпер столькі сіл, што я змагу вызваліць горад і зрабіць так, каб усе мы былі шчаслівыя! Паважаны суд, як вы цяпер ведаеце, я не падпальваў сланіху! Я абяцаю, што ў найбліжэйшы час вызвалю горад, а цяпер вельмі прашу адпусціць мяне, бо вельмі хачу патэлефанаваць любай...*

— А калі яна не адкажа? — пытаецца моль, якая села на край стала.

— Ты сёння раней, чым звычайна. Нешта здарылася?

— Так, мяне выклікалі, бо трэба праесці твае грудзі наскрозь — раніцай я вылезу са спіны.

— Упэўненая?

— Так, — ледзь паспявае сказаць моль, і дзверы камеры адчыняюцца. Двое наглядчыкаў коцяць тачку, на якой стаіць старая, танная відэадвойка. Як хлеб у тостар, паклаўшы касету ў тэлевізар, адзін з наглядчыкаў садзіць Паўла насупраць экрана і прымацоўвае наручнікамі да крэсла.

Паўлу паказваюць вяселле. Некалькі гадзін запар. Потым яшчэ раз, і яшчэ. Госці, сталы і царква. Шлюбная сукенка, тосты і шампанскае. Смокінгі і сукенкі. Танец маладых, пацалункі і кіданне букета для дружак. Разразанне торта, выступленні вядомых артыстаў і святочны феерверк. Павел плача і ўсміхаецца: карантыша такая прыгожая і шчаслівая! Ёй так пасуе гэтая прычоска! Макс сядзіць побач і адным пальцам накручвае Ганне кудзеры...

Моль пачынае...

*Калі я чытала гэты ўрывак, вельмі шкадавала, што я не магу пагаварыць з Паўлам. Толькі ўявіце сабе, якой магла б быць сусветная літаратура, калі б у нас была магчымасць размаўляць з галоўнымі героямі?! Мне так хацелася сказаць яму: Паша, ты быў шчыры, ты кахаў яе, клапаціўся і аддаваў, і цяпер ты ўсяго толькі губляеш чалавека, які не выбраў цябе, — яе страта значнейшая…*
**Ніка**

Усю ноч Павел думае, што правільна зрабіць. Працягваць за яе змагацца ці адпусціць? Расказаць ёй, хто насамрэч яе новы каханы, ці прамаўчаць? Моль павольна разгрызае грудзі, і, да самай раніцы размаўляючы з сабой, Павел надумвае, якія паводзіны годныя для таго, хто кахае.

У рэшце рэшт, калі кахаеш, думае ён, павінен адпусціць.

“Я павінен паважаць яе выбар і перастаць трывожыць! У яе новае жыццё. Яна не хоча быць са мной, і гэта адзінае, што мне трэба пачуць...”

Калі яго заводзяць у жалезную клетку, усталяваную ў ~~балагане~~ раскошным палацы правасуддзя, бадзёры і рашуча настроены адвакат адразу падыходзіць да Паўла і бярэцца за пруты. Да пачатку працэсу застаецца яшчэ некалькі хвілін, і Добры самаранін вырашае, што гэта добрая магчымасць у апошні раз усё абгаварыць:

— Добры дзень, Павел! Ну як вы? Гатовы? Не сумнявайцеся, сёння мы разнясём іх!

— Я не буду нічога гаварыць...

— Чаму?! Нешта здарылася ноччу?! Яны катавалі вас?

— Чаму вы не расказалі мне пра Аніна вяселле?

Добры самаранін на імгненне азіраецца і глядзіць на Макса, які якраз у гэты момант займае месца ў першым шэрагу, акурат побач з вялізным сланом, што пацешна ўладкаваўся на лаўцы.

— Слухайце, я проста не хацеў вас засмучаць. Вы цяпер вельмі ранімы, а нам трэба быць засяроджанымі! Што значыць, вы не будзеце гаварыць? Няўжо вы не хочаце, каб справядлівасць перамагла?

— Вы не ўяўляеце, якая яна была шчаслівая на відэа! Я заўсёды марыў, каб яна была менавіта такой! Разумееце, я яе вельмі кахаю! Няма нічога важнейшага за яе радасць і спакой! Я не хачу рабіць ёй балюча, не хачу, каб яна падумала, што я помшчу ці перашкаджаю яе каханню...

— Ды якому каханню, Павел?! Паўгода таму яна кахала вас, цяпер яго. Прабачце, але калі яна даведаецца, хто ён — адмовіцца ад яго гэтак жа лёгка, як кінула вас.

— Я ўбачыў, што яна любіць яго...

— Яна не любіць нікога, акрамя сябе, і калі вы чамусьці хочаце, каб аднойчы гэтая жанчына вярнулася да вас — вам трэба быць моцным, а не адступаць! Ёй патрэбны пераможца, а не паражэнец! За кратамі павінен быць Максім, а не вы!

— Я не прайграю, проста раз яна яго пакахала — я не хачу сведчыць супраць яго...

— Выдатна! Гэта зраблю я! Паслухайце, Павел, яны знішчаць вас, і тады ўжо дакладна не будзе ніякага шанца ўз’яднацца з любай. Калі вы кахаеце яе, то проста мусіце дажыць да моманту, калі

яна зразумее, што вы галоўны мужчына ў яе жыцці!

— Ніколі яна гэтага не зразумее...

— Павел, я бачу, што вам цяпер вельмі балюча, але гэта ўсяго толькі жанчына! У вас наперадзе ўсё жыццё! Вы яшчэ знойдзеце цудоўную спадарожніцу, якая будзе сапраўды кахаць вас, а не ўцячэ, як толькі на даляглядзе з'явяцца праблемы і нязручнасці. Я ж усё прачытаў! Хіба было штосьці, што вы не гатовы былі выправіць?

— Не...

— Вось менавіта! Перастаньце вінаваціць сябе! Гэта не вы вінаваты ў тым, што ў вас такія бацькі, не вы вінаваты ў тым, што збалаваная жанчына не ацаніла вас, не праз вас прыйшлі сланы! Заклінаю вас, будзьце разважлівым! Нельга губіць уласнае жыццё праз распешчаную лайдачку!

— Вы нічога пра яе не ведаеце! Яна — самы цудоўны чалавек, якога я калі-небудзь сустракаў!

— Самы цудоўны чалавек знайшоў бы магчымасць пагаварыць з вамі перад судом! Самы цудоўны чалавек, нават калі б захацеў пакінуць вас, знайшоў бы смеласць пагаварыць, а не развітаўся б лістом. Самы цудоўны чалавек не блакаваў бы вас. Расплюшчыце ўжо нарэшце вочы! Ёй пляваць на вас! Вы былі для яе проста прахадной інтрыжкай! Ёй было нудна. Даруйце, я не хачу рабіць вам балюча, але я ваш адвакат — мая мэта абараніць вас! Калі цяпер вы адступіце — значыць, іх план спрацуе! Хочаце пакутаваць — пакутуйце, але рабіце гэта на волі, а не ў турме!

— Я не хачу ставіць пад сумнеў яе каханне...

— Яе каханне перманентнае, толькі мужчыны змяняюцца, без паўзаў! Вы хочаце, каб яна была з мярзотнікам?

— Так, калі з ім ёй лепш, чым са мной...

Добры самаранін спрабуе спехам знайсці іншыя аргументы, але ў гэты момант яго перапыняюць гучныя словы: “Устаць, суд ідзе!”

Маленькі чалавечак у чорнай мантыі, трымаючы ў руках дзясятак тоўстых тэчак, займае сваё важнае месца акурат пад гербам з двухгаловым сланом. Суддзя вітаецца, вітае тэлегледачоў, якіяназіраюць за судом у жывым эфіры, і пачынае працэс.

Пакуль маленькі чалавечак гаворыць, камера паказвае Паўла, які стаіць у клетцы. Ланцугі скоўваюць яго рукі і ногі, а таксама злучаныя з заржавелым нашыйнікам, зашчоўкнутым на шыі. Гледачы могуць быць спакойныя: абвінавачаны не ўцячэ.

Сафія зрабіла папкорн. Ганна абдымае падушку і сядае побач.

“Бацька выбраў абсалютна ідыёцкі гальштук”, — апярэджваючы з’яўленне Аляксандра, гаворыць яго верная жонка.

Суддзя правярае яўку бакоў і вызначае іх асобы. Акрамя таго, ён пацвярджае, што падстаў для пераносу пасяджэння няма.

Пасля гэтага камічны стары аб’яўляе, якая справа разглядаецца, і зачытвае абвінаваўчае заключэнне. Суддзя пытае абвінавачанага, ці прызнае

ён сваю віну, і пасля доўгай паўзы, пераглянуўшыся з адвакатам, Павел нарэшце кажа:

“Не!”

“Ну, вядома!” — як серыял, каментуе Сафія.

“Зразумела”, — сабе пад нос мармыча стары і прапануе перайсці да вывучэння доказаў. Сафіі цікава, а Ганне пакуль трывожна, але нудна.

Першымі выступаюць сведкі абвінавачання — паколькі бацькі не могуць ісці самі, іх цягнуць паліцэйскія. П’яныя сваякі патрэбныя, вядома, не для таго, каб праясніць сітуацыю, але для таго толькі, каб прадэманстраваць тэлегледачам, што ў гэтага хлопца праблемы са спадчыннасцю. Маці Паўла ўсміхаецца і нешта мямліць. Бачна, што, нягледзячы на паўнепрытомны стан, да суда яна рыхтавалася і нават паспрабавала прыбрацца. Усе дарагія падарункі сына даўно прапітыя, таму замест бранзалетаў яна абкручвае рукі прыгожымі стужкамі ад падарункавых упаковак — адзінае, што не прымаюць у ламбардзе. Бацька ўвесь час правальваецца ў сон, таму паліцэйскія пастаянна штурхаюць яго.

Вялікі правакатар, Макс упэўнены, што такое прыніжэнне выведзе Паўла з раўнавагі, але памыляецца. Калі вясельнае відэа сапраўды зрабіла яму балюча, то п’яныя бацькі даўно не выклікаюць ніякіх асаблівых эмоцый. Шмат гадоў Павел адчувае віну, спрабуе вылечыць маму і тату, спрабуе ўсе вядомыя спосабы, аднак у рэшце рэшт здаецца, разумеючы, што толькі яны самі могуць дапамагчы сабе. Калі вашы бацькі алкаголікі — вам

даводзіцца развітвацца з імі яшчэ пры жыцці. “Нука, сынок, прынясі мне яшчэ гарэлачкі ў труну!” Жывыя мерцвякі. Павольнае падзенне блізкіх людзей можа цягнуцца дзесяцігоддзямі, і яны будуць піць да апошняй бутэлькі (дарэчы, за гэтае выступленне ім абяцалі дзве!). Карпатура — але не больш за тое. Павел нават не злуецца на іх. Выбар кожнага чалавека — выпраўляць свае памылкі ці не. Павел верыць, што чалавек здольны выпраўляцца. Ганна — не.

Калі робіцца зразумела, што далей дапытваць бацькоў не мае аніякага сэнсу, а людзі ў зале іх высмейваюць, суддзя прапануе выклікаць наступных сведак.

Да трыбуны выходзіць Аляксандр. Атракцыён. Здаецца, на першыя некалькі пытанняў ён адказвае з хваляваннем, аднак досвед бярэ сваё — ну колькі разоў ён выступаў на банкетах і ўручэннях прэмій?!

Расслабіўшыся, Аляксандр зазначае, што грамадзянін П. самым хітрым чынам убіўся ў ласку яго сям’і і шмат месяцаў дурыў галаву яго дачцэ, расказваючы ёй пра пачуцці, якіх ніколі не меў. Даведаўшыся, што Чорная сланіха была спаленая, Аляксандр адразу зразумеў, што за гэтым стаіць грамадзянін П., бо яшчэ шмат месяцаў да гэтага рабіў замах на іх хатняга слана.

“І сапраўды! — кажа Сафія. — Мы ж ужо тады павінны былі зразумець, што ён не пры сваім розуме!”

Сафія, Ганна і тэлегледачы чакаюць, што ў завяршэнне допыту вядомы пісьменнік

пяройдзе да мастацкай часткі свайго выступу, аднак аўтар раптам змаўкае, дэманструючы найвышэйшы паэтычны прыём. Атрымаўшы трыбуну, ён гаворыць, што падняўся на яе толькі для таго, каб адказваць на пытанні пракурора:

— Нават выбітны аўтар часам павінен быць проста грамадзянінам сваёй вялікай краіны!

Кульбіт!

*Апладысменты!*

Суддзя дзякуе Аляксандру, прызнаецца, што з'яўляецца вялікім прыхільнікам ягонай творчасці, і нагадвае тэлегледачам, што ўсе раманы аўтара ёсць на паліцах вядучых кнігарняў сталіцы, а па прамакодзе "Суд" сёння іх можна будзе набыць са зніжкай.

Працэс разганяецца. Набірае абароты. Сведкі абвінавачвання выступаюць бясконцай чарадой. Следам за вядомым пісьменнікам на пытанні пракурора адказваюць гледачы, якія калі-небудзь былі абражаныя Пашавым стэндапам. Пад прысягай аматары камедыі запэўніваюць, што гэты вось, які цяпер у клетцы, неаднойчы заклікаў знішчыць сланоў.

— Дзякуй!

— На здароўе!

Далей выклікаюць суседзяў бацькоў Паўла. Антрэ. Мужчына і жанчына ва ўнісон расказваюць, што жыць у пад'ездзе разам з бацькам і маці грамадзяніна П. абсалютна немагчыма. За сваім сланом яны не глядзяць, на лесвічнай пляцоўцы смурод. Са слоў суседзяў высвятляецца, што алкаголь

бацькам купляе не хто іншы, як сам Павел. Менавіта ён вінаваты ў іх алкагалізме!

Вось табе і на!

Апошнімі выступае група паліцэйскіх (у мэтах бяспекі іхныя твары схаваныя за маскамі сланоў), якія прыбылі ў порт, каб затрымаць забойцу.

— А як так атрымалася, што вы апынуліся на месцы здарэння ўжо праз некалькі імгненняў пасля таго, як слон загарэўся?

— Мы патрулявалі порт і пачулі, як у ангары нехта закрычаў: “Памры, Чорная сланіха!” — і мы адразу ж ірванулі туды!

— І што вы ўбачылі?

— Мы ўбачылі яго! Ён з асалодай глядзеў на тое, як гіне жывёла.

— І што вы зрабілі?

— Некалькі чалавек затрымлівалі яго, а астатнія кінуліся ратаваць сланіху.

— Чаму ў вас не атрымалася?

— Было занадта позна! — падняўшы маску, выцірае слёзы адзін з паліцэйскіх. — У сумятні пажару мы не змаглі знайсці вогнетушыцелі.

Чым больш выступае сведкаў абвінавачання, тым больш устойлівае адчуванне, што на лаве падсудных менавіта той, хто павінен быць пакараны. Калі і былі грамадзяне, якія яшчэ ў гэтым сумняваліся, то цяпер такіх амаль няма.

— Слова перадаецца абароне! — бурчыць маленькі суддзя. — Каго вы хочаце запрасіць?

— У абароны няма сведкаў, — не падымаючы вачэй, адказвае адвакат.

Некалькі месяцаў Добры самаранін спрабуе знайсці хаця б аднаго чалавека, які адважыцца заступіцца за Паўла ў судзе, але нават самыя блізкія сябры цяпер перакананыя, што сланы ўчынілі пагром менавіта праз яго.

"З чаго вы ўзялі?"

"Мы чыталі расследаванні, глядзелі рэпартажы".

Адвакат піша і Ганне, але яна не адказвае. Цяпер, гледзячы трансляцыяю, Ганна мае супярэчлівыя пачуцці. З аднаго боку, ёй не хочацца бачыць Паўла, і яна разумее, якой цяжкай была б гэтая сустрэча, з іншага — Ганна раптам усведамляе, якую аўдыторыю ўпускае. Гэты эфір глядзіць уся краіна, і напэўна пасля эфектнага выступу на яе абрынуліся б запрашэнні ад усіх кінастудый. Зрэшты, цяпер яна жонка міністра ўнутраных спраў — па-першае, гэта пачэсна само па сабе, па-другое, ролі — гэта толькі пытанне часу.

Пацвярджае віну Паўла і экспертыза. На месцы гібелі Чорнай сланіхі знайшлі запальнічку, якую Ганна падарыла яму.

— Яна належала вам? — пытаецца пракурор у скаванага ланцугамі чалавека за кратамі.

— Так, але яе ў мяне скралі на вуліцы!

— Ну проста крадзеж стагоддзя! Хтосьці напаў на вас у белы дзень, каб скрасці запальнічку? У нашым спакойным горадзе? Гэта ж трэба!

Пракурор задаволены сабой. Суддзя ўсміхаецца. Эшафот крышачку бліжэйшы.

Пасля рэкламы пераходзяць да допыту абвінавачанага:

— Вы былі ў ангары?

— Так.

— Паважаны суддзя, у мяне ўсё.

У адрозненне ад пракурора, Добры самаранін задае мноства дакладных пытанняў, але ягоны мікрафон чамусьці раз-пораз выключаецца. Калі ён спрабуе паўтарыць, суддзя перапыняе яго:

— Вы гэта ўжо пыталіся — суд усё пачуў! Вы хочаце запытаць штосьці яшчэ?

— Так, высокі суд! У мяне ёсць хадайніцтва! — Добры самаранін падымае ўгару абгарэлую пальчатку і звяртаецца да Макса, які сядзіць у першым шэрагу: — Спадар міністр, вам знаёмая гэтая рэч?

— Спадар міністр не з'яўляецца сведкам — вы не можаце задаваць яму пытанні! — абрывае адваката суддзя.

— Нічога, высокі суд, калі дазволіце — я адкажу! — падымаючыся з лавы, з паблажлівай усмешкай кажа Макс.

— Як пажадаеце, спадар міністр, — пакорліва згаджаецца суддзя.

— Значыць, вам знаёмая гэтая пальчатка? — зноў пытаецца Добры самаранін.

— Так, гэта мая пальчатка.

— А вы не прыгадаеце, дзе і пры якіх абставінах згубілі яе?

— Вельмі нават прыгадаю! Гэта было ў ангары...

— Вось як? Значыць, вы прызнаеце, што таксама былі там?

— Так, я гэтага і не хаваў. Як толькі з'явілася інфармацыя пра ўзгаранне — мне далажылі. Я як міністр унутраных спраў палічыў сваім абавязкам неадкладна быць на месцы.

— Значыць, вы сцвярджаеце, што прыехалі, калі даведаліся, што хтосьці падпаліў Чорную сланіху?

— Так.

— А як жа вы згубілі пальчатку?

— Зайшоўшы ў ангар у полымі, я ўбачыў, як гіне жывёла, і чалавека, якога выцягвалі адтуль. Я спытаў у сваіх падначаленых, хто гэты чалавек, і яны адказалі, што ён — забойца! Я зняў пальчатку, каб даць яму поўху, і гатовы несці за гэта адказнасць перад судом і краінай!

"Брава!" — захоплена кажа маці.

"Крыху пераігрывае", — думае Ганна.

Зала ў чарговы раз выбухае апладысментамі. Пляскае нават суддзя, і, гледзячы на Паўла, Добры самаранін разумее, што няма сэнсу працягваць размаўляць з Максам: гэты суд ператварыўся ў цыркавое прадстаўленне.

— У мяне ўсё, высокі суд...

Працэс перапыняецца двойчы. Па волі слана. Спачатку жывёліне трэба справіць натуральную патрэбу (суддзя бярэ паўзу ў пасяджэнні, каб уніфармісты маглі прыбраць залу), потым слану робіцца нудна, і, падышоўшы да трыбуны, ён пачынае хобатам казытаць суддзю. Стары смяецца і просіць жывёлу спыніцца. Калі слон супакойваецца, пачынаюцца спрэчкі бакоў.

Першым выступае пракурор. Злавіўшы кураж, ён гаворыць упэўнена, разумеючы, што пасля гэтага працэсу непазбежна атрымае ўзнагароды і павышэнне.

— Высокі суд! Сёння мы разглядаем адно з самых пачварных злачынстваў, якія калі-небудзь бачыла гэтая краіна. Перад намі чалавек, чые дзеянні пахіснулі асновы чалавечай маралі!

Грамадзянін П. палічыў сябе за бога! Грамадзянін П. змеркаваў, што лепш за людзей ведае чалавечае! Грамадзянін П. абвінаваціў наша грамадства ў кампраміснасці і бяздзейнасці, не вельмі разумеючы, што чалавецтва дасягнула таго, чаго дасягнула, выключна дзякуючы нашай здольнасці адаптавацца! Грамадзянін П. патрабаваў ад нас дзейнічаць, абвінавачваў нас у баязлівасці, у той час як мы праяўлялі мудрасць! Імкненне да бяспекі і камфорту — наша самая моцная рыса, якая дазволіла нам выжыць на працягу мільёнаў гадоў!

Грамадзянін П. спакойна і наўмысна ўчыніў падпал, які, як ясна вынікае з усіх доказаў, не быў выпадковасцю ці спантанным парывам. Ён выдатна разумеў, да чаго гэта прывядзе! Ён ведаў, што пасля яго жорсткага ўчынку ўспыхне паніка, што людзі будуць імкнуцца ўратавацца любой цаной, і ён прадбачыў, што хаос пацягне смерць!

Маштаб трагедыі, выкліканай гэтым злачынцам, немагчыма пераацаніць!

Суду прадстаўленыя бясспрэчныя доказы. Паказанні сведкаў, экспертныя заключэнні — усё гэта ясна ўказвае на вінаватасць падсуднага. Нам

не патрэбныя здагадкі. Нам не патрэбныя гіпотэзы. Мы ведаем праўду! І праўда такая: перад намі стаіць забойца, які заслугоўвае самага суровага пакарання, прадугледжанага законам.

Я прашу суд прызначыць П. меру пакарання. Ён павінен быць пазбаўлены права называцца чалавекам!

Прамова пракурора Ганне падабаецца. Яна адчувае, што шмат з чым згодная. Ёй здаецца, што абвінаваўца глядзіць у сутнасць рэчаў.

У адрозненне ад пракурора, Добры самаранін блытаецца. Тэкст выступу даводзіцца правіць падчас пасяджэння. Ён глядзіць на свайго падабароннага і разумее, што, нягледзячы на ўсе заклікі, Павел прымае паражэнне, хаця зусім не лічыць сябе тым, хто прайграў. Скаваны ланцугамі чалавек не прызнае, што, адступаючы, кідае барацьбу. Павел не хоча ў гэтым удзельнічаць, і Добры самаранін упершыню за ўсю сваю шматгадовую практыку раптам ловіць сябе на думцы, што і ён таксама. І ўсё ж адвакат застаецца прафесіяналам і знаходзіць у сабе сілы сказаць наступнае:

— Сёння перад вамі стаіць не проста абвінавачанне, а сапраўдны выклік самой сутнасці правасуддзя. Мой падабаронны абвінавачваецца ў здзяйсненні тэрарыстычнага акта, а менавіта — у спальванні слана. Так, вы правільна пачулі — спальванне слана, абвінавачанне, якое само па сабе гучыць абсурдна і недарэчна! Аднак я прашу вас не спяшацца з высновамі. Я прашу вас паглядзець глыбей, асэнсаваць, што гэта абвінавачанне —

не што іншае, як цень, які не мае пад сабой рэальнай асновы. Мой кліент — чалавек мастацтва, комік, майстар смеху і слоўнай дасціпнасці, а не гвалту. Ён не служыць разбурэнню, ён служыць стварэнню — стварэнню мастоў паміж людзьмі, стварэнню святла і радасці ў гэтым няпростым свеце. Словы і жарты — вось яго зброя, і яна ніколі не прыносіла нікому шкоды. Смех — гэта не пусты гук, гэта жывая сіла, здольная разбураць перашкоды і ствараць гармонію!

Што ж мы бачым у гэтай справе? Штосьці, што падобна да ценю, які мы адкідаем ва ўмовах недахопу доказаў. Мы чуем абвінавачанне, але мы не чуем фактаў! Мы бачым абвінавачанне, але мы не бачым доказаў. Ілюзія праўды — гэта не праўда, і там, дзе ілюзія, не можа быць справядлівасці. Вось яно, абвінавачанне, пабудаванае на ілюзіі, а не на праўдзе! У ім няма ні доказаў, ні фактаў, ні логікі, толькі домыслы і цьмяныя месцы. Мы не можам судзіць чалавека па ілюзіях, нават калі яны так ярка і кідка блíснулі ў гэтай туманнай рэальнасці.

Давайце спытаем сябе, шаноўны суд, як мы можам апраўдаць абвінавачанне ў жорсткасці і гвалце, калі само абвінавачанне слабае і зыбкае, як пясок, і не стаіць нават на самім падмурку закона? Як можам мы асудзіць чалавека, які прысвяціў сваё жыццё радасці і смеху, на падставе чутак і неабгрунтаваных высноў?

Высокі суд, вы не павінны вяршыць правасуддзе, абапіраючыся на эмоцыі. Ваша рашэнне

павінна быць халодным, непрадузятым і аб’ектыўным, як халодны погляд закона. Сёння я прашу вас, шаноўны суд, паглядзець на гэты выпадак з халоднай аб’ектыўнасцю і прызнаць, што абвінавачанне — бяздоказнае, а мой кліент — невінаваты.

Апраўданне — вось тое, да чаго мы імкнёмся, бо суд павінен быць тым месцам, дзе справядлівасць бярэ верх над домысламі, а ісціна — над ілюзіямі.

Атрымліваецца блытана і непераканаўча. Гэта разумеюць і адвакат, і Павел, і Ганна.

“Расстраляюць яго?” — пытаецца Сафія.

“Быццам бы ў нас мараторый на смяротнае пакаранне”, — упісваючы слова “эшафот” у крыжаванку, адказвае дачка.

Суддзя ідзе ў дарадчы пакой, забыўшыся ўзяць з сабой аркуш, на якім ужо напісаны прысуд. Вярнуўшыся ў залу суда, ён пачынае з яго.

Камічны стары, тонучы ва ўласнай чорнай мантыі, бубніць, што суд, разгледзеўшы матэрыялы крымінальнай справы ў дачыненні да грамадзяніна П., абвінавачанага ў здзяйсненні асабліва цяжкіх злачынстваў, а менавіта — у падпале Чорнай самкі, чыя смерць прывяла да масавай гібелі людзей, вывучыўшы доказы, заслухаўшы бакі абвінавачвання і абароны, а таксама ўлічваючы характар і наступствы здзейсненага, прыходзіць да высновы, што дзеянні падсуднага мелі асэнсаваны, наўмысны характар і пацягнулі катастрафічныя наступствы, якія прывялі да гібелі нявінных людзей. Суддзя заяўляе, што падсудны дзейнічаў з выключным цынізмам і пагардай да чалавечага жыцця,

што пацвярджаецца доказамі і сведкамі. Улічваючы ступень грамадскай небяспекі здзейсненага злачынства, яго наступствы, а таксама асобу падсуднага і адсутнасць змякчальных акалічнасцяў, суд прыходзіць да высновы, што выпраўленне і перавыхаванне — немагчымыя. Зыходзячы з вышэйсказанага, суд пазбаўляе грамадзяніна П. усёй маёмасці і прысуджае да смяротнага пакарання праз расчалавечванне.

*А што такое расчалавечванне?* **Ананім**

*Чытайце далей!* **Топавы прыхільнік**

Ганна выключае трансляцыю. Яна адчувае, як псуецца (*22 па гарызанталі, 7 літар*). Ёй здаецца, што трэба пераключыць увагу і праветрыцца. Ганна вырашае схадзіць на манікюр і сустрэцца з сяброўкамі, якіх не бачыла з вяселля.

Вуліца рэстаранаў у цэнтры горада кішыць людзьмі. Тут весела і з кожнай установы грыміць музыка, тут яна часта бывала з кінапрадзюсарам. Афіцыянты бегаюць паміж столікамі, не паспяваючы мяняць напоі. Наведнікі смяюцца і перакрыкваюць адно аднаго. Рэстаран “Бусел”. Знайшоўшы столік са “сваімі дзяўчатамі”, Ганна цалуе сябровак і хваліцца новым пярсцёнкам, купленым падчас мядовага месяца. Ёй падабаецца атмасфера, якая пануе ў гэтай установе, і бесклапотнасць, з якой яе сустракаюць вясёлыя сяброўкі.

— А ты чаго такая хмурная, Ань?

— Ды ўся гэтая гісторыя з Пашам...

— З якім яшчэ Пашам? Ану, раскажы!

— Ну гэты, змагар са сланамі, якога па ўсіх каналах паказваюць.

— З якімі яшчэ сланамі, Анька?

Сяброўкі Ганны пра жывёл нічога не ведаюць. Неяк сланы прайшлі паўз іх. Столькі ж усяго было: адкрываліся новыя рэстараны і галерэі інтэр'ернага дызайну, увесь час трэба было хадзіць на масажы і абвінанні, камусьці нават давялося перафарбоўвацца, бо першы майстар выявіўся абсалютна жахлівым. А манікюр? Сяброўкі Ганны гавораць пра крэмы і сукенкі, сэкс з фітнес-трэнерамі і аперацыі на грудзях, якія ўжо тут сланы? Ганне ўсё гэта вельмі падабаецца. Яна занадта стамілася ад негатыву, які прынёс у яе жыццё Паша.

*Не адпускае злосць за змарнаваныя грошы і час! Навошта я ўвогуле ўсё гэта прачытаў!! Чаму можа навучыць гэтая кніга?* **Просты мужык**

*Свабодзе…* **Добры самаранін**

*Мне падаецца, гэта кніга пра выбар. Ганна мае дзве опцыі: шчыры і адданы чалавек, жыццё з якім будзе цяжкае і цудоўнае, поўнае выклікаў і шчасця, ці амаральны маўчун, з якім камфортна, бо ён заўсёды будзе знаходзіць цёпленькае месцейка і асвойваць грошы, якія даюць на фільмы пра карыснасць прыбылых сланоў. Зразумела, што з Максам яна доўга не працягне, паколькі ён яе брат — ёй бы проста разабрацца з гэтым. І гэты момант мне вельмі спадабаўся, бо звычайна ў кнігах гераіні абіраюць дабро і смеласць, а тут усё як у жыцці —*

*прыстасавальніцтва і шлях найменшага супраціўлення. Усё вельмі лагічна:у рэшце рэшт яна выбера баязліўца, бо сама баязліўка...* **Ананім**

*У жыцці няма такіх мужчын, як Паша, яны толькі ў кнігах...* **Арына-балерына**

*Ёсць!* **Ганна**

Приставы апячатваюць кватэру Паўла. Выносяць рэчы. Скрынак не так ужо і шмат. У самых лёгкіх — успаміны пра першыя дні, закаханасць, пяшчота, паветраныя пацалункі і... словы Ганны — яны нічога не важаць. Далей пласцінкі, якія ён ставіў ёй, і сабраныя для падатковай квіткі і квітанцыі з гасцініц (закаханыя паспелі наведаць дзясятак гарадоў). Тут лісты і фотаздымкі, памяць пра бясконцыя любошчы і кашулі, на якіх яна вышывала яго ініцыялы (не сама). Самымі цяжкімі аказваюцца скрынкі з Ганнінымі хлуснёй і падманам — нават дасведчаныя прыставы не адразу могуць іх падняць і вынесці.

Новая камера куды меншая за папярэднюю. Тут толькі дзірка ў падлозе і ланцуг, на які саджаюць Паўла. Побач ставяць дзве алюмініевыя міскі: першая з вадой, другая з караняплодамі.

Праз некалькі гадзін сюды ўпершыню ўваходзіць дрэсіроўшчык. Павел вітаецца і адразу ж атрымлівае ўдар бізуном. Асуджаны думае, што сказаў штосьці няправільна, і вітае ўтаймавальніка інакш, але тут жа атрымлівае другі ўдар. Павел разумее, што ад гэтага моманту яму забаронена размаўляць на чалавечай мове.

— І стаяць на дзвюх нагах!

Пакуль Павел здольны вытрымліваць удары, ён не падпарадкоўваецца, аднак зусім хутка апускаецца на карачкі.

Утаймавальнік маўчыць. Ён сканцэнтраваны. Справа важная — новая краіна даручае яму вялікую місію: гэты асуджаны павінен зрабіцца першым афіцыйна расчалавечаным.

Калі заняткі заканчваюцца, дрэсіроўшчык плюе на Паўла і выходзіць. Наперадзе доўгі шлях. Павел застаецца сцякаць крывёю. Чырвоныя рубцы разразаюць яго грудзі і рукі, жывот і ногі. Адзенне адабранае, таму, прыкуты ланцугом, ён ляжыць на падлозе голы. Яго калоціць. Бетон чырванее, аднак зусім хутка колер зменіцца.

Збіццё працягваецца некалькі месяцаў запар. Кожны дзень. Праца ўтаймавальніка ювелірная: ён павінен зрабіць балюча, але не забіць.

Праз адсутнасць вады і сродкаў гігіены ўжо ў першыя дні ў Паўла пачынаюцца нетрыманне і пастаянны панос (ветэрынар, які назірае за выкананнем пакарання, фіксуе дыярэю 10–15 разоў на дзень, але ніяк не дапамагае — прысуд ёсць прысуд). Павел ляжыць у лужыне ўласных спаражненняў і, перад тым як страціць прытомнасць, кожны раз шапоча: “Добрых сноў, карантыша!”

У першыя ж дні адбіраюць і імя. Дрэсіроўшчык, які заўсёды прыходзіць у масцы, кліча яго толькі па мянушцы — Слон. Цяпер у руках утаймавальніка не толькі бізун і пуга, але і спецыяльны крук,

якім, у выпадку непадпарадкавання або секунднага прамаруджання, ён хапае Слана за ноздры.

Разбураючы чалавека, асуджанаму пакідаюць толькі чатыры функцыі: сон, ежа, апаражненне і выкананне камандаў.

Праз нейкі час яго пачынаюць выводзіць ва ўнутраны калодзеж турмы, дзе працягваюць дрэсіраваць. Толькі тут, на арэне, якую ўтаймавальнік чамусьці называе эшафотам, Слану дазваляюць падымацца на заднія ногі. Часам, калі жывёла выконвае каманды хутка і правільна, дрэсіроўшчык не б'е яго, але працягвае корм. Слон есць з рукі.

*Нешта ён неяк хутка здаўся, гэты ваш герой! Увесь такі смелы быў гаварыў маніфестамі, Ганнай быў незадаволены свет сабраўся змяняць а тут за некалькі месяцаў есць з рукі. Я б лепш памёр чым на такое пагадзіўся!* **Просты мужык**

*У каментарах усе заўжды смелыя, а калі трэба заўважыць сланоў — дык не!* **Актывіст13**

Першыя некалькі месяцаў Слон адмаўляецца ад корму, аднак, калі яго пакідаюць на трыццаць сутак без ежы і амаль без вады, аднойчы зрываецца.

Нос Слана даўно разарваны, і цяпер кавалкі вісяць, нібы анучы, і больш нагадваюць пачварныя маленькія хабаткі. Каб скура Слана была падобная да арыгінальнай, некалькі разоў на тыдзень дрэсіроўшчык прыходзіць з маленькім скальпелем і, прышпіліўшы ўсе канцавіны, павольна і скрупулёзна робіць тонкія надрэзы. Парэпіны зацягваюцца,

але змяняюць структуру скуры. Падчас такіх працэдур Слон больш не стогне. Ён прывык і чакае толькі моманту, калі дрэсіроўшчык скончыць.

Застаўшыся адзін у камеры, сабраўшы волю ў кулак, Слон падымаецца на заднія ногі і пачынае жартаваць. Хістаючыся ад болю, стомы і завconfigured галавы, ён штоноч спрабуе адточваць маналог, які, упэўнены, аднойчы прачытае:

“Папляскайце тыя, хто лічыць, што я не ў самым зайздросным становішчы? Так, wi-fi тут так сабе і бялізну мяняюць радзей, чым звычайна. Але ўвогуле скардзіцца мне асабліва няма на што — за мной сочаць: дыета, фізіятэрапія, спа-працэдуры. Усё, дарэчы, зусім бясплатна! Суседзі ціхія, бо, хутчэй за ўсё, ужо мёртвыя. Са сном, вядома, ёсць некаторыя праблемы, затое кашмары не сняцца, і прачынаюся раніцамі без будзільніка. Гледзячы на мяне, вы, напэўна, хочаце спытаць: чым я адрозніваюся ад жывёлы? Жывёла мае правы!”

Рэпетаваць доўга не атрымліваецца — зношаны арганізм увесь час правальваецца ў ірваную дрымоту.

Яму сніцца самая прыгожая жанчына на свеце. Яна становіцца на калені і цалуе яго хобат...

Слон любіць мыцца. Гэта адзінае добрае, што бывае цяпер. Калі раз на два тыдні камеру чысцяць ад мачы, крыві і калу, яго выводзяць у спецыяльнае (*месца індывідуальнага ўтрымання сельскагаспадарчых жывёл, агароджаная прастора ў стайні, кароўніку або хляве, 5 па гарызанталі, 6 літар*). Потым дрэсіроўшчык заводзіць Слана

назад і мые ўжо яго самога. Калі ўтаймавальнік мае добры настрой — ён робіць ваду крышачку цяплейшай. Гэта вельмі прыемны момант.

Слон робіць вялікія поспехі. Цяпер ён умее падымацца на заднія лапы, хадзіць па вузкім бервяне і нават куляцца! Акрамя гэтага, праз паўгода пастаянных трэніровак Слон умее круціць абруч, танчыць пад музыку і нават, у адказ на каманду, ківаць галавой.

Адчуванне часу даўно страчанае, Слон не ведае, колькі правёў тут, калі ржавыя дзверы камеры адчыняюцца і ў яе ўваходзіць чалавек у прыгожым пінжаку і белай кашулі. Разам з дрэсіроўшчыкам яны гавораць на чалавечай мове. Дрэсіроўшчык усміхаецца, і госць штосьці запісвае ў чорны нататнік.

Слон стаіць спакойна. Яго спецыяльна памылі. Яму падабаецца быць чыстым. Ад чалавека, які прыйшоў, вельмі смачна пахне. Слон нават хоча падысці, але баіцца дрэсіроўшчыка. Слон распазнае некаторыя словы, якімі, здаецца, калісьці таксама карыстаўся:

— А які памер гэтай камеры? А колькі разоў на дзень кармленне? А як рана ён прачынаецца? А адбой?

Чалавек у прыгожым пінжаку і белай кашулі падыходзіць да яго ўшчыльную і акуратна гладзіць па шчацэ.

— Скура зрабілася рыхтык як у слана!

— Так, чарсцвее.

— Як думаеце, калі ён будзе гатовы выступаць?

— Ды, у прынцыпе, ужо гатовы.
— Чаму тады вы яго не выпускаеце?
— Хачу, каб усё прайшло як на мазаных колах!

*Ну так, найлепшых людзей заўсёды саджаюць на ланцуг. Астатнія і так выдрэсіраваныя.* **Моль**

ЗУСІМ САКРЭТНА

Міністру ўнутраных спраў

Дакладная запіска аб падрыхтоўцы
выступлення з удзелам першага расчалавечанага

У адказ на ваш запыт паведамляем, што нашымі спецыялістамі зафіксавана поўнае расчалавечванне грамадзяніна П.

У ходзе рознага кшталту выпрабаванняў, эксперыментаў і праверак устаноўлена, што грамадзянін П. канчаткова страціў чалавечае аблічча, а таксама здольнасць гаварыць. Разам з тым, асуджаны выдатна выконвае каманды, арыентуецца ў слановай мове і бліскуча пераймае жывёльныя гукі.

Камісія, якая складаецца з навукоўцаў-біёлагаў, антраполагаў і дрэсіроўшчыкаў мяркуе, што жывёла гатовая да дэманстрацыі поўнага расчалавечвання на публіцы.

Для ўнутранага карыстання

Макс загадвае даставіць яму кінапрадзюсара. Размова кароткая. Міністр гаворыць, і чалавек без прынцыпаў толькі ківае і на ўсё пагаджаецца. Ён прывык так рабіць усё жыццё, каб выпускаць не фільмы, але "прадукт". Макс тлумачыць, і кінапрадзюсар клянецца, што зніме ўсё, што загадаюць.

Калі лісьлівы і беспрынцыповы чалавек спінаю выходзіць з кабінета, Макс думае, што з усіх гэтых бяздарных персанажаў ён паважае толькі Паўла. Бацька і Ганна агідныя, Сафія нікчэмная, дрэсіроўшчыкі і кінапрадзюсары — новыя ціхія рабы. Максу нават крыху шкада Паўла, але нічога не паробіш — служба.

Прыйшоўшы дадому, Макс падае канверт жонцы. У першае імгненне Ганна палохаецца. Ёй здаецца, што муж прымусіць яе чытаць ліст ад Паўла, але, на шчасце, унутры аказваецца вельмі прыемны дакумент. Ганна бачыць дамову і прапанову галоўнай ролі. Прапісаная ў кантракце сума ашаламляе! Ганна адчувае, што нарэшце адпомшчаная. Гэты Павел думаў, што яна лянівая і не працуе, а тут за адзін толькі выступ яна атрымае больш, чым уся яго сям'я за дваццаць пакаленняў!

— А дзе (*літаратурна-драматычны твор, напісаны як аснова для пастаноўкі фільма, 4 па вертыкалі, 6 літар*)?

— Ён будзе пазней — пакуль проста падпішы.

Ганна ставіць аўтограф, і ўжо на наступную раніцу ўсе тэлеканалы, газеты і радыёстанцыі паведамляюць, што прысуд грамадзяніну П. прыведзены ў выкананне! Вядомы ў мінулым комік

расчалавечаны, і кожны, хто хоча пераканацца ў гэтым, можа апоўдні ў нядзелю прыйсці на плошчу Біўняў, аднак — прадбачліва папярэджвае вядучы — мы раім быць там загадзя, месцаў на ўсіх можа не хапіць.

Натоўп пачынае збірацца адразу пасля выпуску навін. Цяпер кожны хоча асабіста пераканацца, што вырадак, праз якога здарыўся сланова бунт, сапраўды расчалавечаны.

На плошчы ўзведзеная чырвоная арэна. У яе цэнтры сапраўды красуецца эшафот, прызначэнне якога нарэшце робіцца зразумелым. Менавіта сюды апоўдні ў нядзелю дрэсіроўшчык выводзіць Слана і пачынае дэманстраваць фокусы.

Спачатку простае: жывёла падыходзіць да тумбы і ўзбіраецца на яе. Натоўп смяецца і апладзіруе. Дрэсіроўшчык узрушаны, бо цяпер за ім назіраюць мільёны людзей.

Калі першы фокус атрымліваецца, і ўтаймавальнік разумее, што ўсё ідзе паводле плана, пераходзяць да паклонаў і стаяння на чырвоным мячы, да хадзьбы па бервяне і нават малявання! Перад Сланом ставяць мальберт і даюць у зубы вялікі пэндзаль. Стоячы на карачках, ён саджае кончык пэндзля ў фарбу і размазвае яе па палатне. Публіка, якая сабралася на плошчы, у захапленні, і ўсё ж, якім бы пераканаўчым ні быў Слон, як упэўніцца ў тым, што ён насамрэч, сапраўды і незваротна расчалавечаны? О, не хвалюйцеся! На гэты выпадак у Міністэрства ўнутраных спраў прызапашаны апошні і вялікі нумар...

Барабанны дробат!

“І толькі паглядзіце! — на ўсё горла, спрабуючы дакрычацца да кожнага тэлевізара ў краіне, разрываюцца каментатары. — Да Слана падымаецца Ганна!”

Яна ў яго ўлюбёным сінім пінжаку. Яе валасы сабраныя так, як яму заўсёды падабалася. Зараз яна падыдзе да (*невысокага бар’ера ўздоўж авансцэны, 18 па вертыкалі, 5 літар*) і загаворыць са Сланом! — тлумачаць каментатары.

“Так-так! Гэта тая самая дзяўчына, якую Слон вельмі кахаў, тая самая дзяўчына, якая кінула яго, прычыніўшы сапраўдны боль, і катавала маўчаннем. Зараз яна звернецца да яго, і мы ўбачым, што Слон, нягледзячы на ўсё тое жаданне і пачуцці, што былі ў яго да яе, ужо нічога не скажа! Проста зараз, шаноўныя гледачы, мы пераканаемся, што Слон — расчалавечаны!”

Максу падабаецца гэты фінал. І ўсё ж ніколі не ведаеш, як жывёла можа павесці сябе ў самы важны момант, таму ён даручае ўтаймавальніку правесці некалькі дзясяткаў рэпетыцый (уключаючы генеральны прагон). Макс хоча пераканацца, што Слон не загаворыць.

Калі Ганна ўпершыню чытае сцэнар, за які ёй абяцаецца казачны ганарар, яна крыху абураецца, што муж пасмеў прапанаваць ёй нешта падобнае, але хутка астывае і думае, што роля — гэта ўсяго толькі роля. Ёй трэба выйсці на сцэну і сказаць тэкст. Па-першае, яна і так ужо падыгрывала пачуццям Слана, калі яны сустракаліся, а па-другое,

не варта паўтараць памылак суда, калі яна ўпусціла магчымасць гаварыць з вялікай аўдыторыяй.

Сумневаў у тым, што яна павінна ўдзельнічаць у святочным пакаранні, больш няма, і ўсё ж, збіраючыся на першую рэпетыцыю, Ганна раптам адчувае хваляванне, якое мела перад іх першым спатканнем. Здаецца, ёй нават цікава, як ён там.

Каб не палохаць жонку самога міністра ўнутраных спраў, першую рэпетыцыю праводзяць не ў камеры (што было б лагічна), але ў Вялікім тэатры. Ганна ўжо стаіць на сцэне з тэкстам у руках, калі дрэсіроўшчык выводзіць з-за куліс Слана.

— Мне трэба яго баяцца?

— Ну, жывёла ёсць жывёла, але наогул ён бясшкодны і нават вясёлы!

— Значыць, я магу падысці бліжэй?

— Так, не хвалюйцеся! Ён вельмі страшыцца гэтага крука.

Ганна робіць некалькі крокаў і становіцца насупраць Слана. Яна не бачыла яго ўсе гэтыя месяцы. Здаецца, нават нягледзячы на тое, што на мордзе шмат шнараў, а скура счарсцвела і зрабілася грубай, ён усё такі ж прыгожы. Па дарозе ў тэатр Ганне здавалася, што Слон будзе яе адштурхоўваць, але цяпер дзіўным чынам ён прыцягвае яе сваёй прыроднай сілай. Ганна нават робіць крок назад, бо разумее, што ёй раптам вельмі хочацца дакрануцца да яго.

— Так, давайце пойдзем па тэксце, — быццам спрабуючы ацверазіць сябе, раптам кажа жонка міністра ўнутраных спраў.

— Давайце, — згаджаецца дрэсіроўшчык — ён спяшаецца, бо сёння ў яго яшчэ прымерка новага касцюма.

— Прывітанне! — зноў падышоўшы бліжэй і гледзячы ў вочы Слана, пачынае Ганна. — Як ты тут? Я хацела сказаць, што ўвесь гэты час вельмі сумавала без цябе. Я кахала цябе, Паш, і цяпер кахаю! Я заўсёды кахала цябе, а блакаванне... Я абарвала ўсё толькі таму, што зразумела, што не змагу даць табе столькі кахання, колькі ты заслугоўваеш! Так бывае, Паша, людзі кахаюць адно аднаго, але пакідаюць адно аднаго, бо ўцякаюць у старыя або новыя стасункі ці штосьці яшчэ, але якая цяпер розніца? Галоўнае ж, што сёння, бачыш, я прыйшла — я прыйшла, каб забраць цябе!

Слон маўчыць.

— Так добра, ці крыху хутчэй тэкст прамаўляць?

— Як на мяне, дык нармальны рытм, — адказвае дрэсіроўшчык, — але гэта ўжо лепш у вашага мужа на прагоне запытаць — ён жа аўтар тэксту?

— Не, аўтар тэксту мой бацька...

— А так, ведаю, часам чытаю яго!

— Слухайце, а ён што, сапраўды цяпер зусім нічога не разумее з таго, што я гавару?

— Слоў не разумее, але ўсё адчувае. Калі ў вас ёсць любоў да яго — ён яе прыме!

Словы ўтаймавальніка Ганну абражаюць. Як ён асмельваецца гаварыць, што яна, знакамітая акторка і жонка міністра ўнутраных спраў, можа мець да нейкай жывёліны пачуцці?!

— Я меў на ўвазе, што ён счытвае толькі эмоцыі, — тут жа ўсвядоміўшы, што сказаў лішняе, сам сябе папраўляе дрэсіроўшчык.

— Ладна, давайце паспрабуем яшчэ раз!

Рэпетыцыя за рэпетыцыяй, Ганна падыходзіць да Слана і спрабуе разгаварыць яго. Яна ўспамінае, як яны цалаваліся на мосце і як узбіраліся ў горы, каб сядзець вышэй за аблокі, як разам з ім яна глядзела футбол і як раніцамі ён прыносіў ёй каву.

Слон маўчыць. І цяпер, ужо не баючыся гладзіць яго па шчацэ і нават адчуваючы ўзбуджэнне ад гэтага, Ганна ўспамінае, як ён уваходзіў у яе ў душы і на кухні, як танцаваў з ёй і як катаўся на ровары.

— Здаецца, я насамрэч, праўда-праўда, вельмі цябе кахаю, Слон! — кажа Ганна, але ён не адказвае, і толькі калі дрэсіроўшчык хвошча яго арапнікам, Слон кланяецца.

— А ён на сцэне будзе на карачках ці на задніх нагах?

— Не ведаю, напэўна, лагічна, каб, калі вы будзеце глядзець яму ў вочы, на задніх?

— Вы тады зможаце даць яму каманду?

— Так, лёгка...

Так, лёгка. І цяпер, стоячы пасярод эшафота ў святле (*сцэнічны прыбор са свяцільняў рассеянага святла, 10 па гарызанталі, 5 літар*), Ганна ведае, што набліжаецца момант ісціны. Яна падыходзіць да Слана і гучна (гэта чуе і ўся плошча праз калонкі, і ўся краіна па тэлевізары) кажа:

— Прывітанне! Як ты тут? Я хацела сказаць, што ўвесь гэты час вельмі сумавала без цябе!

Усё адрэпетавана — Слон павінен маўчаць, але вочы яго раптам напаўняюцца слязьмі, а на твары праступае забытая, здавалася б, назаўсёды, усмешка:

— І я! Я вельмі цябе люблю, мілая Аня! — ціха, але толькі так, як можа сказаць сапраўды закаханы чалавек, гаворыць Павел.

Аня палохаецца, але зараз жа, абсалютна інстынктыўна і супраць уласнай волі пытае:

— Сто тысяч мільёнаў працэнтаў, бярэш адказнасць?

— Сто тысяч мільёнаў працэнтаў, бяру адказнасць...

Плошча сціхае. Сціхае краіна. Рэжысёр трансляцыі загадвае ісці на рэкламу. Дрэсіроўшчык хапае Паўла круком за разарваны нос і адцягвае ад Ганны. Выбягаюць памочнікі, накідваюць на нерасчалавечанага (*30 па гарызанталі, 5 літар, доўгая вяроўка з рухомай пятлёй на канцы, якой ловяць жывёлу*) і выносяць з арэны.

Пасля рэкламнай паўзы каментатары тлумачаць гледачам, што артыстцы не варта перажываць, бо нават электрычнае крэсла не заўсёды працуе з першага разу. Расчалавечванне — справа няпростая. Няма ніякіх сумневаў, што ў самы кароткі час будзе праведзеная работа над памылкамі і ўсе мы зможам пераканацца, што справядлівасць узяла верх. Да новых сустрэч!

ЗУСІМ САКРЭТНА

Міністру ўнутраных спраў

Тлумачальная запіска аб чаканым сыходзе сланоў

У сувязі з разгортваннем у сталіцы гуманітарнай катастрофы (адсутнасцю харчавання, голадам, забруджваннем вады і шматлікімі эпідэміямі) заўважаныя першыя спробы сланоў пакідаць перыферыйныя раёны горада і выбудоўваць новыя маршруты міграцыі ў пошуках новых месцаў пражытку. Па нашых ацэнках, у самы бліжэйшы час усе сланы пакінуць горад.

Для ўнутранага карыстання

*Да мяне толькі ў гэтым месцы дайшло: ён жа закахаўся ў Ганну, бо бачыць у ёй сваю маму!!! Такая ж лайдачка. Яго маці дзесяцігоддзямі сядзіць перад тэлевізарам і нават не спрабуе знайсці працу. Вось вам і адказ! Думаю, у гэтым і адказ на пытанне, чаму яна яго кідае: Ганна хоча быць каханай жанчынай, а не мамай...* **Арына-Балерына**

*Тольки ён паводзиць сябе як мужчына, а не як дзиця, якое мае патрэбу у маме... Паша смелы, у адрозненне ад тых, каго яна выбирае, блытаючы мужнасць и нахрапистасць, але вы близка! Ход думак правильны! У кожным мужчыне Ганна шукае свайго бацьку…* **Невядомы карыстальнік**

Ганна злуецца. Яна адчувае штосьці да Паўла, але цяпер не можа зразумець — што. Ёй не падабаецца, што да яе падбіраецца пачуццё віны, быццам яна адказная за тое, што ён у турме, а яна на волі і да таго ж не кахае яго больш. Ганна абураная. Яна лічыць, што гэта Павел ва ўсім вінаваты. Яна давала яму шанец. Сваімі паводзінамі, гэтым сваім узорным каханнем ён толькі прыніжае яе і робіць ёй няёмка.

“Калі б ён сапраўды меў да мяне сапраўдныя пачуцці, — думае Ганна, — то зрабіў бы так, каб усё прайшло ідэальна, але замест гэтага ён зноў гаворыць толькі пра сябе! Мне зноў тут няма месца!”

Ганну раздражняюць паводзіны Слана. Жывёла! Ёй падаецца, што сапраўдныя мужчыны так сябе не паводзяць. Яна ўжо сто разоў чула, што ён яе кахае, — навошта паўтараць, ды яшчэ перад усімі?!

“Яшчэ і кнігу, млядзь, пра сваё вялікае каханне напішы!”

*Там хтосьці вышэй казаў, што Ганна пляскаты, але насамрэч яна самы дакладна прапісаны персанаж — колькі такіх я сустракала!* **Ніка**

Апоўдні ў пятніцу Макс адмяняе штотыднёвы абед з ~~бацькам~~ цесцем. Замест гэтага ён загадвае даставіць у яго кабінет вядомага дрэсіроўшчыка.

— Як жа гэта так атрымліваецца, — нават не павітаўшыся, пачынае міністр, — што мы марнуем велізарныя грошы на праграму па расчалавечванні, вы атрымліваеце для сваіх эксперыментаў цэлую турму, я аддаю вам галоўны цырк у сталіцы, а на выхадзе гэты выradак на ўсю краіну прызнаецца ў каханні маёй жонцы?!

— Па шчырасці, я не разумею, як так здарылася... Вашы людзі не дадуць мне схлусіць: мы правялі дзясяткі тэстаў і выпрабаванняў — усе яны паказвалі, што нічога чалавечага ў ім не засталося...

— Дык ён нават гаворыць!

— Дайце мне час, я абяцаю, што ўсё выправім!

— Колькі вам трэба?

— Год...

— Я даю вам шэсць месяцаў, і калі праз паўгода ён усё яшчэ будзе чалавекам, вы вельмі пра гэта пашкадуеце, ясна?!

— Так...

Работа над памылкамі. Дрэсіроўшчык разумее, што жыццё дае яму другі шанец. Гэтым разам нельга схібіць, бо ён можа страціць не толькі павагу міністра, але і Цырк, які яму падарылі. Дрэсіроўшчык хоча заставацца суседам самых уплывовых людзей краіны і ведае, за што змагаецца.

Павел не верыць, што дрэсіроўшчык зможа расчалавечыць яго за ўсё жыццё, — утаймавальнік жа ўпэўнены, што гэтым разам яму спатрэбіцца ўсяго некалькі абзацаў, ну максімум старонак.

Больш ніякай цёплай вады. З першага дня пасля правалу ўтаймавальнік робіць правілы больш жорсткімі. Цяпер тут шмат ланцугоў, але няма нават дзвюх місак (ежу і ваду вывальваюць наўпрост на падлогу, каб Слон еў і злізваў усё з бетону). Нягледзячы на гэта, у першыя гадзіны Павел адчувае сябе самым шчаслівым чалавекам на Зямлі. Жартачкі! Дваццаць рэпетыцый і фінальны выступ! За апошнія месяцы ён так часта бачыў Ганну! Цяпер яна дакладна ведае, што ён усё яшчэ вельмі любіць яе! Павел шчаслівы, бо пачуццё, якое жыве ў ягоным сэрцы, куды мацнейшае за боль, які яму абяцаюць падарыць. Павел хвалюецца цяпер толькі пра тое, што Аня, мілая Аня, можа моцна хвалявацца за яго.

— Я цябе знішчу, — кажа дрэсіроўшчык.

— Вы можаце мяне забіць, але закаханага чалавека ўва мне вы ўсё роўна не заб’яце!

— Паглядзім...

Пачынаюць з лёгкага: новыя ланцугі не дазваляюць зрабіць нават двух крокаў. Дваццаць чатыры гадзіны на суткі Слон толькі можа сядзець на адным месцы. Калі легчы на жывот і выцягнуцца, можна дацягнуцца да брудных караняплодаў, што валяюцца тут жа. Цяпер Слон будзе гадзіць пад сябе і спаць (спрабаваць) ва ўласных спаражненнях.

Слану даюць (*арганічнае злучэнне ёду з хімічнай формулай $CHI_3$, мае выгляд жоўтых крышталёў з моцным характэрным пахам, 27 па вертыкалі, 7 літар*). Ён павінен есці яго з лыжкі.

Перад тым як ударыць Слана токам, дрэсіроўшчык падыходзіць да яго, расшпільвае прарэх і мочыцца (ён будзе рабіць так штодзень). Пасля гэтага пры дапамозе ўніфармістаў утаймавальнік падключае да геніталій Слана клемы і дае разрады.

Сціскаючыся ад невыноснага болю, зубы Слана пачынаюць сцірацца і крышыцца. Дзень пры дні. Вены разбухаюць, а вочы расшыраюцца. Такі новы план. Дрэсіроўшчык умее рабіць высновы.

Вада цяпер патрэбная толькі для ўтаплення. На вязня надзяваюць анучную маску слана і абліваюць вадой.

— Вось цяпер можаш і папіць!

Здаровага сну больш няма. Каб Слон не мог заснуць, дваццаць чатыры гадзіны на суткі, за выключэннем таго часу, калі ў камеру ўваходзіць дрэсіроўшчык, з усталяваных пад столлю дынамікаў раздаецца манатонны слановы роў. Акрамя гэтага, у камеры ўсталёўваюць вельмі яркае святло, якое раз на некалькі тыдняў раптам гасне, і Слана пагружаюць у поўную цемру і цішыню. Пасля бясконцага шуму адсутнасць усялякага гуку выклікае паніку.

І ўсё ж часам у яго атрымліваецца праваліцца ў хворы, ірваны сон. У такія моманты ён бачыць Ганну. Слон падыходзіць да яе, бярэ

за каўнер і кажа: “Мілая, не сумнявайся ўва мне — я выцягну цябе з балота, я ніколі не адпушчу тваёй рукі!”

Аднойчы дрэсіроўшчык пакідае на падлозе памазок. У запаскуджанай і акрываўленай камеры Слон глядзіць на яго не ў стане ні зламаць, ні выкінуць. Памазок — адзіная цяпер рэч, якая звязвае Слана з мінулым. Памазок не прыбраць.

Калі дрэсіроўшчыку падаецца, што з гэтай прылады для галення выціснута ўсё, што можна, у камеры ўсталёўваюць некалькі вуллёў. Уніфармісты разбураюць іх і пакідаюць адказчыкам Слана. Пчолы атакуюць і джаляць. Скура Слана пакрытая слядамі бамбардзіроўкі раз’юшаных насякомых, якія, гінучы, падаюць побач з ім.

З надыходам зімы камеру абліваюць вадой і адчыняюць вокны, каб яна пакрылася лёдам. Улетку, наадварот, побач са Сланом ставяць абагравальнікі, якія падымаюць тэмпературу, быццам у саўне. Эксперыменты працягваюцца, але ветэрынары пільна сочаць, каб асуджаны вар’яцеў, страчваў чалавечы выгляд, але ні ў якім разе не паміраў: яму яшчэ выступаць.

Слана гвалтуюць. Гэта робяць і ўніфармісты, і дрэсіроўшчык, і Макс, які прыязджае толькі дзеля гэтага. Вяртаючыся дадому, міністр не падмываецца. Яму падабаецца выконваць сужэнскі абавязак і разумець, што паміж Ганнай і Сланом захоўваецца сувязь. Макс усміхаецца.

Пасля месяцаў гвалту, катаванняў і галадання, Слана, наадварот, пачынаюць карміць на зарэз.

Дрэсіроўшчык ведае, што Слон — вегетарыянец, таму аднойчы падае яму...

мяса...

чалавека...

Уніфармісты ўносяць вялікі чорны пакет і кладуць яго перад Сланом. Расшпіліўшы маланку, памочнікі перакладаюць на бетонную падлогу труп Слановага бацькі. Некалькі ўніфармістаў разам з дрэсіроўшчыкам пачынаюць разбіраць чалавека на вачах у Слана. Каб ён трымаў іх расплюшчанымі, яго ўсаджваюць у спецыяльна падрыхтаваны апарат, які не дае круціць галавой і заплюшчваць павекі. Слон бачыць цяпер, як з бацькі здымаюць скуру і пачынаюць зразаць кавалачкі мяса, накалоўшы якія на крук, дрэсіроўшчык падносіць іх да вуснаў асуджанага.

— Ну і хто тут у нас не будзе расчалавечаны?

Слон не спіць месяцамі, месяцамі галадае. Ці сон гэта? Ці бачаць сланы сны? Слон ванітуе.

— Правільна, няхай спачатку праблюецца — больш месца будзе ў страўніку!

Калі рвотная маса заканчваецца, спазмы не спыняюцца, і Слана працягвае выкручваць жоўцю.

— Доўга ён яшчэ так можа? — пытаецца дрэсіроўшчык у ветэрынара.

— Не, хутка скончыць, але, хутчэй за ўсё, на нейкі час засне.

Каб гэтага не здарылася, Слана абліваюць ледзяной вадой. Калі ён прытомнее, двое ўніфармістаў

раскрываюць яму рот, у які дрэсіроўшчык кладзе першы кавалак бацькавага мяса.

*Я калі чытала гэтыя жудасныя старонкі, не разумела, чаму ж сланы не ўступяцца за яго? Чаму не разнясуць да д'ябла гэтую турму?* **Топавая прыхільніца**

*Таму што ён усё яшчэ чалавек, а не слон!* **Соня**

*Я не веру, што ў нас у краіне ёсць такія катаванні!* **ТваяDomina2022**

*Чаму сланы не прыйшлі? Добрае пытанне! А вы не спрабавалі запытаць сябе? А чаму людзі не ўступіліся за яго? Чаму вы заўсёды абіраеце не заўважаць праблемы і хочаце, каб за вас іх разрульваў хтосьці іншы? Сланы не катуюць сланоў, не атрымліваюць ад гэтага асалоды! Што ж з вамі, з людзьмі, не так, калі вы кожны раз лічыце за лепшае нічога не рабіць?* **Моль**

*А я калі чытала, у гэтым месцы падумала, што "датчыкі агіднасці" выкручаныя на поўную, а потым перачытала кнігу і зразумела, што не, што менавіта так мы і жывём...* **Ліза**

Дрэсіроўшчык прымушае Слана закрыць рот.

— Ану, а цяпер давай жуй!

Нягледзячы на тое, што цела бацькі разлагаецца, з камеры яго не выносяць. Каб справіцца з невыносным смуродам, дрэсіроўшчык і ўніфармісты цяпер носяць адгазнікі, паверх якіх надзяваюць маскі жывёл. Прымусіўшы Слана пражаваць чарговы кавалак чалавечыны, яны водзяць вакол яго карагод.

Калі танцы заканчваюцца — паўтараюцца катаванні. Дзень пры дні. Утапленне і ўдары токам, атакі насякомымі і гукам, святлом і голадам. Гэтаму атракцыёну няма канца.

*А я калі чытала гэты ўрывак, вельмі смуткавала. І мне здавалася, што многія чытачы будуць са мной салідарныя. Гэта вельмі сумная кніга, але не таму, што мы даведваемся пра ўсе гэтыя жахі і катаванні, а таму што ў нейкі момант разумеем, што на свеце ўсё ж ёсць вялікае і сапраўднае каханне, якое мы ніколі не адчуем…* **Марта**

*Шкада, вядома, што яны яго ўсё ж такі зламалі. Вось і пытанне: ці вартая была аўчынка вырабу? Дзеля чаго змагацца, калі зразумела, што сілы няроўныя? Каму ён што хацеў даказаць? Міністру? Дрэсіроўшчыку? Ёй, якая заўсёды будзе выбіраць маўчуноў?* **Ася**

У ноч перад паўторным расчалавечваннем адбываецца землятрус. У кожным разе, Слану здаецца, што гэта менавіта ён. Некалькі гадзін вібрыруе бетон камеры. Сутаргі турмы. Калоціць сцены, з'яўляюцца першыя шрамы расколін. Трасуцца цені, стаіць гул. Дрынкаюць міскі. Дрыжыць нават паветра. Толькі пад раніцу, калі Слана выводзяць з камеры, сціхае.

Глядацкай цікавасці няма. Горад нібыта ўмомант апусцеў. Перад выхадам на сцэну Ганна не разумее, што адбываецца: гэтым разам зусім няма гледачоў, расчалавечванне арганізаванае вельмі дрэнна.

На вуліцы залева, таму на плошчы Біўняў збіраецца ўсяго некалькі разявак, і, здаецца, ад непагадзі хаваюцца нават сланы, у кожны разе, іх неяк

не бачна. Адсутнасць публікі збівае з панталыку. Ганне падаецца цяпер, быццам яна трэцярадная акторка, якую прымусілі выступаць на вясковым свяце! Дзе ўсе людзі? Дзеля каго яна тут?

Сярод некалькіх мокрых разявак стаіць пацвеpазелая маці Паўла. Кроплі бягуць па яе твары, і пажылая жанчына моўчкі назірае за тым, у што ператварыўся яе сын. Ці датычная яна? Ці датычныя мы?

Жывёла ўзбіраецца на тумбу, становіцца на мячы і кланяецца. Калі надыходзіць час размовы з Ганнай, ён не падводзіць — падводзіць яна.

Пераадольваючы хваляванне і раздражненне, акторка робіць некалькі крокаў насустрач Слану. Дождж заглушае яе прамову, але нешматлікія гледачы разумеюць, што яна гаворыць пра каханне. У нейкі момант маці Паўла нават здаецца, што Ганна звяртаецца да былога каханага абсалютна шчыра:

— Паш, я кахаю цябе! — са слязьмі на вачах, пераходзячы на крык, абвяшчае Ганна. — Паш, мілы, даруй мне! Ну! Ну скажы ж! Ну скажы ж хоць што-небудзь, ліха на яго!

Ганна захлынаецца слязьмі і, умольваючы Паўла, становіцца перад ім на калені.

“Пераігрывае!” — кажа Аляксандр і ідзе, каб не мокнуць.

Слон маўчыць. Пусты позірк. Не зрэнкі — шкло. Рот Слана адкрыты, цячэ сліна. Міміка выключаная, быццам на ім маска жывёлы, ~~а не яго сапраўдны твар~~. Слон не выдае ані гуку і кланяецца.

Дыктар аб'яўляе, што чалавек расчалавечаны, і некалькі разявак у празрыстых дажджавіках млява пляскаюць у далоні і разыходзяцца.

*А я не зразумеў, яна гэтым разам шчыра перад ім выбачаецца? Яна праўда яго кахае?* **Актывіст13**

*А я, наадварот, не зразумеў, чаму ён маўчыць цяпер? Яго ўсё ж такі расчалавечылі?!* **Ананім**

*Не, але ён не адказвае ёй, таму што сапраўды кахае, а не сузалежны…* **Невядомы карыстальнік**

Падчас вячэры, якая была задуманая як урачысты фінал нечага грандыёзнага, а цяпер прызначаная хоць трошкі падбадзёрыць Ганну, атмасфера ў рэстаране напружаная. Мерапрыемства атрымалася дробным і нікому не патрэбным. Разумеючы, што сітуацыя дзіўная і непрыемная, Аляксандр раз-пораз скача з тэмы на тэму, але слова раптам бярэ сам Макс:

— І яшчэ я хачу паведаміць, што мы разводзімся...

— Як? — абсалютна ашаломленая, пытае Ганна.

— Так.

— Але чаму, любы?

— Таму што я не хачу быць побач з такім нікчэмным і баязлівым чалавекам, як ты...

Макс нядбайна кідае на стол канфіскаваны ў Паўла жоўты бранзалет.

— Але... але я ж цябе кахаю...

— Сто тысяч мільёнаў адсоткаў? Бярэш адказнасць?

Ганна затуляе твар рукамі і пачынае плакаць. Яе калоціць. Макс вяртаецца да дэсерту, і, каб хоць неяк запоўніць павіслую паўзу, Аляксандр задае, здаецца, самае недарэчнае ў гэты момант пытанне:

— А што цяпер будзе са Сланом?

— У якім сэнсе?

— Ну, цяпер, калі ён расчалавечаны, што з ім будзе? Ён жа, па сутнасці, павінен апынуцца на свабодзе?

— Цяпер, калі ён зрабіўся сланом, яго адправяць у заапарк, бо вальеры ж стаяць пустыя...

— А хіба іншыя сланы не будуць супраць? Хіба яны не прыйдуць вызваляць яго?

— Якія іншыя сланы?! — пытаецца Макс.

— Як гэта якія? Ну ўсе сланы!

— Усе сланы даўно сышлі...

— У сэнсе?!

Здаецца, жывёлы ўсё яшчэ тут: яны на карцінах, на грашах, на стале ў выглядзе перачніцы і сальніцы. Сланы на цыферблаце гадзінніка Аляксандра, на яго кашулі і гальштуку. Устаючы з-за стала, ён падносіць руку да лба і, быццам капітан на масціку, які захінаецца ад сонца, з усмешкай пачынае аглядаць залу ў пошуках слана і раптам разумее, што жывёлы тут сапраўды няма.

— Гэта нейкі фокус?!

Умомант забыўшыся пра дачку ў слязах, Аляксандр пераходзіць у іншую залу, потым падыходзіць да барнай стойкі, але і тут не знаходзіць слана. Неймаверна! Жывёлы няма ні каля

прыбіральні, ні ў гардэробе. Выйшаўшы на вуліцу, вядомы пісьменнік дзівіцца таму, што і тут няма аніводнага слана. Па дарозе ў абодва бакі спакойна едуць машыны, па ходніках, як нічога ніякага, бягуць па сваіх справах мінакі. Спыніўшы аднаго з іх, Аляксандр пытаецца:

— Дзе сланы?

— Якія яшчэ сланы?! — вырваны з уласных думак, здзіўляецца незнаёмы і глядзіць на Аляксандра як на вар'ята.

Не ў стане паверыць уласным вачам, вядомы пісьменнік, бы зачараваны, ідзе ў бок дома, забыўшыся ў рэстаране плашч. Дождж імгненна залівае яго адзежу, але, здаецца, Аляксандр зусім не адчувае дыскамфорту. Сланоў няма! Ні ў вокнах, ні на паркоўках, ні на скрыжаваннях, ні ў вітрынах крам.

Ідучы дадому больш за гадзіну, зусім празябнуўшы, але дагэтуль так і не заўважыўшы гэтага, Аляксандр зазірае ў паркі і аркі, у завулкі і пераходы метро — пуста! Тут няма аніводнага слана!

Каб яшчэ раз пераканацца, што жывёл сапраўды няма, ён заскоквае ў першы-лепшы бар. У адкрытай прасторы шумяць незалежныя журналісты, палітолагі і актывісты:

“Я па-ранейшаму прапаную зладзіць акцыю, у якой вядомыя людзі, музыкі і мастакі, паэты і пісьменнікі будуць маўчаць на фоне сланоў...”

“Проста маўчаць?”

“Так, проста маўчаць!”

“Вельмі добра!”

“Давайце лепш будзем крычаць на фоне сланоў! Што, калі я буду выходзіць на трыбуну і крычаць, напрыклад, дзве-тры хвіліны, каб перадаць боль, які ў мяне ўнутры? Вось так: АААААААААААААА!”

Аляксандр уважліва аглядае бар і сцэну — слана няма!

Жывёлы адыходзяць гэтак жа нечакана і незаўважна, як і прыходзяць, быццам аўтар рамана наогул забыўся распісаць сцэну знікнення.

Дайшоўшы да ўласнага дома, Аляксандр не знаходзіць слана ні ў садзе, ні ў гасцёўні, ні ў сталовай. Калі ж ён заходзіць у бібліятэку, то бачыць Сафію — яна павесілася. Пад яе нагамі раздрукаваны ліст А4. Аляксандр думае, што гэта перадсмяротная запіска, аднак чытае любоўнае пасланне ад Арыны-балерыны. Мяркуючы па ўсім, Сафія ўлезла ў яго камп’ютар...

Аляксандр сядае на падлогу ля ног жонкі і пачынае рэдагаваць уласны тэкст...

ЗУСІМ САКРЭТНА

Міністру ўнутраных спраў

Спяшаемся паведаміць, што горад цалкам ачышчаны ад жывёл. На дадзены момант на тэрыторыі сталіцы знаходзіцца ўсяго адзін Слон Паша, які размешчаны ў цэнтральным вальеры заапарка.

Рэжым працы:
ПН — выходны
АЎ — 10:00 – 18:00
СР — 10:00 – 18:00
ЧЦ — 10:00 – 18:00
ПТ — 10:00 – 18:00
СБ — 09:00 – 21:00
НДЗ — 09:00 – 21:00

Штодзень апоўдні госці заапарка могуць паназіраць за тым, як слон з'ядае любімую Паштэл-дэ-ната.

Для ўнутранага карыстання

*Карацей, як я зразумеў, гэта кніга пра тое, што мы не заўважылі, як прыйшлі сланы, бо ніколі нічога не заўважаем. Не заўважаем, як перавешваюць сцягі і як знікае каньяк з бацькоўскага буфета. Не заўважаем, як уносяць праўкі ў Канстытуцыю і як дзяўчына пачынае адказваць радзей, а пудрыцца часцей. Не заўважаем дваццаць мільёнаў у лагерах, не заўважаем фальшу. Не заўважаем укідаў, не заўважаем цэнзуры. Не заўважаем, як падлеткі выносяць каштоўныя рэчы з дому, як не заўважаем пенальці. Не заўважаем папулізму, не заўважаем бруду. Не заўважаем, як жонка ідзе раней з вячэры, каб павесіцца. Не заўважаем залежнасцяў. Не заўважаем памылкі друку, не заўважаем карупцыі. Не заўважаем п’янюжку, які ляжыць на зямлі. Не заўважаем праўды, не заўважаем хлусні, дык дзе ўжо тут нам заўважыць, як зніклі сланы?* **Невядомы карыстальнік**

*Макс, па ходу, адзіны нармальны чувак сярод усіх гэтых прыдуркаў аказаўся!* **ТваяDomina2022**

*Мне вельми шкада Ганну. Невыносна тужлива, што жыццё дае ёй шанец выбрацца з яе балота, але яна личыць за лепшае вярнуцца щ яго…* **Невядомы карыстальнік**

*О, слухайце, навошта гэты пафас?! Давайце паглядзім практычна! Вось будзе яна з Паўлам. Рана ці позна яго пасадзяць (што і адбылося), і ёй што, перадачы яму ўсё жыццё насіць і заставацца вернай? Траціць усё сваё жыццё на праўду і ні з кім не спаць? Яна ж асобны жывы чалавек, які проста хоча лёгкасці! Што вы ўсе паўтараеце пра каханне, быццам гэта штосьці самае галоўнае?! З кінапрадзюсарам весела! Какаін, вечарынкі, танцы. Можа, ён і трахаецца лепш? І мацюкаецца, як яна. Гэты Паша, з яго вечнымі праблемамі і стрэсам, з яго прэтэнзіямі, напэўна, так сабе ў ложку. Ну так, кінапрадзюсар плюе на яе, спіць з іншымі акторкамі, але гэта ж і прыцягвае яе! Яна можа даказаць сабе, што на гэты раз яна лепшая за іншых, бо ён на нейкі час зноў прымае яе…* **Моль**

*Цікава, а Ганна цяпер шчаслівая?* **Ананім**

*Цікава, ці расказвае яна прадзюсару, што значыць яе татуіроўка з сэрцайкам...* **Невядомы карыстальнік**

Штораніцы, ледзь толькі кава напаўняе парцалянавыя філіжанкі з чорнымі сланамі, кінапрадзюсар з танцуючымі дзяснамі сядае насупраць Аляксандра і, перадаючы масла ці джэм, пакорлівым позіркам дае зразумець, што можна пачынаць. Хаця раніца, як усялякая гісторыя, імкліва заканчваецца, новы/стары каханы Ганны ведае, што сняданак не адбудзецца, пакуль выбітны аўтар не выступіць. Чарнавікі туляцца паміж срэбнымі прыборамі, падлогавы гадзіннік б'е дзевяць, і прыжыццёвы класік пачынае расказваць ідэю новага рамана:

— Ты ведаеш, я тут падумаў, што хачу напісаць пра нашага слана...

Расплюшчваючы вочы і разглядаючы столь, яшчэ не пацягнуўшыся па свежую крыжаванку, якую непрыметна паклаў на тумбачку выканаўчы прадзюсар, Ганна думае, што сёння, як і ў любы іншы дзень, яна не будзе спускацца на сняданак. Ганна тужыць па Пашу. Яна прызнаецца сабе, што сумуе па яго жартах і клопаце. Ёй хочацца, каб ён запытаў, як яна і дзе. Часам, правяраючы тэлефон, былая жонка міністра ўнутраных спраў хоча атрымаць ад Пашы плэйліст з новай і прыгожай музыкай, якую яна накладзе на фотаздымкі з кінапрадзюсарам. Ганне важна пагаварыць пра

ўсё, так доўга і глыбока, як умеў толькі Павел. Ганна ўспамінае іх падарожжы і яго абдымкі, яго ўсмешку і звычку трымаць яе за руку. Ганна думае цяпер, што ёй не хапае яго зацікаўленасці, не хапае яго пытанняў, яго дасціпнасці, яго здольнасці яе рассмяшыць. Яна хоча гаварыць з ім пра рэўнасць і пра рэвалюцыі, пра свабоду і пра віну.

У такія дні Ганна думае, што, магчыма, крыху пагарачылася з расставаннем і, напэўна, Павел усё ж заслугоўваў яшчэ адной размовы...

Каб справіцца з сумам, Ганна прыгожа апранаецца і ідзе на шпацыр з кінапрадзюсарам у бок заапарка. Сеўшы на лаўку, якая стаіць побач з вальерам, яна глядзіць на спакойнага слана і разгортвае крыжаванку. Кінапрадзюсар гаворыць, што яму трэба адысці літаральны на хвілінку і, вярнуўшыся, часта шморгаючы носам, прапануе скончыць — апошнім часам у іх ніяк не атрымліваецца разгадаць усяго адно слова:

*16 па вертыкалі: пачуццё, якое характарызуецца глыбокай прывязанасцю і прыхільнасцю да іншага чалавека. Пяць літар. Другая "ю", чацвёртая "о"...*


1 АРГАЗМ
2 МАЛЕННЕ
3 УТОПІЯ
4 СЦЭНАР
5 СТОЙЛА
6 ЗЛОСЦЬ
7 ПАПЯРОСНІЦА
8 ШЧАЦІННЕ
9 ЭЛЕФАНТОЛАГ
10 САФІТ
11 РАЯЛЬ
12 КАМАМБЕР
13 МАРШРУТ
14 БІНОКЛЬ
15 КВАНТ
17 АПОРТ
18 РАМПА
19 ВЯРБЛЮД
20 АПАХАЛА
21 ЭШАФОТ
22 НАСТРОЙ
23 АРХЕТЫП
24 ІНЦЭСТ
25 БАТАЛЬЁН
26 АДРАСАТ
27 ЁДАФОРМ
28 ПРЫМАТ
29 СЦЭНА
30 АРКАН
31 ГРАФАМАН
32 ЭСЭІСТ
33 ФОРЗАЦ
34 ТАНДЭМ

АЛЯКСАНДР КАРНАЎХ

# ХАЛОДНЫЯ ЗЕМЛІ



*Містыка, трылер, каханне, дэтэктыў, фолк*

*Выдатны дэбют*

*таленавітага беларускага аўтара!*


ПЭРЛ БАК
ВЕЦЕР З УСХОДУ, ВЕЦЕР З ЗАХАДУ
САГА ПРА КІТАЙСКУЮ СЯМ'Ю
Захаплялльны раман нобелеўскай лаўрэаткі
пра лёс дзяўчыны з традыцыйнай кітайскай сям'і
на фоне пераменаў 1920-х




Першы, ініцыяцыйны раман аднаго з найбольш знаных у свеце сучасных беларускіх аўтараў. Гэта аповед пра Мінск, пра Беларусь і пра беларусаў. Пра зменны лёс і пра надзею. Пра ўсё тое, што кожны з нас носіць у сабе, дзе б ён у гэты момант ні знаходзіўся.

**купіць на сайце**
**gutenbergpublisher.eu**




«Крэмулятар» — самы знакаміты раман Сашы Філіпенкі. Твор атрымаў прэстыжную французскую прэмію Trasnfuge як найлепшы еўрапейскі раман 2023 года.
Кніга паглыбляе чытача ў атмасферу 1930-х гадоў. Аўтар даследуе ўнутраны свет чалавека, пастаўленага перад немагчымым выбарам.

**купіць на сайце**
**gutenbergpublisher.eu**




«Чырвоны крыж» — гэта гісторыя пра памяць і забыццё. Малады футбольны арбітр Аляксандр прыязджае ў Мінск, каб збудаваць наноў жыццё, разламанае напалам воляй абыякавага лёсу. Там ён знаёміцца са старой жанчынай Таццянай Аляксееўнай, якая выжыла ў сталінскім тэроры з надзеяй рана ці позна задаць пару пытанняў Богу.

**купіць на сайце**
**gutenbergpublisher.eu**